Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

1 САКАВІКА 2008 г.
СУБОТА
№ 41 (26154)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЎРУЧЫЎ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды 73 грамадзянам — прадстаўнікам розных сфераў дзейнасці. У іх ліку — работнікі прамысловасці, урачы, геолагі, будаўнікі, юрысты, педагогі, журналісты, прадстаўнікі культуры і мастацтва, ваеннаслужачыя і міліцыянеры, кіруючыя работнікі.

«Кожны з вас ішоў да гэтых узнагарод сваім шляхам. Але ўсіх аб'ядноўвае актыўная грамадзянская пазіцыя, тое, што вы свой талент і энергію, паўсядзённую настойлівую працу і інтэлект накіроўваеце на карысць нашай краіны, на прымнажэнне яе эканамічнага, навуковага, абароннага і духоўнага патэнцыялу, на рост яе аўтарытэту ў сусветнай супольнасці», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Найбольш прадстаўнічую групу сярод узнагароджаных склалі рабочыя, спецыялісты і кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў і будаўнічай індустрыі.

Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды работнікам ААТ «Амкадор». Ордэна Пашаны ўдастоены наладчык зубастругальных паўаўтаматаў Віктар Мірановіч. Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны генеральны дырэктар прадпрыемства Аляксандр Яноўскі, камерцыйны дырэктар Уладзімір Бараноўскі, дырэктар завода «Ударнік» Міхаіл Садоўскі, намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Тамара Пастаялка і іншыя работнікі.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў работнікам будаўнічых арганізацый Віцебска, якія ў сціслыя тэрміны правялі рэканструкцыю Летняга амфітэатра. Аляксандр Лукашэнка ўручыў медаль «За працоўныя заслугі» і геолагам: намесніку генеральнага дырэктара — галоўнаму геолагу па нафце і газу геолагаразведачнага РУП «Белгеалогія» Яраславу Грыбіку, галоўнаму геолагу Мазырскай нафтаразведачнай экспедыцыі глыбокага свідравання Аляксандру Сусленку.

«Для нас важна самаадданая, высокапрадукцыйная і якасная праца на кожным вытворчым участку і прадпрыемстве, у кожнай арганізацыі. Сёння гэта аснова дынамічнага развіцця эканомікі і паляпшэння жыцця людзей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У ліку ўзнагароджаных таксама — работнікі культуры і мастацтва, вышэйшай школы, сродкаў масавай інфармацыі. Ордэн Айчыны II ступені ўручаны дырэктару — мастацкаму кіраўніку Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Валянціну Елізар'еву. Медаля Францыска Скарыны ўдастоены старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара Гусачэнка, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская, мастацкі кіраўнік прадзюсарскага цэнтра ўнітарнага прыватнага гандлёва-вытворчага прадпрыемства «Спамаш» Уладзімір Кандрусевіч, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Марціновіч, загадчыца кафедры БДУ Тацяна Шамякіна.

Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена рэдактару аддзела газеты «Звязда» Наталлі Карпенка, дырэктару Прадстаўніцтва Міжнароднай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Беларусі Людміле Сідаровіч, прарэктару Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры Уладзіміру Васілеўскаму, загадчыку кафедры гэтай ВНУ Віктару Барташу, дэкану факультэта Міхаілу Корбіту, прафесару Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Ірыне Новік.

Сярод узнагароджаных і работнікі органаў дзяржаўнага кіравання. «Нашы кіраўнікі ўсведамляюць тую высокую адказнасць, якую ўскладае на іх час, неабходнасць вырашэння самых складаных задач, што стаяць перад дзяржавай. І не толькі ўсведамляюць, але і актыўна садзейнічаюць рэалізацыі тых напружаных планаў, якія прыняты ў краіне», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён уручыў ордэн Айчыны III ступені старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзіміру Андрэйчанку.

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Папкоў, дырэктар Палаца Рэспублікі Пётр Волкаў.

Міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу і старшыні Віцебскага гарвыканкама Пятру Драздову ўручаны ордэн Францыска Скарыны.

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны дырэктар рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі Аляксандр Бялецкі, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Віктар Пятруша і начальнік упраўлення фінансавага і бухгалтарскага забеспячэння дзяржаўных органаў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Аляксандр Воблікаў. Намесніку старшыні Камітэта дзяржкантролю — дырэктару Дэпартамента фінансавых расследаванняў Сяргею Бараноўскаму, дырэктару Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Валерыю Міцкевічу, начальніку ўпраўлення Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Генадзю Анцыпаву аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Беларусі.

Дзяржаўныя ўзнагароды ўручаны таксама прадстаўнікам праваахоўных органаў, сілавых структур.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім узнагароджаным за высокае прафесійнае майстэрства і працавітасць, за талент і энергію, якую яны аддаюць служэнню Айчыне.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АБАВЯЗКОВА МАРКІРАВАЦЬ

З 1 сакавіка ўводзіцца абавязковая маркіроўка гадзіннікаў, шклоабмывальных сродкаў, антыфрызаў і антыабледзяняльных вадкасцяў у спажывецкай тары. Адпаведнай пастановай Саўміна краіны маркіроўка воцату ў спажывецкай тары перанесена з 1 сакавіка на 1 верасня 2008 г.

Фота Анатоля КЛЕЦКУКА.

Нядаўна давялося пабываць у шматдзетнай сям'і Касніцкіх з вёскі Семежава Капыльскага раёна. Вера Уладзіміраўна і Васіль Стэфанавіч маюць пяцёра сваіх дзяцей і трох дзяўчатак узялі пад апеку.

Маюць чацвярых унукаў. Хто заходзіць да іх — адчувае, што хата напоўнена цяплом і любоўю, кожны сямейнік мае штодзённыя абавязкі і клапоціцца пра ўсіх, ведае, што сям'я дасць яму трывалую апору і дапаможа вытрымаць любыя жыццёвыя выпрабаванні. Гэтая іх з'яднанасць проста заваражвае. А калі прыязджаюць у госці трое ўнукаў — дзеці старэйшай дачкі Аксаны, сярод якіх малыя хлопчыкі-двайняты, дом напаўняецца радаснай валтузнёй, якую мы і засталі ў гэтай сям'і. Кожны хацеў пагуляць з малымі, пазабавіць іх, пачаставаць.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ШЭСЦЬ ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАЎ БУДУЦЬ АДКРЫТЫ Ў БЕЛАРУСІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ НА ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА РАСІІ

Яны будуць працаваць 2 сакавіка з 8.00 да 20.00 у Мінску (Старавіленскі тракт, 41, Палац дзяцей і моладзі), Віцебску (вул. Маякоўскага, 1, гарадскі цэнтр культуры), Гомелі (вул. Ланге, 17, Абласны грамадска-культурны цэнтр), Магілёве (вул. Ленінская, 61, Ліцэй Беларуска-Расійскага ўніверсітэта), Брэсце (вул. Пушкінская, 10, Генеральнае консульства Расіі), Гродне (вул. Дзяржынскага, 1, гарадскі Дом культуры). Для ўдзелу ў галасаванні пры сабе неабходна мець дакумент, што засведчвае асобу і прыналежнасць да расійскага грамадзянства. Тыя, хто часова знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, павінны прад'явіць таксама адмацавальнае пасведчанне. Такі дакумент, як пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі, на дае падстаў для ўдзелу ў выбарах.

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СТАЎШЫ ЭКС-ПРЭЗІДЭНТАМ, ПУЦІН ПАКІНЕ САБЕ РЭЗІДЭНЦЫЮ Ў «НОВА-АГАРОВЕ»

Пасля выбараў прэзідэнта, 2 сакавіка, Уладзімір Пуцін павінен будзе перадаць свайму пераемніку не толькі ўладу, але і афіцыйныя рэзідэнцыі, аўтамабілі, спецсувязь і ахову. Але без сацыяльных і матэрыяльных выгод экс-прэзідэнт не застанецца, пішуць «Новые известия».

Згодна з законам «Аб гарантыях прэзідэнту РФ», Уладзімір Пуцін захавае недатыкальнасць. Выключэнне можа быць зроблена толькі ў выпадку здзяйснення цяжкіх злачынстваў. Экс-прэзідэнту ў пажыццёвае карыстанне аддаюцца дзяржаўная ахова, спецсувязь, транспартнае абслугоўванне. Яму выплачваецца штомесячнае матэрыяльнае ўтрыманне ў памеры 75 працэнтаў ад месячнай грашовай узнагароды прэзідэнта Расіі (каля 120 тысяч расійскіх рублёў), ён захоўвае права на медыцынскае і санаторна-курортнае абслугоўванне, страхаванне. Акрамя таго, былому кіраўніку дзяржавы таксама аддаецца ў пажыццёвае карыстанне адна з дзяржаўных дач. Дарэчы, з гэтай нагоды Уладзімір Пуцін ужо вызначыўся — ён пакідае за сабой сваю рэзідэнцыю ў «Нова-Агарове».

БАРАК АБАМА ШУКАЕ ПАДТРЫМКІ СЭКСУАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЯЎ

Кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Дэмакратычнай партыі Барак Абама звярнуўся па падтрымку да гомасэксуалістаў, лесбіянак, бісэксуалаў і транссэксуалаў.

Ён нагадаў аб сваім змаганні за раўнапраўе амерыканцаў незалежна ад іх сэксуальнай арыентацыі і папрасіў падтрымаць яго на папярэдніх выбарах.

КААЛІЦЫЯ Ў РАДЗЕ УКРАІНЫ ПАГАДЗІЛАСЯ НА РЭФЕРЭНДУМ ПА НАТА

Парламенцкая кааліцыя ў Вярхоўнай Радзе Украіны вырашыла пайсці на саступкі апазіцыі, каб як мага хутчэй стабілізаваць палітычную сітуацыю ў краіне.

Удзельнікі кааліцыі выйшлі на «вельмі простую фармулёўку», згодна з якой пытанне аб канчатковым уступленні Украіны ў НАТА будзе вырашацца толькі па выніках агульнанароднага рэферэндуму.

Пры гэтым кааліцыя пагадзілася адклікаць пастанову Рады, дзе гаворка ідзе аб падтрымцы дзеянняў прэзідэнта, прэм'ер-міністра і спікера парламента, якія напісалі ліст у НАТА з просьбай аб далучэнні Украіны да Плана дзеянняў адносна членства ў альянсе.

УКРАІНА МОЖА ПЕРАШКОДЗІЦЬ БУДАЎНІЦТВУ «ПАЎДНЁВАГА СТРУМЕНЯ»

У «Газпрама» могуць узнікнуць сур'ёзныя праблемы пры рэалізацыі праекта «Паўднёвы струмень» (South Stream — з Расіі ў Еўропу па дне Чорнага мора).

Напярэдадні Уладзімір Пуцін дамовіўся з Венгрыяй аб яе ўваходжанні ў праект. Аднак Расія, як паказваюць эксперты, паўтарае ранейшыя памылкі: дамовіўшыся з пакупнікамі, яна забылася пра транзітныя краіны. А сярод іх — Украіна, у якой, такім чынам, з'яўляецца вельмі сур'ёзны рычаг ціску на «Газпрам».

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АПОШНІ ДЗЕНЬ ПАДАЧЫ ДЭКЛАРАЦЫЙ — У ПАНЯДЗЕЛАК

Падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе за 2007 год неабходна падаць сёлета да 3 сакавіка ўключна. Паводле інфармацыі прэс-цэнтра Міністэрства па падатках і зборах Беларусі, сёлета падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе павінны падаць фізічныя асобы, калі на працягу 2007 года яны атрымлівалі даходы, якія абкладаюцца падаходным падаткам, з некалькіх крыніц і іх сукупны гадавы даход перавысіў 7 519 992 рублі.

У прэс-цэнтры МПЗ паведамілі, што цяпер інспекцыі працуюць па асаблівым графіку: у працоўныя дні да 20.00, па суботах і 2 сакавіка да 15.00. У інспекцыях дзейнічаюць асобныя кабінеты, у якіх прыём дэкларацый ажыццяўляецца паводле папярэдняга запісу. Нагадаем, што дэкларацыя можа быць пададзена асабіста, праз даверараную асобу або па пошце.

Пры адпраўленні дэкларацыі па пошце днём яе прадастаўлення лічыцца дата адпраўкі заказнога ліста. Рэкамендацыі і прыклады па запаўненні дэкларацый размешчаны на стэндах у раённых інспекцыях, а таксама на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах — http://nalog.by. На пачатак другой дэкады лютага сёлета ў падатковыя органы было пададзена 70 154 падатковыя дэкларацыі аб сукупным гадавым даходзе за 2007 г. Індывідуальнымі прадпрымальнікамі было пададзена 7065 дэкларацый, фізічнымі асобамі — 63 089. У параўнанні з мінулым годам сёлета колькасць пададзеных дэкларацый паменшылася амаль на 88 тысяч. Гэта памяншэнне адбылося ў выніку змянення падатковага заканадаўства, калі летась грамадзяне маглі ўжо атрымліваць падатковыя вылікі таксама і па месцы асноўнай працы.

Сяргей КУРКАЧ.

«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» ДЛЯ КІРАЎНІКОЎ ПРЫВАТНЫХ УНІТАРНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

Кансультацыі па тлумачэннях падатковага заканадаўства ажыццяўляюцца ў рабочыя дні да 22.00 па тэлефонах «гарачай лініі»:

289 15 14, 222 67 40 (пытанні прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання); **222 68 71, 222 65 16** (пытанні па падатку на дабаўленую вартасць).

Непасрэдна кансультацыі па падатковым заканадаўстве кіраўнікі прыватных унітарных прадпрыемстваў могуць атрымаць у інспекцыях МПЗ па абласцях і ў сталіцы.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў САКАВІКУ

3, панядзелак, *6.30—22.00*
4, аўторак, *0.00—3.30*
5, серада, *21.00—24.00*
6, чацвер, *0.00—10.00*
7, пятніца, *18.00—24.00*
8, субота, *0.00—13.30*
10, панядзелак, *10.10—15.30*
16, нядзеля, *18.00—24.00*
17, панядзелак, *0.00—1.30*
18, аўторак, *18.30—24.00*
19, серада, *0.00—6.30*
20, чацвер, *18.30—24.00*
21, пятніца, *0.00—14.30*
23, нядзеля, *0.00—11.30*
24, панядзелак, *0.00—2.00*
26, серада, *0.00—13.00*
27, чацвер, *1.30—16.00*
28, пятніца, *12.30—23.30*

Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»

Очередное общее собрание акционеров состоится 31 марта 2008 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год и основных направлениях деятельности в 2008 году.
2. Отчет Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2007 год.
3. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2007 году.
4. Об утверждении годовой бухгалтерской отчетности за 2007 год.
5. Об утверждении порядка распределения чистой прибыли и выплате дивидендов за 2007 год.
6. Об утверждении направлений использования чистой прибыли на 2008 год.
7. Об утверждении суммы средств, направляемых на благотворительную деятельность и оказание безвозмездной помощи в 2008 году.
8. О внесении изменений в Устав ОАО «Белгорхимпром».
9. Об определении количественного состава и избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. Об установлении вознаграждения для членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация акционеров 31 марта 2008 года с 10.00 до 12.30.

УНН 600024712

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже зданий и сооружений, расположенных по адресу: г. Марьина Горка, ул. Восточная, 8, в том числе: склад (258,6 кв.м), склад ГСМ (15,2 кв.м), баня (805,6 кв.м), гараж (254,9 кв.м), проходная (14,4 кв.м), прачечная (871,9 кв.м), забор железобетонный (498 п.м), кабель силовой электрический, котел паровой Е/9/1 — 3 ед., резервуар — 2 ед., сеть водопроводная, сеть канализаций, коллекторы. Пл. зем. уч. 1,1543 га. Начальная цена снижена на 30 % и составляет 443 100 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.10.2007 г. **Аукцион состоится 11.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны: (8017) 2246134, 3850204, 2810090. Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» 01.04.2008 г. проводит открытый аукцион по продаже, обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток
Здание конторы (двухэтажное, кирпичное)	1105	д. Марково, Молодечненский район	88 557 705	10 %
Здание склада	370,2	ст. Уша, Молодечненский район	10 304 555	10 %

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 01 апреля 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321**. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **31 марта 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.03.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 147,00
1 еўра	3 266,88
1 латвійскі лат	4 687,26
1 літоўскі літ	946,17
1 чэшская крона	129,84
1 польскі злоты	927,93
1 расійскі рубель	89,45
1 украінская грыўня	425,87

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	24,0023
10 UAH	47,0975
1000 BYR	11,1762
EUR	36,5099

Курс у гандлёвых кампаніях (на 29.02.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08041

Ёсць нагода

«ЗНАЧЫЦЬ, ДОБРЫЯ КНІГІ ТЫ Ў ДЗЯЦІНСТВЕ ЧЫТАЎ...»

3 сакавіка — Сусветны дзень пісьменніка

Асобнае «прафесійнае» свята для літаратараў вылучана з 1986 года паводле рашэння чарговага кангрэса Міжнароднага ПЕН-клуба — міжнароднай арганізацыі пісьменнікаў, што дзейнічае ў больш як 130 краінах свету.

Кніга — бадай, адна з нямногіх рэчаў, якая ўваходзіць у жыццё кожнага чалавека з моманту нараджэння. Немаўлятам матулі чытаюць казкі, потым дзецям абавязкова дораць «кнігу нумар адзін» — буквар. Пачынаючы са школы, нас пераследуе спіс «абавязковай літаратуры», якую проста неабходна прачытаць. Не адно пакаленне ломіць галаву, што хацелі сказаць у сваіх творах класікі — Пушкін, Талстой, Дастаеўскі, Шамякін, Быкаў... І, несумненна, кнігай усіх часоў і народаў застаецца Біблія. Усё, што было, ёсць і будзе з чалавецтвам, апісана ў розных кнігах: ад гістарычных раманаў да фантастыкі, ад падручнікаў і энцыклапедый да зборнікаў анекдотаў. Мы раскрываем для сябе мноства новых светаў — «знаёмімся» з людзьмі, якія жылі ў іншую эпоху ці са знакамітымі сучаснікамі, «наведваем» месцы, дзе ніколі не былі, або самі спрабуем сябе ў ролі аўтараў...

Колькі існуюць кнігі, столькі ідуць аб іх спрэчкі. Гаворыць, што модныя навінкі выціскаюць класікаў, што чытацкую цікавасць часта будзіць толькі сучасная экранізацыя. Мяркуюць, што кніга прайграе тэлевізару і тым больш Інтэрнэту. Шмат чаго гаворыць. Але ж — чытаюць!

Якія кнігі вы любілі ў дзяцінстве? Якія аўтары развівалі вас як асобу? Ці ёсць творы, якія вы з задавальненнем перачытваеце і цяпер, у якасці настольнай кнігі? Што б вы параілі прачытаць іншым?

Таццяна ПРУДЗІННІК, студэнтка Маскоўскага літаратурнага інстытута імя А.М. Горкага (у назве няма памылкі, ёсць дакументальны парадокс. — **Аўт.**):

— Я вырасла на казках пра мумі-троляў Туве Янсан, кнігах Астрэд Ліндгрэн, Джэральда Дарэла, Ірыны Такмаковай, усякіх плагіятных рэчах а-ля «Чараўнік Ізумруднага горада». З беларускіх аўтараў добра памятаю Алену Васілевіч і яе цыкл пра Ганьку. А вось рускія народныя казкі не вельмі любіла. ...Да слова, «Усё пра Мумі-троляў» — гэта і цяпер адна з маіх любімых кніг. На жаль, мне здаецца, што сучаснай беларускай літаратуры ў нас мала і выдавецкі бізнэс развіты даволі слаба, таму я часцей чытаю, напрыклад, украінскіх аўтараў.

Калі я напісала б кнігу?.. А я гэта якраз і раблю. Кніга будзе пра сённяшні дзень, пра тое, што да ўсяго ў жыцці трэба ставіцца са здаровай іроніяй, і ў любых сітуацыях не губляць пачуцця гумару.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, галоўны дырэктар радыёстанцыі «Беларусь», паэт:

— Можна ўзгадаць, што я вырас на рускай і беларускай класічнай літаратуры — творах Аляксея і Льва Талстых, Усевалада Гаршына, Змітрака Бядулі, Васіля Віткі, Максіма Танка, Янкі Брыля. З савецкіх пісьменнікаў вельмі любіў Валянціна Катаева, Чынгіза Айтматава. Надзвычай вялікі ўплыў на мяне аказалі кнігі Уладзіміра Караткевіча і Максіма Багдановіча, у многім яны паўплывалі на светапогляд, на адносіны да сваёй Бацькаўшчыны. Увогуле, «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча і «Алмазны мой вянец» В. Катаева я часта перачытваю і цяпер. Таксама з задавальненнем чытаю вершы — паэзію Восіпа Мандэльштама, Арсенія Таркоўскага, Максіма Багдановіча.

Марыя ВАСІЛЬЕВА, магістрантка БДУ:

— На мой літаратурны густ моцна паўплываў універсітэт. Перавагу я аддаю чытанню раманаў. Сярод маіх любімых пісьменнікаў Булгакаў, Умберта Эка. Мае настольныя кнігі — «Майстар і Маргарыта» і «Імя ружы». Вырасла ж я на творах Дзюма. У дзяцінстве вельмі любіла «Карлсана, які жыве на даху» Астрэд Ліндгрэн, «Дзяніскіны расказы» Віктара Драгунскага, «Годзе добрага дзіцяці» Эдуарда Успенскага.

Ірына ІВАШКЕВІЧ, бухгалтар ПУП «Брэсцкі рынак»:

— З усіх кніг я аддаю перавагу фантастыцы, хоць чытаю іншую літаратуру. Сваім сяброўкам я параіла б набыць кнігу «Дарога, якая ідзе ўдалечынь» Асеевай. З твораў школьнай праграмы мне больш за ўсё запомніліся «Меч князя Вячкі» Дайнэкі і «Чорны замак Альшанскі» Караткевіча. Вырасла ж я на казках народаў свету і братоў Грым, творах Пушкіна.

Марыя ВАЛЧКОВА, начальнік адддзела міжбанкаўскіх разлікаў Тэхнабанка:

— Я вырасла на кнігах з хатняй бібліятэкі. У дзяцінстве з ахвотай чытала Маршака. Калі падрасла, пераключылася на Войніч, Караткевіча, Булгакава. Маім самым любімым пісьменнікам з'яўляецца Шэкспір. У мяне дома ёсць збор яго твораў, сярод якіх больш за ўсё мне падабаюцца «Сон у летнюю ноч» і «Многа шуму з нічога». Я таксама люблю чытаць дэтэктывы Шэлдан і Данцовай.

Анатоль ШАЎЧЭНКА, кіраўнік трэкавага камітэта і камітэта па аўтаспаламе Беларускай аўтамабільнай федэрацыі:

— Я вырас на гістарычнай літаратуры, творах з ваенным ухілам. У дзяцінстве мне вельмі падабаліся раманы Вальтэра Скота і Аляксандра Дзюма. Зразумела, я мог бы сказаць, што мая настольная кніга—газета «Аўтадайджэст», ды і па маёй спецыялізацыі я ў асноўным чытаю літаратуру, звязаную з аўтаспортам. І ўсё ж мая любімая кніга — «Д'артаньян і тры мушкецёры», якую я прачытаў 4 разы, і заўжды знаходзіў у ёй новыя нюансы. Я не стаў бы раіць камусьці чытаць канкрэтную кнігу, бо ўсё залежыць ад тэмпераменту і патрэбнасцяў чалавека. Кагосьці больш цікавіць экзотыка, некага іншага — нешта востраe, «жоўтае». У мяне вельмі рухавы лад жыцця, таму і кнігі я выбіраю адпаведныя, больш інфармацыйныя.

Павел СЫРАЕЖКІН, удзельнік дуэта «Чук і Гек»:

— Ляжалі ў мяне на падлозе кнігі, і я на іх рос — ей, спаў... (*Смяецца.*) Насамрэч, думаю, дзіцячыя мае захапленні ў літаратуры былі прыкладна такімі ж, як у любога хлопчыка, які нарадзіўся і вырас у СССР. Бацька, член Саюза мастакоў, сабраў у доме вялізную бібліятэку, а на асобную паліцу ставіў тыя кнігі, якія, як ён лічыў, мне трэба было абавязкова прачытаць. І я чытаў, прычым пачаў гэта рабіць даволі рана — напрыклад, гадоў у 8, памятаю, самастойна асіліў нешта вялікае і складанае, пра жыццё першабытных людзей. Як спяваў Высоцкі, «значит, нужные книги ты в детстве читал...». Так што я паслядоўна пазнаёміўся з «піратскай рамантыкай» Рафаэля Сабаціні («Адысея капітана Блада») і Роберта Льюіса Сцівенсана («Востраў скарбаў»), з творамі Вальтэра Скота, Джэймса Фенімара Купера — Зверабой у мяне доўгі час быў увогуле любімым героем. У пару тынэйджарства, калі хацелася вострых адчуванняў, паглынаў Сцівена Кінга... Але кнігі наўмысна ніколі не перачытваў, хіба што хуценька праглядаў, каб асвяжыць успаміны. Затое цяпер, напрыклад, даволі часта зазіраю — у Біблію — па-першае, зразумеў, што час ідзе, трэба неяк перааэнсоўваць жыццё, па-другое, сустракаеш тую ці іншую спасылку, напрыклад, на «Пасланне да рымлянаў», знаходзіш яго — і кожны раз адкрываеш для сябе нешта новае. А яшчэ, паколькі я даўно захапляюся геаграфіяй і вельмі люблю падарожнічаць, то за кубкам кавы раніцай часта праглядаю вялікі геаграфічны атлас. Гэта ў любым выпадку больш карысны занятак, чым глядзець нейкія серыялы — дзякуючы яму, у прыватнасці, заўжды ведаеш сталіцы свету.

Ірына ПРЫМАК, Віктарыя ЦЕЛЯШУК.

Аўташколы змогуць самастойна ўстанаўліваць памер платы за навучанне

Аўташколы ў Беларусі змогуць самастойна ўстанаўліваць памер платы за навучанне з улікам зацвярджаемых урадам гранічных індэксаў змянення адпускных цэнаў (тарыфаў) на тавары (работы, паслугі). Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, з пераліку паслуг, цэны на якія рэгулююцца Саветам Міністраў, выключаны паслугі па абучэнні кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі. Адпаведны Указ № 131 кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 28 лютага.

Неабходнасць прыняцця такога рашэння выклікана ўстойлівым ростам попыту на паслугі вучэбных арганізацый, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку і перападрыхтоўку вадзіцеляў. Аўтамабілізацыя насельніцтва, павелічэнне аб'ёмаў прадпрымальніцтва ў сферы транспартнай дзейнасці і нізкі ўзровень кошту навучання абумовілі ў 2007 годзе ажыятажны попыт на гэты від паслуг, і як вынік — чэргі ў аўташколы. Але пры гэтым плата за навучанне заставалася фіксаванай, нават з улікам росту плацежаздольнасці грамадзян. І з цягам часу сітуацыя запатрабавала ўнясення змяненняў у ранейшы парадак. Рэалізацыя ўказа дасць магчымасць прыцягнуць дадатковыя сродкі для абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы вучэбных арганізацый, павысіць якасць падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў. Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Такая мера прадугледжана праектам пастановы Саўміна

Як паведаміў карэспандэнту **БЕЛТА** начальнік аддзела па бяспецы на транспарце і ліцэнзаванні Міністэрства транспарту і камунікацый Павел Бажанаў, у сувязі з выключэннем з пераліку паслуг, цэны (тарыфы) на якія рэгулююцца Саветам Міністраў, навучання кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі, кошт такога навучання павысіцца. «Наколькі ён павялічыцца — дакладна невядома. Аўташколам давядзецца ўзгадняць і рэгістраваць тарыфы ў выканкамах і абгрунтоўваць іх павелічэнне. Відавочна, што вельмі вялікія тарыфы аўташколы ўстанаўліваць не будуць, паколькі ім гэта нявыгадна. Мы прагназуем павелічэнне кошту на Br200—300 тыс.», — сказаў ён. У любым выпадку, калі кошт будзе больш за Br1 млн, жадаючых вучыцца ў аўташколах будзе значна менш.

Мінтранс падрыхтаваў праект пастановы ўрада, які прадугледжвае захаванне ранейшых тарыфаў на навучанне ў аўташколах адносна раней заключаных дагавораў. «Калі з боку вучэбных арганізацый будуць спробы пераліку тарыфаў па такіх дагаворах, то гэта з'яўляецца незаконным, і грамадзянам неабходна звярнуцца да кантралюючага органа Мінтранса — інстытута «Транстэхніка», — праінфармаваў начальнік аддзела.

На думку Паўла Бажанава, праз некалькі месяцаў знікнуць чэргі ў аўташколах. Людзі, якія хацелі навучыцца ваджэнню, карыстаючыся нізкімі тарыфамі, пойдуць.

Мера фіксаваных тарыфаў была ўведзена для навядзення парадку ў цэнаўтварэнні ў гэтай сферы. Але калі тарыфы сталі аднолькавымі, з'явіліся пэўныя мінусы. Аказалася, што супаставіць умовы гаспадарання розных аўташкол немагчыма: адны выкарыстоўваюць расійскія аўтамабілі, другія — машыны замежнай вытворчасці, частка аўтамабіляў ездзіць на бензіне, частка — на дызельным паліве або на газе. «Яшчэ адна праблема, з якой мы сутыкнуліся, — гэта месцаразмяшчэнне аўташкол. Умовы работы арганізацый, размешчаных у сталіцы, у іншых гарадах або раённых цэнтрах, на ўскраіне горада або ў цэнтры, немагчыма супаставіць», — адзначыў субяседнік.

У маі мінулага года тарыфы былі перагледжаны ў бок павелічэння. Акрамя таго, з іх выдзелілі паліва. Мінтранс правёў даследаванні, у выніку якіх вызначылі, што пасля ўстанаўлення гранічнага ўзроўню тарыфаў у большасці аўташкол адбылося зніжэнне рэнтабельнасці з 15 да 10 працэнтаў, а ў трэці — да 0 працэнтаў. А для нармальнага функцыянавання такіх арганізацый необходна мець рэнтабельнасць на ўзроўні 15 працэнтаў.

Павел Бажанаў расказаў, што пераход да рэгулявання тарыфаў на агульных падставах дасць магчымасць вучэбным арганізацыям атрымаць дадатковыя фінансавыя сродкі, абнавіць вучэбны транспарт, павысіць заработную плату работнікам. Цяпер у дзяржаўных вучэбных арганізацыях, асабліва ў тых, якія працуюць у раённых цэнтрах, назіраецца вялікі знос рухомага саставу. У некаторых аўташколах людзі вучацца на аўтамабілях яшчэ савецкай вытворчасці. Акрамя таго, немалаважнае пытанне — паляпшэнне ўмоў работы майстроў вытворчага навучання. «Калі мы збіралі інфармацыю, то высветлілася, што іх заработная плата ў сярэднім складае каля Br450 тыс. Мы спадзяёмся, што аўташколы ўздымуць зарплату і змогуць прыцягнуць лепшых спецыялістаў, а не набіраць усіх без разбору з-за катастрафічнага недахопу прафесіянальных кадраў», — падкрэсліў субяседнік.

У сваю чаргу Міністэрства транспарту і камунікацый прадоўжыць кантраляваць дзейнасць арганізацый, якія вучаць ваджэнню. Ведамства таксама плануе ўзмацніць кантроль і патрабаванні да іх. З павышэннем тарыфаў на навучанне парк аўтамабіляў у аўташколах будзе абноўлены. Па аналогіі з таксістамі «з цягам часу плануецца дапускаць да навучання насельніцтва толькі аўтамабілі, якім не больш за 10 гадоў».

Кошт навучання ў аўташколах вадзіцеляў катэгорыі «В» цяпер складае амаль Br600 тыс. без уліку паліва.

Мясапусныя Дзяды

Традыцыі

Сённяшні дзень, 1 сакавіка, у Праваслаўнай царкве мае назву Усяленскай бацькоўскай (Мясапуснай) суботы. На Беларусі — Зімовыя, Масленыя, альбо Стрэчанскія (калі прыпадаюць на дату, блізкую да Стрэчання) Дзяды. Яны адзначаюцца на дзевятым перадвелікодным тыдні, у суботу, напярэдадні Мясапуснага тыдня, гэта дата — рухомая.

Дзяды — дні памінання нябожчыкаў, спачыльых продкаў, адзначаюцца некалькі разоў на год у залежнасці ад мясцовай традыцыі: на Радаўніцу, напярэдадні Сёмухі, перад Змітравым днём і г.д. На Дзяды рыхтуюць памінальны стол з няпарнаю колькасцю абрадных страў. Акрамя абавязковай куцці, гатуюць клёцкі, грыбы, бліны, яечню, мяса, узвар і іншыя стравы. У гэты дзень наведваюць могілкі, прыводзяць у парадак магілы, ідуць у царкву, моляцца. На Мясапусныя дзяды за памінальным сталом збіраецца ўся сям'я. У шклянку з зернем ставіцца запаленая свечка. Паводле звычаю, частку кожнай стравы сімвалічна адкладаюць у асобны посуд для нябожчыкаў і на ноч са стала не прыбіраюць. Пасля малітвы спажываюцца нарыхтаваныя стравы, успамінаюцца спачыльія родзічы і блізкія. «У суботу, а не ў іншы дзень Царква моліцца за спачыльых таму, што субота як дзень спакою па сваім значэнні ёсць найлепшы для такіх малітваў, — тлумачыць Беларускі праваслаўны каляндар за мінулы год. — Апроч таго, малітвы аб спачыне Царква нагадвае пра непазбежны для кожнага скон, пра нарыхтаванае для нас непадкупным Суддзёю выпрабаванне. Разумеючы падуладнасць Госпаду, необходнасць жыць праведна, мы, акрамя сказанага, рыхтуемся да строгага выканання надыходзячага выратавальнага посту».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Абзац

● У Віцебску затрымана група маладых людзей, якія падраблялі рэцэптурныя бланкі. Усе фальшыўкі былі выпісаны на адзін і той жа прэпарат, паведамляе Першы канал. Лекавы сродак прадаваўся па рэцэптах і выкарыстоўваўся для зняцця моцнага болевага сіндрому ў анкахворых і наркаманаў у час ломкі. Падробкай займаліся студэнты адной з вышэйшых навучальных устаноў Віцебска. Сапраўдны бланк сканіраваўся, з дапамогай камп'ютара наносіліся пячаткі, а запаўняўся ён ад рукі. Фальшыўкі былі адменнай якасці. Студэнтам пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі. Пакуль што яны знаходзяцца пад падпіскай аб нявыездзе і працягваюць вучыцца.

● **Сёлетняя каляндарная зіма ў Беларусі аказалася на рэдкасць цёплай, сярэдняя тэмпература паветра за тры зімовыя месяцы склала мінус 1 градус, што вышэй за кліматычную норму на 4 градусы. Гэта зіма стала адной з самых цёплых за ўвесь больш чым стогадовы перыяд метэаназіранняў. Але яшчэ цяплейшай была зіма 1988/1989 года, калі сярэднямесячная тэмпература паветра склала плюс 1 градус. 27 лютага ў Брагіне (паўднёвы ўсход Гомельскай вобласці) быў зафіксаваны рэкорд дня — ртутны слупок тэрмометра дасягнуў адзнакі плюс 16,5 градуса.**

● Беларускія памежнікі затрымалі на мяжы з Украінай дваіх парушальнікаў, «узброеных» бензапілой і рулеткамі. Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, парушальнікі шчыра прызналіся, што нелегальна прабраліся на беларускую тэрыторыю, каб заняцца нарыхтоўкай драўніны ў нашых лясах. У прэс-цэнтры падкрэслілі, што гэта не адзінкавы факт затрымання ўкраінскіх дрывасекаў у памежных лясах. Цяпер у жыхароў суседняй дзяржавы своеасаблівы «сезон палявання на беларускую драўніну». Праўда, і беларускія памежнікі не спяць у шапку: нелегальных нарыхтоўшыкаў затрымліваюць і прыцягваюць да адказнасці не толькі за парушэнне мяжы, але і за нанясенне шкоды лясной гаспадарцы.

● **Унікальны выпадак адбыўся ў Мінску. З 12-га паверха ўпала 32-гадовая жанчына і засталася жывая, паведаміла АНТ. Першую дапамогу пацярпелай аказалі на месцы. Затым яна была дастаўлена ў бальніцу з дыягназам «шматлікая траўма». Пакуль медыкі не каментуюць стан жанчыны, аднак кажуць, што гэта сапраўды цуд. Калі б жанчына ўпала на метр убок, дзе праходзіць труба, то не было б у яе ніякіх шанцаў. Змякчыць удар аб зямлю дапамаглі галінкі кустоўя. За жыццё жанчыны цяпер змагаюцца ўрачы, а праваахоўныя органы павінны вызначыць, гэта быў няшчасны выпадак, наўмыснае забойства або няўдалы суіцыд.**

● Двум інвалідам другой групы з вёскі Стары Доўск Рагачоўскага раёна, якім спатрэбілася цэгла. Здабыць яе яны вырашылі з будынка старой кацельні, і калі на пэўным этапе работы пачалі выбіваць гэты матэрыял са сцяны, на іх упалі дзве жалезабетонныя пліты. Мужчыну і жанчыне яўна пашанцавала, бо пліты, збіўшы іх на зямлю, за нешта зачапіліся і, навісшы над імі, прыціснулі так, што абое апынуліся ў палоне. Вызвалілі іх адтуль, як паведаміў нам прэс-сакратар Гомельскага ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, эмчээсаўцы. Мужчына з чэрапна-мазгавой траўмай апынуўся ў бальніцы, а жанчына перанесла стрэс.

● **У Гомелі на Масленіцу 2 сакавіка правядуць абрад «Цалавальнік», баі на мяшках і парасячыя бягі. Арганізатары вулічнага гуляння паклапаціліся пра тое, каб гэта свята максімальна наблізіць да беларускіх народных традыцый. Святочнае гуляння «Шырокая Масленіца» разгорнецца 2 сакавіка з 11.00 на цэнтральнай плошчы горада — імя Леніна. Галоўнай падзеяй масленічнага гуляння ў гэтым годзе абяцае стаць абрад «Цалавальнік», які ў даўніну шанаваўся на Беларусі. У Гомелі ён праводзіцца ўпершыню. Пары маладажонаў, якія не так даўно зарэгістравалі свае адносіны, возьмуць удзел у конкурсе на самы доўгі пацалунак. Пераможцаў чакаюць падарункі.**

Поўны абзац

● Вярхоўны суд Італіі забараніў мужчынам дакранацца да сваіх палавых органаў у грамадскіх месцах. Звычка хапацца за шырынку, якая сярод італьянцаў распаўсюджана як абярэг (напрыклад, мужчыны ў Італіі прыкладваюць руку да шырынкі пры размове аб смяротных хваробах або пры выглядзе пахавальнай працэсіі), з гэтага часу можа быць разгледжана як «акт парушэння грамадскай маралі». 42-гадовы жыхар правінцыі Камо быў прыгавораны Вярхоўным судом да штрафу ў 200 еўра. Яму таксама належыць выплаціць 1000 еўра судовых выдаткаў. У дадатак да ўсяго, суддзя, які не ўзяў пад увагу доказы абароны аб нязручных штанах абвінавачванага, заявіў, што мужчыну трэба было зайсці ў туалет або дайсці да ўласнага дома, дзе ён можа рабіць, што захоча.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Яму шанцавала ў жыцці...

Пайшоў з жыцця волат-асоба, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза Мікалай Іванавіч Абядняк. Развітацца з ім, выказаць спачуванне родным прыйшлі сябры—ветэраны, былыя саслужыўцы і супрацоўнікі, дзяржаўныя дзеячы...

Мікалай Іванавіч быў фігурай яскравай і каларытнай. Мы, маладыя тады журналісты (я працавала ў шматпрацы «Гарызонт», а Мікалай Іванавіч узначальваў аддзел на ВА «Гарызонт») любілі сустрэчы і гуткаркі з прасланутым разведчыкам, героем, ветэранам. Ён быў выдатным расказчыкам. Мы слухалі яго ўспаміны, як кажуць, раскрыўшы рот. Памятаю, Мікалай Іванавіч расказваў, як яго, 18-гадовага юнака, падчас вайны «пахавалі». Перад адпраўкай на лінію фронту ўся група здала дакументы і ўзнагароды на захаванне. Атрымалася так, што на салдата Абедняка паперы знікалі. Канцылярскія работнікі, доўга не думаючы, недалічыўшыся тых папер, адправілі дадому страшэнную вестку: «Ваш сын загінуў». Потым давялося доўга даказваць, успамінаў Мікалай Іванавіч, што я — гэта я. Апісваў падрабязна свой дом, калодзеж каля яго, пералічваў усіх родзічаў, каб толькі матуля паверыла, што я яе сын. Бо тады загінуць не было наканавана. Яшчэ трэба было многае здзейсніць. І ён, пакуль хапала сілаў, актыўна супрацоўнічаў з ветэранскімі арганізацыямі, сустракаўся і з задавальненнем дзяліўся ўспамінамі, жыццёвай мудрасцю з моладдзю, са школьнікамі. І кожны раз ён казаў: «Мне пашанцавала больш. Я жывы. А многія мае сябры, мільёны воінаў засталіся на палях бітвы».

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.

Павышаны закупачныя цэны

У Беларусі з 25 лютага павышаны закупачныя цэны на малако на 10 працэнтаў, мяса буйной рагатай жывёлы і свіней — на 5 працэнтаў, тлустую свініну — на 3 працэнты. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаіл Савельеў.

Адпаведную пастанову аб павышэнні закупачных цэнаў, а таксама гранічных адпускных цэнаў прыняло Міністэрства эканомікі. Гэта мера дасць магчымасць толькі часткова кампенсаваць затраты на вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі. Павышэнне гранічных адпускных цэнаў будзе адбывацца плаўна на працягу года — на 1,5—2 працэнты ў месяц.

Міхаіл Савельеў адзначыў, што гаспадаркам неабходна больш эфектыўна выкарыстоўваць прадастаўленую ўжо магчымасць атрымліваць малако класа «экстра», якое перапрацоўшчыкі з улікам павышэння цэнаў на малако на 10 працэнтаў будуць цяпер прымаць па Br825 тыс. за 1 т.

Пры павышэнні цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю не павінны быць ушчэмлены інтарэсы перапрацоўчых прадпрыемстваў, таму што яны нясуць асноўную фінансавую нагрузку і павінны своечасова разлічвацца з гаспадаркамі за здадзеную прадукцыю.

Застацца ў вёсцы

У рамках выканання Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі паляпшаюцца ўмовы працы і побыту сельскіх жыхароў

Адток сельскіх жыхароў у гарады цягне за сабою ланцужок складанасцяў — ад недахопу рабочых рук цяпер да адсутнасці рэпрадуктыўнага ўзнаўлення ў перспектыве. Усё гэта ставіла пад сумненне наяўнасць будучыні ў вёсцы. Для таго, каб вырашыць гэтыя і іншыя праблемы, тры гады таму была прынята Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі. Вынікі яе рэалізацыі за мінулы год і не толькі абмяркоўваліся падчас сустрэчы прадстаўнікоў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі з журналістамі.

— Сёння ёсць разуменне таго, што вясковы жыхар заслугоўвае значна лепшых умоў працы, жыцця, больш высокага заробку, — адзначае станоўчую тэндэнцыю **першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Надзея КАТКАВЕЦ.** — Можа, у рэальнасці не ўсё так, як хацелася б, аднак сваё важкае слова ў развіцці сельскай гаспадаркі і паляпшэнні сацыяльнай сферы праграма адраджэння і развіцця вёскі сказала. На жаль, не вельмі актыўна бяруць удзел у выкананні праблем вёскі многія міністэрствы і ведамствы, якія павінны працаваць над выкананнем сацыяльнай часткі праграмы.

Тым не менш спадарыня Н. Каткавец запэўніла журналістаў, што ніякага перагляду параметраў праграмы не будзе: ёсць задачы і нарматыўныя тэрміны, якія трэба выконваць.

Сёння толькі 10 працэнтаў тых, хто жыве ў вёсцы, працуе ў сельскай гаспадарцы. Аднак нельга не ўлічваць тую акалічнасць, што з узрастаннем колькасці тэхнікі патрэба ў працаўніках у пэўнай ступені змяншаецца. Ці спраўляюцца працаўнікі з запланаваным у сельгасвытворчасці?

— Фактычна ўсе параметры, абазначаныя Праграмай адраджэння і развіцця вёскі для сельскагаспадарчай вытворчасці, выконваюцца, — адзначыла Надзея Каткавец.

Па асноўных відах сельскагаспадарчай прадукцыі ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі абазначаныя праграмай паказчыкі дасягнуты. Атрымана неабходная колькасць зерня, цукровых буракоў, рапсавага алею, нарыхтавана дастаткова кармоў, высокія прывагі жывёлы. Не атрымалася хіба што дасягнуць неабходнага ўзроўню вытворчасці льнопрадукцыі. Затое ёсць выдатныя вынікі ў вытворчасці малака. На пагалоўі ў мільён дзвесце тысяч кароў летась надойвалі ў сярэднім 4135 літраў малака ад каровы. Паводле слоў Надзеі Каткавец, сёлета плануецца павысіць прадукцыйнасць на ўсім пагалоўі да 4,5 тысячы літраў малака. «Сельская гаспадарка Беларусі развіваецца не экстэнсіўным, а інтэнсіўным шляхам», — падкрэсліла першы намеснік міністра.

— Вызначальны фактар для сельскагаспадарчай вытворчасці — правільная цэнавая палітыка, — упэўнена Н. Каткавец. — Ёсць пэўныя цяжкасці ў тым, каб знайсці ўзаемаразуменне з Міністэрствам эканомікі ў фарміраванні цэнаў на прадукцыю жывёлагадоўлі. Аднак і тут мы маем пазітыўныя зрухі: літаральна за апошнія паўгода кошт малака павысіўся з 350 да 770 тысяч рублёў за тону. Такі ўзровень цэнаў робіць вытворчасць малака рэнтабельнай. Наша прадукцыя прадаецца, залежы няма. Попыт на харчаванне расце. Па некаторых відах прадукцыі экспартныя цэны вышэйшыя за цэны на ўнутраным рынку, што дапамагае прадпрыемствам. Асабліва адчувальна гэта было летась для малочных заводаў. Крыху горш па мясакамбінатах: калі ў 2005—2006 гадах у іх быў свабодны дазвол на імпарт мясасыравіны, асабліва таннай польскай, эканамічныя паказчыкі мясакамбінатаў былі значна лепшымі. На жаль, па выніках працы за 2007 год каля 25 мясакамбінатаў аказаліся стратнымі.

Першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання звярнула ўвагу і на тое, што акрамя цэнавай палітыкі варта займацца і ўнутранымі праблемамі — кадравымі, тэхнічнымі.

Не абмінулі падчас гутаркі і «пшанічнае» пытанне. Гэта ўжо не навіна, што расійскі ўрад увёў часовую забарону на экспарт пшаніцы ў краіны—удзельніцы пагадненняў аб Мытным саюзе, з тым ліку і ў Беларусь. Аднак цікавае стаўленне да гэтага Мінсельгасхарча Беларусі і наступствы для жыхароў нашай краіны.

— Насельніцтва Беларусі гэтага не адчуе, — супакоіла Надзея Каткавец. — З Расіяй былі заключаны дагаворы на зусім невялікую колькасць паставак зерня, і, паводле гэтых дамоўленасцяў, яно было атрымана. І нават калі ўзнікне такая неабходнасць, дакупіць зерне на харчовыя мэты можна будзе ва Украіне, у Казахстане.

Пры гэтым першы намеснік міністра выказала наступнае стаўленне Мінсельгасхарчу Беларусі да прынятых Расіяй мераў: «З пункту гледжання Саюзнай дзяржавы бы яшчэ і ва ўмовах, калі сусветны рынак мае сур'ёзны дэфіцыт зерня, Расія не павінна была прымаць такога рашэння». Надзея Каткавец паведаміла таксама, што Міністэрства замежных спраў Беларусі накіравала адпаведную ўрадавую ноту для таго, каб сітуацыю з Беларуссю разгледзелі асобна.

Ад вытворчасці — да сацыяльнай сферы. Каб людзі захацелі жыць у вёсцы, недастаткова пашырыць вытворчасць і стварыць дадатковыя працоўныя месцы — трэба павысіць таксама сацыяльныя стандарты.

— Можна набудаваць неверагодную колькасць фермаў і камбінатаў, накупляць найноўшай сельскагаспадарчай тэхнікі, аднак не стварыўшы годных умоў жыцця, не забяспечыўшы належны ўзровень заробку, высокаэфектыўнай сельскагаспадарчай вытворчасці не атрымаць, — зазначыла Надзея Каткавец.

Найбольш паказальныя ў гэтым плане — аграгарадкі, якія на сёння створаны ў 666 населеных пунктах Беларусі.

— Штогод аб'ёмы працы і колькасць праблем там растуць, — адзначае Надзея Мікалаеўна. — Аднак, безумоўна, ёсць і вынікі. Прыведзены ў парадак крамы, цяпер там новае абсталяванне, стаў багацейшым асартымент, змяніліся і самі прадаўцы — іх знешні выгляд і культура абслугоўвання. Для сельскіх жыхароў сталі больш даступнымі паслугі цырульнікаў і абутковых майстроў, паляпшаюцца таксама паслугі сувязі (мабільнай і стацыянарнай), актыўна будуецца жыллё, аднаўляюцца і ўзводзяцца новыя клубы, школы, падводзяцца дарогі ад райцэнтраў, працуюць сельскія амбулаторыі.

— Вясковыя жыхары цяпер масава пераафармляюць жыллёвыя крэдыты на сябе — гэта вельмі станоўчая тэндэнцыя: людзі замацоўваюцца ў гэтай мясцовасці, — адзначыла Надзея Каткавец.

Ала МАЧАЛАВА.

Пакаранне і перавыхаванне

«ЗЯЗЮЛЬЧЫНЫ» ДЗЕЦІ

Летась супраць нядбайных бацькоў было ўзбуджана 1,1 тысячы крымінальных спраў

Вось ужо больш чым год у нашай краіне вядзецца прымусовае перавыхаванне алкаголікаў і іншых асацыяльных членаў грамадства, якія перакладваюць на плечы дзяржавы клопат пра сваіх дзяцей. Нагадаю, што з 1 студзеня мінулага года дзейнічае прэзідэнцкі Дэкрэт № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях».

Паводле гэтага дакумента «бацькі-зязюлі» абавязаны працаўладкавацца і выплачваць кампенсацыю дзяржаве за ўтрыманне пакінутых дзяцей. Аднак у працэсе рэалізацыі памянёнага дакумента, як адзначыў міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, міліцыя дзі і іншыя зацікаўленыя ведамствы сутыкнуліся з шэрагам праблем. Таму на ініцыятыве МУС учора адбылася аператыўная нарада, удзел у якой узялі не толькі прадстаўнікі праваахоўных органаў, але і міністэрстваў адукацыі, аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны, выканаўчых камітэтаў. І гэта зусім заканамерна. Бо вырашыць праблему пакінутых дзяцей і нядбайных бацькоў, як падкрэсліў кіраўнік МУС, можна толькі сумеснымі намаганнямі. Працы ў гэтым накірунку яшчэ многа. Хоць, паводле слоў Уладзіміра Навумава, колькасць няўдалых сем'яў, пасля прыняцця памянёнага Дэкрэта пачала скарачацца.

Як адзначыў начальнік упраўлення прафілактыкі МУС краіны Мікалай Дрозд, летась у нядбайных бацькоў былі адабраны і змешчаны ў спецыялізаваныя ўстановы 3,5 тысячы дзяцей. Усяго цяпер на прафілактычным уліку ў міліцыі знаходзяцца больш за 12 тысяч «зязюль», з якіх удалося працаўладкаваць прыкладна 10,5 тысячы. Астатнія альбо ўхіляюцца ад працы самі, альбо ад іх паслуг адмаўляюцца прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы.

У прыватнасці, паводле слоў Мікалая Дразда, 824 «зязюлі» ўвогуле адмовіліся нават наведаць службу занятасці. Праўда, шчыра кажучы, такіх асобаў не вельмі ахвотна бяруць на працу. Кіраўнік аднаго з прадпрыемстваў Гомельшчыны адкрыта заявіла міліцыянерам, якія спрабавалі ўладкаваць нядбайных бацькоў, што яе фірма не папраўча-выхаваўчая калонія. Увогуле, летась было зафіксавана 517 падобных выпадкаў адмовы ў прыёме на працу.

Да адміністрацыйнай адказнасці былі прыцягнуты 50 кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія не захацелі «няньчыцца» з гора-бацькамі грамадства. Міністр унутраных спраў разумее гэтых дырэктараў фабрык, заводаў і прыватных фірмаў. Таму прапанаве замест адміністрацыйных пакаранняў укараніць практыку прадастаўлення льгот тым прадпрыемствам, якія выкарыстоўваюць «зязюльчыну сілу». Але нават калі ўдасца працаўладкаваць усіх нядбайных бацькоў, гэта не вырашыць праблем вяртання імі агромністых даўгоў дзяржаве.

Да прыкладу, паводле звестак Міністэрства адукацыі, за мінулы год «зязюлі» завінаваціліся дзяржаве амаль 90 мільярдаў рублёў, з якіх спагнана было крыху больш за 20 працэнтаў. Штомесяц на ўтрыманне аднаго дзіцяці дзяржава затрачвае ў сярэднім 250 тысяч рублёў. А сярэдні заробак такіх «гора-бацькоў» у мінулым годзе складаў 198,5 тысячы рублёў у месяц. Яшчэ меншыя даходы ў асобаў, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі і лячэбна-працоўных прафілактарыях (ЛПП). А такіх таксама нямала. Летась за ўхіленне ад клопатаў па ўтрыманні сваіх дзяцей былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 1,1 тысячы чалавек. Крыху больш за 460 нядбайных бацькоў, хворых на алкагалізм, былі накіраваны ў ЛПП. Праўда, у лячэбна-працоўных прафілактарыях яны доўга не затрымліваюцца. Паколькі памянёныя ўстановы перанаселены, то амаль палову «зязюль» выпускаюць на волю датэрмінова. Паводле слоў Мікалая Дразда, цяпер вырашаецца пытанне аб адкрыцці новых ЛПП у Брэсцкай і Віцебскай абласцях.

Ёсць пэўныя праблемы і з вышукам нядбайных бацькоў. Многія з іх хаваюцца за мяжой, у той жа Расіі. І нават калі праваахоўным органам нашай краіны ўдаецца ўстанавіць іх месцазнаходжанне, то ўзнікаюць цяжкасці з «экстрадыцыяй». Бо, напрыклад, па расійскіх законах ухіленне бацькоў ад утрымання дзяцей не з'яўляецца злачынствам. Вядома ж, ёсць таты і мамы, якія ў рэшце рэшт усведамляюць свае памылкі і пачынаюць весці нармальны лад жыцця. У такіх выпадках ім даецца шанц «аднавіць свае сем'і». Летась, напрыклад, нядбайным бацькам, якія сталі на шлях выпраўлення, былі вернуты 1,5 тысячы дзяцей.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

У нядбайных бацькоў адабрана і змешчана ў спецыялізаваныя ўстановы 3,5 тысячы дзяцей.

Пасля суда

КНЯЖЫЦКІ ШОК

28 лютага калегія Магілёўскага абласнога суда пакінула ў сіле прысуд 37-гадоваму мужчыне, які п'яны кіраваў аўтамабілем і наехаў на кампанію моладзі ў вёсцы Княжыцы Магілёўскага раёна. У выніку здарэння 15-гадовая дзяўчына памерла на месцы, 17-гадовы падлетак атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні, пацярпелі яшчэ два чалавекі. Вадзіцель з месца здарэння ўцёк.

Магілёўскі раённы суд пакараў яго 5 гадамі пазбаўлення волі.

— Гэта максімальнае пакаранне, прадугледжанае Крымінальным кодэксам за парушэнне правілаў дарожнага руху, якое па несцярожнасці прывяло да смерці чалавека і ўчыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, а таксама за пакіданне людзей у небяспецы, якую ж сам і стварыў, — праакментавала прысуд суддзя Ніна Рубіс.

Між тым, ахвяры, іх сваякі і сведкі таго здарэння засталіся, калі шчыра, незадаволенымі. Княжыцкія людзі палічылі і такое пакаранне надта мяккім. Верагодна, яшчэ і таму, што не першым разам іх дзеці гінуць пад коламі аўтамабіляў. Гэта балючая тэма для вёскі, праз ускраіну якой праходзіць аўтатраса.

На пачатку мінулага года ў Княжыцах адбылося страшнае дарожна-транспартнае здарэнне: міжгародняя маршрутка збіла на пешаходным пераходзе двух першакласнікаў, якія выйшлі з рэйсавага аўтобуса і цераз дарогу ішлі ў школу. Хлопчык загінуў на месцы. Дзяўчынка ў цяжкім стане была шпіталізаваная, але праз колькі часу памерла. Вадзіцель, 36-гадовы жыхар Мінска, быў асуджаны рашэннем Магілёўскага раённага суда на 4 гады пазбаўлення волі ў калоніі для пасялення. На той момант другое дзіця было жывое, знаходзілася ў коме...

Жыхары Княжыцаў і навакольных вёсак былі ў шоку. Яны запатрабавалі ад уладаў навесці парадак у падземным пераходзе праз аўтатрасу, які быў пабудаваны гадоў дзесяць таму, але быў засмечаны і стаў ледзь не прыбіральняй. Цяпер падземны пераход працуе, там ёсць асвятленне. Пешаходны пераход наверсе загародзілі, і каля яго на поручнях вісяць два жалобныя вянкі, якія нагадваюць пра леташнюю трагедыю.

На жаль, яна была не апошняй. 2007-ы стаў для Княжыцаў сапраўды «чорным годам».

...Напрыканцы верасня, у выхадны дзень натоўп моладзі ідзе па абочыне дарогі з вясковай дыскатэкі. Гэта было ўначы, пераважала за апоўнач. Усе падлеткі — як і належна, з флікерамі.

Тут, па словах аднаго са сведкаў, пачуўся шум аўтамабіля, які нясецца па дарозе на немалой хуткасці. Як потым высветлілася — каля 100 кіламетраў у гадзіну. Вадзіцель не спраўляецца з кіраваннем, і машына перад паваротам на трасу «Мінск—Магілёў» уразаецца ў кампанію, раскідаўшы падлеткаў. Замест таго, каб аказаць дапамогу дзецям, вадзіцель нацыскае на газ і знікае з месца здарэння.

Літаральна за некалькі гадзін міліцыя знаходзіць меркаванага віноўніка аварыі: ён спіць п'яны ў вартаўніцкай свінакомплексу сельскагаспадарчага прадпрыемства «Авангард». Непадалёк — аўтамабіль «Форд-Сіера» са слядамі аварыі.

Гэта справа стала вядомай у Магілёўскай вобласці яшчэ і з-за таго, што затрыманы міліцыяй чалавек катэгарычна адмаўляў сваю віну. Ён казаў, што быў п'яны, спаў, нічога не памятае і, верагодна, нехта іншы вінаваты ў смерці дзяўчыны і траўмах іншых дзяцей...

— З нейкага пункту гледжання нічога не памятаць нават зручна, — лічыць суддзя Ніна Рубіс. — Але знайшліся сведкі, якія размаўлялі з падсудным напярэдадні здарэння: ён быў п'яны, але, наколькі гэта магчыма, адэкватны і, відаць, ведаў што робіць. Акрамя гэтага, на судзе распавядалі пра яго небяспечныя звычкі. Ён і раней нецвярозы ганяў на сваім аўтамабілі і пужаў падлеткаў тым, што нібыта наязджаў на іх...

Жахліва, што мужчыну раніцай папярэдняга дня, за няпоўныя суткі да трагедыі, спынілі інспектары ДАІ. Ён быў п'яны, у яго адабралі правы на кіраванне транспартным сродкам, але гэта не перашкодзіла яму не толькі выпіць удзень яшчэ, але і зноў сесці за руль аўтамабіля і разам з прыяцелем паехаць у суседнюю вёску Ніціянічы.

Па вяртанні і адбылося страшнае ДТЗ. Прычым той прыяцель, які ехаў на «Жыгулях» і бачыў людзей, якія ляжаць на дарозе, не спыніўся: толькі крыху прытармазіў, а потым хутка ўцёк. Пра гэта сведчаць матэрыялы судовага разбору.

Працэс у Магілёўскім раённым судзе быў цяжкім. Дзеці, якія так і не адышлі ад эмацыянальнага ўзрушэння, з цяжкасцю маглі адказваць на пытанні суддзі. Бацькі ж, якія разумелі, што павінны даць суду паказанні. Падлеткі сабраліся з сіламі, але моцна хвалявалася. Яны нават часам казалі, што нічога не памятаюць — так іх памяць абаранялася ад стрэсу, закрывалася ад страшных успамінаў.

Цяжкую псіхалагічную траўму атрымалі не толькі тыя, хто пацярпеў фізічна, але і хто проста быў сведкам здарэння. Маці адной з дзяўчатак расказала, што шок у дачкі так і не праходзіць.

— Жахліва, калі на дарозе гінуць дзеці, — сказаў начальнік ДАІ Магілёўскага раёна Мікалай Шароў. — Цяжкасць яшчэ і ў тым, што ў дзяцей фізічныя раны хутка зажываюць, бо арганізмы маладыя і здаровыя. А вось для вылячэння псіхічных, душэўных ран патрабуецца шмат часу. З падлеткамі з Княжыцаў і праз месяцы пасля здарэння немагчыма размаўляць пра аварыю: яны адразу плачуць.

У Княжыцкай сярэдняй школе паведамілі, што дзеці, якія пацярпелі ў аварыі, цяпер вярнуліся да

Краіна здароўя

Выпуск № 11 (67)

НОВАЯ БАЛЬНІЦА: ЛЯЧЭННЕ, РЭАБІЛІТАЦЫЯ, КАМФОРТ

У Магілёве сёлета адкрылася бальніца, дзе створаны аддзяленні для лячэння і рэабілітацыі кардыялагічна хворых.

Ложкі для лячэння хворых на сэрца яшчэ да нядаўняга часу былі дэфіцытнымі ў Магілёўскай вобласці. Пацыентаў адпраўлялі ў кардыялагічнае аддзяленне Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай дапамогі, дзе часам не хапала месца нават на калідорах.

Пра такую сітуацыю, прынамсі, распавёў жыхар Чэрыкаўскага раёна, які патэлефанаваў на нядаўнюю «прамую лінію» з удзелам старшыні Камітэта дзяржкантролю Зянона Ломаця. Напружанне з ложкамі для пацыентаў кардыялогіі цяпер здымаецца ў новай бальніцы.

У будынку былой чыгуначнай бальніцы цяпер месціцца філіял «Бальніца» Магілёўскага абласнога лячэбна-дыягнастычнага цэнтра. Да медыцынскай установы, якая раней займалася толькі дыягностыкай, далучылі стацыянар.

На рамонт выдаткавалі больш за 100 мільёнаў рублёў: хоць звонку стары будынак выглядаў даволі прыстойна, унутры ўсё прыйшло ў заняпад. Рамонт амаль завершаны. У невялікіх пакоях — да 4—5 ложкаў. Хутка адкрыюцца пакоі павышанай камфортнасці на 1—2 месцы, з асобнай прыбіральняй.

— Мы яшчэ толькі пачалі працаваць, — каментуе кіраўнік філіяла «Бальніца» Віктар Тоесцеў. — Нашы пацыенты — усяго іх у бальніцы 130 — задаволеныя лячэннем і камфортам.

У бальніцы ёсць аддзяленне рэабілітацыі для хворых неўралагічнага і траўматычнага профілю. А што датычыцца вельмі запатрабаванай кардыялогіі, то для такіх пацыентаў у новай бальніцы створаны 76 ложкаў.

Летась у Магілёўскай абласной бальніцы сталі рабіць аперацыі на сэрцы. Сёння гэта ўжо паток, і пасля 10—14 дзён у кардыяхірургіі пасляаперацыйныя пацыенты маюць патрэбу ў рэабілітацыі. Цяпер іх пераводзяць у новую бальніцу ў спецыялізаванае аддзяленне.

На апаратуру новай бальніцы выдаткавана больш за 300 мільёнаў рублёў. Палепшылася абсталяванне блока рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі, які разлічаны на 6 месцаў.

Там цяпер адны мужчыны. Рэаніматолаг Жана Шостка ўсміхаецца: «Нібыта ўсе сабраліся з намі мужчынскае свята адзначаць!» Хоць жанчыны таксама часта пакутуюць ад хваробы сэрца, зазначае па ходу доктар.

«Як здароўе?» — у адказ сіваволосы мужчына паказвае вялікі палец рукі ўверх. Ён кажа, што яму значна лепей. А загадчык аддзялення кардыялогіі Аляксандр Дзем'янкоў шэпча: «Тры дні таму мы яго ледзь не страцілі...»

У кардыялогіі новай бальніцы свой стыль, гаворыць Дзем'янкоў. Ён адрозны ад падобнага аддзялення ў бальніцы хуткай дапамогі, дзе лечаць вострыя паталогіі і часта вымушаны тэрмінова ўмешвацца ў сітуацыю дзеля выратавання жыцця пацыента. У новай бальніцы ўсё скіравана на руплівае даследаванне — магутная база дыягнастычнага цэнтра дазваляе гэта, на падбор лекаў, рэабілітацыю і папярэджанне.

Паводле афіцыйнай інфармацыі, у краіне летась 52 чалавекі са 100 памерлі ад сардэчна-сасудзістых захворванняў. Хоць смяротнасць ад хваробаў сэрца ўсё ж знізілася на 8 працэнтаў, Беларусь застаецца адным з лідараў у Еўропе па колькасці сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Каб пазбегнуць небяспечных хваробаў — напрыклад, ішэмічнай хваробы сэрца ці гіпертаніі, — Аляксандр Дзем'янкоў нагадвае аб правілах жыцця, якіх неабходна прытрымлівацца чалавеку.

Першае: здаровы лад жыцця — нармальныя праца, адпачынак, харчаванне, адмова ад шкодных звычак.

Другое: кантроль — не толькі за сваімі адчуваннямі, але і лабараторны. Калі да лёгкага недамагання дадаецца, напрыклад, павышанае ўтрыманне халестэрыну ў крыві, трэба мяняць сістэму харчавання і лад жыцця.

Трэцяе: калі хвароба спасцігла вас — трэба прымаць лекі і прытрымлівацца спецыяльнай дыеты. Прычым рабіць гэта не самастойна, а з дапамогай спецыяліста. Ніякага самалячэння — ідзіце да доктара!

Ілона ІВАНОВА.

ЦІ ВАРТА АДМАЎЛЯЦЦА АД БУТЭРБРОДА З СЫРАМ?

Раней сыр лічыўся дыетычным прадуктам. А цяпер у парадах для тых, хто сочыць за сваёй фігурай, вельмі часта ўтрымліваецца папярэджанне, што сыр адносіцца да высокакаларыйных прадуктаў. Маўляў, не захапляйцеся тлустымі гатункамі сыру. Вось чаму хацелася б даведацца, наколькі апраўданай будзе адмова ад гэтага, на мой асабісты погляд, карыснага і смачнага прадукту. Тым больш мне цяжка ўявіць сабе традыцыйны ранішні бутэрброд без сыру...

Т.М. БЕЛЬСКАЯ, *г. Івацэвічы.*

Наша чытачка мае рацыю. Сыр і сапраўды ўваходзіць у пералік дыетычных прадуктаў. Больш за тое, вельмі многія дыетолагі прытрымліваюцца меркавання, што лепш з'есці сыр, чым кавалак мяса.

Сыр вырабляюць з малака, з якога ўсе карысныя рэчывы (за невялікім выключэннем) пераходзяць у сыр у канцэнтраваным выглядзе. 100—200 грамаў сыру адпавядаюць 3—6 літрам малака. Лячэбныя і дыетычныя ўласцівасці сыру абумоўленыя яго складам. У сырах утрымліваецца да 22 працэнтаў бялку, гэта значыць, больш чым у мясе. Трэба заўважыць, што харчовая каштоўнасць бялкоў у розных прадуктах — розная, і залежыць яна ад складу амінакіслот, з якіх пабудаваны той ці іншы бялок. Па ўтрыманні амінакіслот бялкі сыру падобныя на бялкі тканак і органаў чалавека і з'яўляюцца крыніцай незаменных амінакіслот, у тым ліку найбольш дэфіцытных — трыптафану, лізіну і меціяніну. Трэба патлумачыць, што незаменныя кіслоты арганізм чалавека самастойна сінтэзаваць не можа, таму яны павінны паступаць у арганізм разам з ежай.

У працэсе саспявання сыру пад уздзеяннем карысных бактэрый адбываецца распад бялкоў і пераход іх у спалучэнні, якія добра засвойваюцца арганізмам. Бялкі сыру, у адрозненне ад іншых прадуктаў, у тым ліку і малочных, засвойваюцца максімальна поўна — на 98—99 працэнтаў, прычым на іх засваенне арганізм выдаткоўвае значна менш энергіі.

Харчовая каштоўнасць сыру вызначаецца таксама высокім утрыманнем тлушчу, які з'яўляецца важнай крыніцай энергіі і будаўнічым матэрыялам для клетачных культур, прымае ўдзел у падтрыманні гарманальнага статусу арганізма і рэгуляцыі абмену рэчываў. Дарэчы, малочны тлушч утрымлівае фасфатыды, галоўным чынам лецыцін, якія рэгулююць абмен тлушчаў і халестэрыну, абараняючы нас ад развіцця атэрасклерозу. Варта мець на ўвазе, што ўтрыманне тлушчу ў сыры заўсёды меншае, чым указана на этыкетцы, паколькі разлік рэчыва вытворчасці ажыццяўляецца на сухую вагу, без уліку вільготнасці. Таму пры тлустасці, напрыклад, 45 працэнтаў і вільготнасці 40 працэнтаў на самай справе ў 100 грамах сыру будуць утрымлівацца толькі 32 грамы тлушчу, гэта значыць, што рэальная тлустасць будзе складаць 32 працэнты. Малочны тлушч мае параўнальна нізкую тэмпературу плаўлення, таму лёгка і амаль цалкам засвойваецца арганізмам.

А вітаміны ў сыры нават больш, чым у малацэ. Па-першае, таму, што сыр з'яўляецца канцэнтраваным прадуктам. А, па-другое, таму, што ў перыяд саспявання пад уздзеяннем тых жа самых бактэрый, якія расшчапляюць бялкі, у сыры назапашваюцца вітаміны, у асаблівасці, рыбафлавін (вітамін B_2), якога ў гэтым прадукце ў восем разоў больш, чым у малацэ. У сырах утрымліваюцца таксама вітаміны А, Д, Е, B_1, С, пантатэнавая кіслата і г.д. — г.зн. практычна ўсе вітаміны, неабходныя для нармальнага функцыянавання арганізма.

Урачы-дыетолагі раяць уключаць сыр у рацыён усіх, чыя работа звязана з вялікімі выдаткамі энергіі. Мінеральныя рэчывы (у прыватнасці, кальцый і фосфар), якія ўваходзяць у склад сыру, робяць гэты прадукт асабліва каштоўным для дзяцей, падлеткаў, цяжарных і кормячых жанчын, хворых з пераломамі касцей, хворых на туберкулёз, людзей з захворваннямі пячонкі і жоўцевых шляхоў. Звычайна сыры добра пераносяць людзі нават з недастатковай ферментатыўнай актыўнасцю страўнікава-кішачнага тракта. Спецыялісты падлічылі, што кожнаму чалавеку трэба спажываць штодня 18—20 грамаў сыру, а гэта складае прыкладна 7 кілаграмаў у год. Праўда, ёсць адна заўвага: вострыя сыры не рэкамендуецца спажываць пры язвавай хваробе, гастрытах і калітах павышанай кіслотнасці, ацёках сардэчнага ці ныркавага паходжання, а таксама гіпертанічнай хваробе.

А цяпер колькі слоў аб тым, на што трэба звяртаць увагу пры набыцці сыру. Сыры добра ўсмоктваюць любыя пахі. Таму побач з сырам могуць знаходзіцца на гандлёвым прылаўку толькі малочныя прадукты, яшчэ лепш, калі пад сыр адведзена асобная вітрына. Выбіраючы сыр, абавязкова звяртайце ўвагу на яго колер. Сырная галоўка павінна мець раўнамерную афарбоўку. Калі вы заўважыце, што ў цэнтры прадукт мае жоўты колер, а па краях — бялёсы, значыць былі парушаны вытворчыя працэсы ці правілы захоўвання. Трэшчынкі на паверхні сыру таксама красамоўна сведчаць аб парушэннях правілаў захоўвання ці транспарціроўкі.

Калі вы набываеце сыр наперад, ніколі яго не рэжце, інакш ён «выдзеліць слязу», хутка стане цвёрдым і страціць свой спецыфічны смак. Сыр неабходна захоўваць на ніжняй паліцы халадзільніка загорнутым у поліэтыленавую плёнку ці пакет, каб ён не высыхаў. Для таго, каб праявіўся водар сыру, яго трэба вытрымаць перад спажываннем дзве-тры гадзіны пры пакаёвай тэмпературы.

Сыр будзе больш доўга захоўваць сваю свежасць, калі яго змясціць у закрыты посуд, паклаўшы побач некалькі кавалачкаў цукру. Каб захаваць смак цвёрдага сыру, яго можна таксама загарнуць у змочаную падсоленай вадой шчыльную тканіну. А каб засохлы сыр зноў стаў мяккім, яго можна на нейкі час пакласці ў свежае ці кіслае малако.

Сямейны псіхолаг
Святлана Анішчанкава

БАНК ДУШЫ

Разуменне прыроды мужчыны і жанчыны прыходзіць з гадамі. Расчараванне і недавер, як правіла, спадарожнічаюць першым гадам сумеснага жыцця. Прызначаныя прыродай вырашаць розныя задачы для агульнай карысці, мужчына і жанчына пераадольваюць на шляху да ўзаемаразумення канфлікты, крызісы і выходзяць на стваральны шлях даволі патрапанымі. Маючы абмежаванае ўспрыняцце свайго роду і ўспрымаючы навакольны свет праз прызму палавой прыналежнасці, мужчыны і жанчыны трацяць ільвіную долю сваіх эмацыянальных запасаў на «перацягванне каната», памылкова мяркуючы, што «канфлікт полаў» мае на ўвазе перамогу аднаго з бакоў.

Да сярэдняга ўзросту стомлены арганізм просіць перадышкі і ўключае механізмы самазахавання. Мы пачынаем быць больш цярпімымі адно да аднаго, але аб даверы, на жаль, у многіх так гаворка і не заходзіць. Пражыўшы нямала гадоў разам, многія сямейныя пары так і застаюцца чужымі. Падазронасць і ўласная нявінаватасць становяцца перашкодай для развіцця гарманічнага саюза. Але шкадаваць аб пражытым нецікавым жыцці, поўным сарказму і цярпімасці, мы пачынаем занадта позна, на схіле дзён, калі ўжо няважна, хто вінаваты, бо час рассудзіў і — «мы ўсё жыццё разам».

Не вучаць нас у школах мужчынскай і жаночай псіхалогіі. Часам дастаткова добрага слова, каб папярэдзіць чарговы канфлікт, які вядзе да знішчэння кахання. Варта бывае прыгледзецца — і ўбачыш тую ж пяшчоту ў вачах, што была да вяселля. Увесь слоўнікавы запас захаваўся з часоў юнацтва, проста ляжыць на пыльнай паліцы душы і чакае свайго часу. З гадамі ўсё меней сілаў, іх забіраюць клопаты, праблемы, якія вядуць да спусташэння нервовай сістэмы і арганізма ў цэлым.

Мігрэнь, неўроз, тахікардыя — верныя нашы «спадарожнікі», старыя «сябры». Рэдкія радасці не ў стане змагацца з негатыўнымі эмацыянальнымі перагрузкамі, і жыццё набывае шэрае адценне. Рэзервы нашы мы не бачым. Блізкія нам людзі — жонкі, мужы — надта рэдка чуюць ад нас словы ўдзячнасці. Але ж словы — ключ да ўзаемаразумення: «Абдымі мяне, я так стаміўся, сумаваў...». Гэтыя словы не патрабуюць асаблівай мужнасці, але якраз такія элементарныя, здавалася б, фразы з кожным пражытым годам усё цяжэй гаварыць.

Віноўнікам слоўнікавага бар'ера часта бывае наша сумненне ў сабе. З гадамі нам здаецца, што мы ўжо не такія прывабныя для нашага партнёра і ён не зацікаўлены ў эмацыянальнай блізкасці, якую часта блытаюць з сэксуальнай. Распаўсюджаная думка аб фізіялагічнай прывычцы, якая вядзе да зніжэння сэксуальнай актыўнасці мужа і жонкі, што пражылі шмат гадоў разам, на першы план вылучае палавое жыццё. А яно, як вядома, займае значна меншы адрэзак жыцця, чым паўсядзённыя бытавыя зносіны, у якіх і павінны сталець і расцвітаць жаданні і фізічная блізкасць, заснаваная на эмацыянальнай. А ніяк не наадварот. Мужчыны, насуперак прынятай думцы, значна часцей падвержаны сумненням, чым жанчыны.

І як вынік — замыкаюцца ў сабе і збоку здаюцца абыякавымі. На самай справе мужчынам пяшчота патрэбна яшчэ больш, чым жанчынам, таму што ад прыроды жанчыны валодаюць значным багажом для прыцягнення інтарэсу супрацьлеглага боку.

Мужчыны часта не ўсведамляюць дэфіцыту пяшчоты, прыпісваючы яго агульнай стомленасці ад штодзённых клопатаў. Разрадка ў выглядзе сустрэч з сябрамі за кубкам піва ставяць у тупік цудоўную палавіну і са словамі: «Ён любіць сяброў больш, чым мяне» дамы ідуць у бой за лідзіруючае месца ў душы мужа. Але калі добрыя адносіны ёсць да сяброў, значыць, дзесьці яны ёсць і да жонкі. Заваленая «храмам» неабходных умоўных слоў «трэба», «абавязкова», «хачу», яна цярпліва чакае свайго часу. Жаданне і ўменне выклікаць пазітыўныя рысы супрацьлеглага полу — навука, якую трэба спасцігаць дзень за днём. Паляпшэнне эмацыянальнай якасці і, як вынік, павелічэнне станоўчых перажыванняў вядзе да павышэння магчымасцяў чалавека і сям'і ў цэлым. Уменне падтрымліваць адно аднаго адкрывае вялікія рэзервы ў сацыяльным асяроддзі і прадаўжае актыўны фізічны ўзрост сям'і.

Мужчына, якога кахаюць, паважаюць і чакаюць, будзе больш паспяховым і здаровым, чым зматаны бытавымі цяжкасцямі і пачуццём непаўнацэннасці чалавек, у якога да 40 гадоў відавочны хранічны неўроз і павышаны ціск, і навязлівае жаданне расслабіцца за шклянкай. Жанчына, якую кахаюць, паважаюць і чакаюць, больш захоўвае сацыяльную актуальнасць і свецяцца шчасцем, якое сагравае ўсіх, хто з ёй побач. Дзеці ў такіх сем'ях растуць моцныя, здаровыя і ўпэўненыя ў сабе. Пераняўшы годны вопыт бацькоў, яны будуць ствараць паўнацэнныя сем'і. Але ўсё гэта можа развівацца пры ўмове беражлівых адносінаў да сябе і тых, хто побач, разумення хуткацечнасці жыцця і кволасці чалавечай душы, якая, як пяшчотная кветачка, засыхае без любові і цяпла.

Пастарайцеся адзін вечар запісваць усе словы, якія вы гаворыце свайму мужу (жонцы), і вы зразумееце, куды далей накіраваць парусы для сумеснага плавання. Калі прыемных слоў больш — значыць, вы на правільным шляху да гармоніі душы і цела. Эмацыянальныя ўкладанні ў банк душы — самыя выгадныя. Набраўшы неабходную суму станоўчых эмоцый, на схіле сваіх дзён вам будзе за кошт чаго пагрэцца на беразе мора кахання, цяпла і даверу.

ЗДАРОЎЕ на талерцы

Аснову дыетычнага харчавання, якое адыгрывае значную ролю ў лячэнні і папярэджанні многіх захворванняў, складаюць раслінныя прадукты, багатыя на харчовыя валокны, натуральныя вітаміны. Стравы з такіх прадуктаў штодзень павінны быць на стале ў кожнай сям'і. Гатаваць іх нескладана, і яны ўсім даступныя.

КАПУСТА БЕЛАКАЧАННАЯ. Здаўна людзі цанілі яе не толькі як прадукт харчавання, але і як лекавы сродак. Народныя лекары раяць ужываць капусту для паляпшэння апетыту, нармалізацыі сакрэцыі страўніка, дзейнасці кішэчніка. Сок свежай капусты аказвае процізапаленчае дзеянне, квашаная — проціцынготнае. Гэта расліна спрыяльна ўздзейнічае на нервовую сістэму, абмен рэчываў, незаменная пры лячэнні язвавых пашкоджанняў страўнікава-кішачнага тракта. Вядомыя ўласцівасці капуснага лісця — яно загойвае апёкі, здымае галаўныя боль, вылечвае запаленні скуры.

КАПУСТА З ЗЯЛЕНІВАМ

Нашаткаваць капусту, дадаць крыху здробненага сельдэрэю, пятрушкі ці кропу, кмен. Заправа: 1 ст. лыжка алею, дробна нарэзаная зялёная цыбуля, 3 ст. лыжкі любога кіслага соку або надзёртага кіслага яблыка, мёд на смак.

САЛАТА З КАПУСТЫ І БАНАНАЎ

500 г капусты, 2 бананы, 1 яблык, 2 памідоры, 1 агурок, 4 ст. лыжкі аліўкавага алею, соль на смак.

Капусту і агурок нашаткуйце саломкай. Бананы, памідоры і яблык нарэжце кубікамі. Капусту пасаліце і пратрыце. Усё змяшайце, запраўце алеем.

МОРКВА. Уздзеянне яе на арганізм — універсальнае: агульнаўмацавальнае, мачагоннае, антысептычнае, процізапаленчае, кроваспыняльнае і г.д. Морква карысная пры хваробах сардэчна-сасудзістай сістэмы, нырак, расстройствах стрававальнага тракта, малакроўі, агульным знясіленні, парушэннях зроку. Сырую моркву ўжываюць як процігліставы сродак.

САЛАТА З ВАРАНАЙ МОРКВЫ І ЗЯЛЁНАГА ГАРОШКУ

4 морквіны, 1 галоўка рэпчатай цыбулі, 150 г зялёнага гарошку, 1/2 шк. воцату, 150 г маянэзу, цукар, соль.

Моркву нарэзаць саломкай, заліць шклянкай кіпеню з воцатам, цукрам, соллю і варыць да гатоўнасці. Зліць вадкасць, астудзіць моркву і перамяшаць з зялёным гарошкам, сечанай цыбуляй. Заправіць маянэзам. Можна дадаць 2—3 долькі расцёртага з соллю часнаку.

МОРКВА ПА-ЗІМОВАМУ

Надзерці моркву і крыху радыскі, дадаць на смак квашанай капусты. Заправа: алей і журавінавы сок у роўных частках, крыху здробненых арэхаў.

Сельдэрэй быў вядомы яшчэ ў Старажытным Егіпце і Старажытным Рыме. Гэта лекавая расліна мае здольнасць павышаць агульны тонус арганізма, узмацняць фізічную і разумовую актыўнасць, спыняць млоснасць, нармалізоўваць страваванне, дапамагае пры многіх скурных хваробах. Найбольш эфектыўны свежы сок, прыгатаваны з каранёў і зялёнай масы расліны. Эфірнае масла сельдэрэю дабратворна ўздзейнічае пры лячэнні атлусцення, паскарае абменныя працэсы пры адкладанні соляў, умацоўвае сон.

САЛАТА З СЕЛЬДЭРЭЮ

Пасечаны сельдэрэй заправіць: 2 ст. лыжкамі алею і такой жа колькасцю соку з агародніны або кіслых ягад альбо змяшаць паўшклянкі ўзбітага кефіру, 2 ст. лыжкі смятаны і нарэзаннае кубікамі варанае яйка.

СЕЛЬДЭРЭЙ З МОРКВАЙ І САЛАТАЙ

Змяшаць надзёртую моркву, пасечаны сельдэрэй (вельмі грубыя сцёблы не выкарыстоўваць) і нарэзанае лісце салаты. Заправа: 4—5 здробненых грэцкіх арэхаў і 1 ст. лыжка мёду альбо 1 ст. лыжка алею і столькі ж кіслага соку.



ЦЫБУЛЯ. Свежая, смажаная, вараная, печаная, кашка цыбулі, яе сок, пара, якая змяшчае фітанцыды, настоі, адвары, экстракты — гаючая сіла гэтых сродкаў праверана шматвяковым вопытам. Цыбулю прымяняюць пры лячэнні многіх хваробаў органаў дыхання, страўніка-кішачнага тракта, скуры, інфекцыйных захворванняў, авітамінозу і інш. Яна паляпшае апетыт, узмацняе выдзяленне стрававальных сокаў, аказвае мачагоннае, лёгкае слабіцельнае дзеянне.

СУП З ЦЫБУЛІ-ПАРЭЮ І АГАРОДНІНЫ

Нарэзаць 4—5 цыбулін, па 3—4 караняплоды морквы, сельдэрэю, пятрушкі і тушыць з 3 ст. лыжкамі сметанковага масла. Калі агародніна стане мяккай, заліць яе вадой, дадаць 3—4 бульбіны, нарэзаныя кубікамі. Соль, перац, зяленіва на смак. Падаваць на стол з грэнкамі, сухарамі.

САЛАТА З КВАШАНАЙ КАПУСТЫ І ЦЫБУЛІ-ПАРЭЮ

200 г квашанай капусты, 200 г цыбулі-парэю, 1/2 шклянкі смятаны, 1 ст. лыжка зярнятак кропу або кмену.

Квашаную капусту адкінуць на друшляк і даць сцячы расолу. Цыбулю-парэй ачысціць, добра памыць, нарэзаць вельмі мелкімі пёркамі разам з зялёным лісцем. Перамяшаць капусту з нарэзанай цыбуляй-парэем, кропам або кменам, запраўціць смятанай, соль і перац на смак.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Для адных выхад на пенсію — магчымасць праводзіць больш часу з роднымі, для другіх — доўгачаканы адпачынак і наяўнасць часу, каб заняцца, нарэшце, сваім здароўем, для трэціх — умова для здзяйснення мараў, а для некаторых — усё і адразу!..

— У нас любы пенсіянер знойдзе чым заняцца, — гаворыць Яўген МАСІНОВІЧ, начальнік творчага аддзела Палаца ветэранаў у Мінску. — Усяго ў нас 61 падраздзяленне розных напрамкаў — спартыўных і творчых. Вялікай папулярнасцю сярод мужчын карыстаецца клуб шахмат «Гамбіт». У ім дзядулі гуляюць у шахматы з раніцы да вечара. Часта не могуць спыніцца і партыі доўгацца да дзевяці. Жанчыны вельмі любяць наведваць секцыі ўсходняга танца і кітайскай гімнастыкі. Не так даўно ў нас 86-гадовая жанчына з'ездзіла ў Егіпет на турнір усходняга танца. Яна прывезла прыз глядацкіх сімпатый! Аднолькава цікавыя і для жанчын, і для мужчын тэатральны клуб і клуб паэзіі. Людзі прыводзяць таксама сваіх унукаў у розныя секцыі. Не толькі таму, што гэта дазваляе аблізіцца родным, зручна, але і нядорага: у нас добрая сістэма скідак.

Я паглядзела на тарыфы і ўпэўнілася, што Яўген Яўгенавіч кажа праўду: адзін занятак кітайскай гімнастыкі каштуе тысячу рублёў, усходніх танцаў — пяць тысяч, а ў клуб шахмат можна прыходзіць ўвогуле бясплатна.

— На кітайскую гімнастыку хадзіла мая матуля, — гаворыць Анжэла Маркіна, 68-гадовая пенсіянерка. — Зараз ёй 93 гады, і яна прапанавала мне пахадзіць. Я думала, што гэта для мяне занадта проста. Але калі паспрабавала, то не змагла зрабіць тыя рухі, што рабіла мая матуля. Мяне гэта вельмі «зачапіла». Я запісалася ў секцыю і не шкадую. Займаюся шэсць гадоў! Памятаю, як на першых занятках у нас, пенсіянераў, косці «трашчалі».

Многія не маглі на адной назе крыху пастаяць, не гаворачы пра тое, што пры гэтым патрэбна было зрабіць плаўныя рухі рукамі. Шкада, што майму ўнуку не падабалася гэтая гімнастыка, кажа: вельмі размераныя заняткі. Але нашы практыкаванні патрабуюць якасці, а не хуткасці.

Дынамікі ў жыцці Анжэлы Іосіфаўны хапае. Зімой яна любіць катацца на лыжах, а летам, восенню і вясной — на веласіпедзе выгульвае свайго любімага сабаку.

— Спорт паляпшае фізічнае самаадчуванне пажылых людзей, — лічыць Яўген КАРНЯКОЎ, кіраўнік секцыі кітайскай гімнастыкі. — Гімнастыка дапамагае палепшыць работу крывяноснай сістэмы, сэрца, выроўнівае пазваночнік. Акрамя таго, людзі вучацца канцэнтраваць свой ціск, а гэта для іх вельмі істотна. Кітайская гімнастыка Тай Цзі Цю Ань — гэта пэўная філасофія, задача якой — палепшыць сябе не толькі фізічна, але і ўнутрана.

У выніку ўзнімаецца настрой і жыццё напаўняецца яскравымі фарбамі.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ПЕНСІЯ ЯК НАГОДА ДЛЯ АКТЫЎНАСЦІ

«Каму бусел дзяцей носіць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Над усімі апякуецца маці, а бацька, маўклівы і спагадлівы, у розных справах падстаўляе сваё плячо, каб жонцы было лягчэй. У сям'і сваіх пяцёра дзяцей і трое прыёмных. Па характары Васіль Стэфанавіч больш спакойны, таму, пэўна, у хаце мір, згода і парадак ва ўсім. Вера Уладзіміраўна — не толькі пчолка па працаздольнасці, але і шчабятуха-пташка, гаваркая, усім гатова прыйсці на дапамогу, узяць пад свае крылы. Энергічная і аптымістычная, яна ўмее радавацца жыццю і літаральна выпраменьвае сваю душэўную энергію на іншых. Таму не дзіўна, што менавіта такая жанчына стала старшынёй грамадскага аб'яднання «Шматдзетная сям'я Капыльскага раёна». У яго зараз уваходзіць 26 сем'яў, у якіх выхоўваецца 108 дзяцей. Усяго ў раёне такіх сем'яў больш за 30.

У 1997 годзе Вера Уладзіміраўна атрымала ордэн Маці. З удзячнасцю ўспамінае, як урачыста ганаравалі яе ў сельскім Савеце, як пасля гэтага людзі сталі больш разумець і паважаць іх з мужам як людзей, што маюць шмат дзяцей. Даўно збіралася прытуліць тых дзетак, што засталіся без апекі бацькоў, бо такіх зараз шмат. Сэрца жанчыны заўсёды сціскалася ад болю, гледзячы на іх — шкадавала. Першая дзяўчынка сама папрасілася ў іх сям'ю. Гэта было шэсць гадоў таму. Васьмігадовая Оля адпачывала ў летніку каля Семежава, а сям'я Касніцкіх капала бульбу. Няшчаснае дзіця пацягнулася ў гэты дружны сямейны рай інстынктыўна. Дапамагчы ёй пазбавіцца ад страшных успамінаў пра сваё мінулае было цяжка. Яе бацька забіў маці, брат-нарканман пасадсыцку біў трохгадовае дзіця. І яна прывыкла абараняцца кулакамі. Не ўмела плакаць, пакутавала шмат ад якіх хваробаў, была на ўліку ў псіхіятра. Лячылі, сагравалі цяплом душы, вучылі дабру і працавітасці. І хоць выхоўваць гэтае дзіця складана, Касніцкія спадзяюцца, што паставяць на добры шлях гэтага чалавечка, якому лёс прынёс столькі пакутаў. Разам з Машай Олечка зараз захапляецца саломапляценнем — павучкі, птушачкі, саламяныя кветкі ўпрыгожваюць іх пакой і ўсю хату, яны робяць саламяныя падарункі сваёй работы і радуюцца выніку сваёй карпатлівай творчай працы. Увогуле кожны ў сям'і мае свае цікавыя заняткі і шмат робіць сваімі рукамі.

Праз год пасля Олі ўзялі 11-гадовую Кацю з дзіцячага дома ў Слуцку. Калі ёй было шэсць месяцаў, бацька забіў яе маці. Трагедыя адбылася ў Лагойскім раёне. Гадавалі, песцілі, як сваю. Дзякуй Богу, добрая дзяўчынка выраслa, ужо пяць гадоў у сям'і. Каця, як і 17-гадовы сын Касніцкіх Вася, вяжа на прутках, кручком шалікі і шапачкі, сурвэткі і іншыя рэчы. Яшчэ з дзіцячага дома пачала ездзіць летам на аздараўленне ў Італію, ведае зараз італьянскую лепш за беларускую. Разам з Васем яны вучацца ў 11-ым класе. Вася выдатнік, а ўвогуле першы памочнік мамы. Можа таму не грэбуе жаночымі заняткамі, бо ведае: сястрычкам ручная праца неабходная для іх разумовага развіцця, псіхічнага здароўя і спакою. Ён за камп'ютарам не бавіць час гульнямі, як яго аднагодкі, а робіць шмат карыснага — напрыклад, шукае ў Інтэрнэце спонсараў для шматдзетных сем'яў раёна. І знаходзіць. Нават так атрымалася, што знайшоў, што ў Расіі ёсць дабрачынная арганізацыя «Бацькоўскі дом». Адрас выкарыстала маці, напісаўшы ліст дзяржскаратару Саюзнай дзяржавы Паўлу Барадзіну з просьбай дапамагчы шматдзетным сем'ям раёна. Так атрымалася, што ў першую чаргу дапамаглі яе сям'і як самай вялікай: выслалі тэлевізар і DVD, пыласос, мікрахвалевую печ. Гэтыя рэчы вельмі ўзрадавалі сям'ю, палепшылі яе дабрабыт. У камп'ютары Васі захоўваецца ўвесь фотаархіў сям'і, летапіс яе жыцця. А ўвогуле шмат якія арганізацыі дапамагаюць.

Марта родам з Цімкавічаў Капыльскага раёна. Узяла яе ў 6 гадоў з размеркавальніка ў Капылі. Ці жывая маці — не ведаюць. Як і бацькі Олі і Каці, яна сядзела ў турме. Вера Уладзіміраўна знайшла яе, дапамагла выйсці раней за тэрмін, спадзеючыся, што Ала адумалася і будзе гадаваць сваё дзіця. Але тая не з'явілася, праз некаторы час зноў трапіла ў турму, а потым, кажуць, яе забілі... На зімовых канікулах Марта адпачывала ў Італіі ў сям'і, дзе дзве незамужнія дарослыя дачкі. Гаворыць, што вельмі сумавала, бо прывыкла быць сярод дзяцей. А ўвогуле і яна, і яе прыёмныя бацькі вельмі ўдзячныя італьянцам за дапамогу.

Вера Уладзіміраўна гаворыць, што дзяўчынкі ёй бліжэй, таму ўзяла менавіта дзяўчатак і хацела б узяць яшчэ. Паводле яе прыкладу многія сем'і ў раёне сталі браць дзяцей у сям'ю. У Семежаве Наталля Сяргееўна Максімчык, якая мела сваіх пяцёра дзяцей, узяла на выхаванне яшчэ шасцярых. Зараз пераехала ў Капыль, дзе для яе сям'і спецыяльна пабудавалі дом. Наталля Іванаўна Сафронава, акрамя сваіх дваіх, выхоўвае сына сястры, якая загінула.

У 10-ым класе, разважаючы пра будучае самастойнае жыццё, Вера пісала ў сваім сачыненні, што хацела б мець дзевяць дзяцей. Чаму менавіта дзевяць? Не памятае, але так напісала. У дзяцінстве любіла ў лялькі гуляць. А якія былі тыя лялькі — з кукурузы, якую абгортвалі абрэзкамі, выпрашанымі ў суседкі-швачкі! Цацак куплёных не было, усе дзяўчаткі гулялі з такімі. Нарадзілася яна ў 1955 годзе — нялёгкія пасляваенныя гады. На Браншчыне, дзе жыла, ва ўсіх сем'ях гадавалася ад трох да дванаццаці дзяцей. Выраставалі, набывалі адукацыю, уладкоўваліся ў жыцці годна. Зараз, калі бывае там на Радаўніцу, бачыць: многія сталі камерсантамі, прыязджаюць да бацькоў на сваіх машынах, большасць жыве ў дастатку. Так што ніколі не баялася, заўсёды хацела мець вялікую сям'ю і не шкадуе ні аб чым. Дзяцей яна любіць і ўмее іх выхоўваць. У іх сям'і было трое дзяцей. А ў сям'і Васіля Стэфанавіча — васьмёра. Працуе ён шафёрам. Сама Вера Уладзіміраўна мае дзве спецыяльнасці — заатэхніка і тэхнолага па кансерваванні. Працавала ў нарсудзе сакратаром, загадчыцай птушкафермы, даяркай, дырэктарам клуба, бібліятэкарам, мастацкім кіраўніком, дырэктарам КБА, сумяшчаючы часам па 2—3 пасады, бо трэба было зарабіць грошы на вялікую сям'ю. І на любой рабоце ладзіла з людзьмі, паспявала выхоўваць сваіх дзяцей, трымала гаспадарку дома, усё паспявала. І зараз трымае карову, свіней, курэй, засявае з сям'ёй 60 сотак зямлі. Ніколі не скардзілася, што ёй цяжка, бо дзеці — вялікае шчасце, якое ім з мужам даў Бог.

Можа, любоў да дзяцей і ўменне іх выхоўваць у яе ад бацькоў, якія былі педагогамі: бацька працаваў дырэктарам школы, маці настаўніцай. Яны хацелі, каб іх дачка атрымала адукацыю і таксама стала педагогам. Але яна ў 20 гадоў закахалася, хацела выйсці замуж, за што бацькі адправілі яе ў Мурманскую вобласць да цёткі, далей ад хлопца, які звозіў дзяўчыну з правільнага, абранага імі шляху. Але хлопец аказаўся ўпарты: зарабіў грошы на будоўлі і прыехаў да сваёй каханай. Пажаніліся і жывуць ужо 32 гады разам. У Мурманскай вобласці ў іх нарадзілася двое дзяцей — Жэня і Аксана. Жэня скончыў Горацкую акадэмію і працуе ў Баранавічах лесніком. Аксана эканаміст, жыве ў Ждановічах.

На Браншчыне, куды пераехалі з Мурманскай вобласці да бацькоў, нарадзіўся Вова. Чарнобыльская бяда выгн

ТВАЕ ПРАВЫ
Інфармацыя. Парады. Дапамога.
№ 3 (7)

ПАЛОВА СТАЎКІ? ДАПАМОГА ЗАСТАЕЦЦА

ДЗІЦЯЧЫЯ «БОНУСЫ»: ШТО І КАМУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Калі пачынаецца гаворка аб сем'ях з дзецьмі, то першае, што прыходзіць на памяць — дзяржаўныя дапамогі. Зрэшты, варта адразу заўважыць: гэты від падтрымкі з'яўляецца далёка не адзіным, апроч яго, ёсць шэраг іншых і часам не менш важкіх гарантый. У прыватнасці, якія перавагі для сем'яў з дзецьмі прадугледжвае наша працоўнае і падатковае заканадаўства, хто можа скарыстацца правам на адрасную сацыяльную дапамогу ці бясплатным харчаваннем на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, у рэшце рэшт, каму і ў якіх выпадках вызначаны льготы па санаторна-курортным лячэнні і жыллі? Разабрацца з усім гэтым мы паспрабуем з дапамогай намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Васільеўны ШЭМЕТАВЕЦ.

Камандзіроўка «падыдзе» не ўсім

Наша заканадаўства забараняе адмову ў заключэнні працоўнага дагавора ці зніжэнне зарплаты з прычыны цяжарнасці, наяўнасці ў жанчыны дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў ці наяўнасці дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў у адзінокай маці. Прычым калі грамадзян гэтай катэгорыі наймальнік прымаць на работу не хоча, ён абавязаны патлумачыць сваё рашэнне ў пісьмовай форме. А ў сваю чаргу з падобным тлумачэннем можна звяртацца ў суд.

Не менш адметны момант — звальненне. Скасаванне працоўнага дагавора зноў-такі немагчыма з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў і з адзінокімі маці, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў. І выключэнняў у гэтым правіле можа быць усяго некалькі — ліквідацыя арганізацыі, спыненне дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, а таксама парушэнне працоўнай дысцыпліны і іншыя «віноватыя» дзеянні саміх работніц.

Трэба таксама мець на ўвазе, што ў нас забараняецца выкарыстанне жаночай працы на цяжкіх работах, работах са шкоднымі і небяспечнымі ўмовамі, а таксама на падземных работах — за выключэннем некаторых падземных «нефізічных» работ ці работ, звязаных з санітарным і бытавым абслугоўваннем. І плюс да таго, існуюць абмежаванні па пад'ёме і перасоўванні жанчынамі цяжкасцяў.

— На жаль, калі-нікалі даводзіцца сутыкацца з выпадкамі прыцягнення да звышурочных, работы ў дзяржаўныя святы ці па выхадных, накіравання ў службовую камандзіроўку цяжарных жанчын і жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў — раблю гэта адназначна нельга, — кажа Таццяна Шэметавец. — Тут жа неабходна заўважыць, што цяжарныя жанчыны, нягледзячы на графікі змен, ні ў якім разе не павінны працаваць ноччу. А жанчыны з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў могуць прыцягвацца да работ у начны час (з 22 гадзін вечара да 6 гадзін раніцы) толькі з уласнай пісьмовай згоды. Гэтакама пісьмовая згода патрэбна і для прыцягнення да звышурочных, камандзіровак, начных работ, работ на выхадных і святах жанчын, што маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў.

Цяжарным жанчынам, паводле медыцынскіх паказанняў, павінны зніжацца нормы выпрацоўкі і нормы абслугоўвання, або такія жанчыны павінны пераводзіцца на іншую, больш лёгкую і няшкодную работу з захаваннем свайго сярэдняга заробку па ранейшым месцы. Прычым пакуль вырашаецца пытанне аб пераводзе, цяжарная жанчына ўвогуле вызваляецца ад работы зноў-такі з захаваннем заробку за дні «пропуску» за кошт наймальніка.

Адначасова, падкрэслівае Таццяна Шэметавец, па просьбе работніцы наймальнік абавязаны вызначыць няпоўны працоўны дзень ці тыдзень цяжарнай жанчыне або жанчыне з дзіцем ва ўзросце да 14 гадоў.

Водпуск з магчымасцю выбару

Нагода для больш падрабязнай гаворкі — водпускі. Як заўважае Таццяна Шэметавец, водпуск па цяжарнасці і родах з выплатай дапамогі па дзяржаўным сацыяльным страхаванні прадастаўляецца працягласцю 70 дзён да і 56 дзён пасля нараджэння дзіцяці, прычым у выпадку ўскладненых родаў або нараджэння двух і больш дзяцей апошні тэрмін можа павялічвацца да 70 дзён. Крыху іншыя правілы дзейнічаюць у дачыненні да жанчын, якія пражываюць у зоне радыеактыўнага забруджвання. Тут дзейнічае формула «90 плюс 56», пры гэтым зноў-такі ў выпадку ўскладненых родаў або нараджэння двух ці больш дзяцей «паслярадавая» працягласць узрастае да тых жа 70 дзён.

— Пры жаданні працуючай жанчыны незалежна ад стажу найменш абавязаны прадставіць пасля перапынку ў рабоце ў сувязі з нараджэннем водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў з выплатай дзяржаўнай дапамогі, — адзначае Таццяна Шэметавец. — Такі водпуск прадастаўляецца на падставе пісьмовай заявы маці і можа быць выкарыстаны цалкам або па частках любой працягласці. Дарэчы, водпускам па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў з захаваннем права на атрыманне дзяржаўнай дапамогі можа карыстацца замест маці працуючы бацька ці іншы працуючы сваяк дзіцяці (за выключэннем працуючых пенсіянераў), якія фактычна здзяйсняюць догляд, і ў тым ліку — апякун. Пры гэтым асобы, што выходзяць у такі водпуск, маюць права працаваць па асноўным ці неасноўным месцы адначасова з атрыманнем дапамогі на догляд на ўмовах няпоўнага працоўнага часу, інакш кажучы, не больш чым на палову стаўкі.

Звышурочныя, работа па выхадных, у святы, камандзіроўкі — не для цяжарных жанчын і жанчын з дзецьмі да 3 гадоў.

Водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў уключаецца ў агульны стаж і стаж работы па спецыяльнасці. Разам з тым нялішне заўважыць: ні ў ільготны стаж, ні ў стаж для вызначэння права на наступныя працоўныя водпускі час догляду дзіцяці не залічваецца.

І, нарэшце, пра водпускі прадаткі. Паводле заканадаўства, найменшія абавязаны прадаставіць іх у летні ці іншы зручны час жанчынам, якія маюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў. Да таго ж цяжарныя жанчыны могуць «узяць» працоўны водпуск перад або пасля водпуску па цяжарнасці і родах яшчэ да заканчэння 6 месяцаў работы ў найменшыка. Работнікі, жонкі якіх знаходзяцца ў водпуску па цяжарнасці і родах, могуць скарыстацца правам на працоўны адпачынак у час гэтага водпуску жонкі, а працуючыя жонкі ці мужы ваеннаслужачых — скарыстацца правам на працоўны адпачынак паралельна з мужамі ці жонкамі.

— У заканадаўстве таксама вызначана норма, паводле якой пры жаданні работніка наймальнік абавязаны прадаставіць водпуск працягласцю да 14 каляндарных дзён без захавання зарплаты жанчынам, якія маюць двух і больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, — працягвае Таццяна Шэметавец. — Плюс да таго маці або бацьку, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, на падставе іх заяў штомесяц можа прадастаўляцца адзін свабодны ад работы дзень з аплатай і на ўмовах, прадугледжаных калектыўным дагаворам.

Маленькі ўзрост — «нялішняя» паўза

Адна з распаўсюджаных сітуацый — выхад на работу жанчын да заканчэння «дэкрэтнага» водпуску. На гэты выпадак працоўнае заканадаўства вызначае свае «правілы гульні».

Так, зазначае Таццяна Шэметавец, жанчыне з дзіцем ва ўзросце да 1,5 года найменшік абавязаны прадугледзець дадатковы перапынак на кармленне з аплатай «па сярэднім заробку». Такія перапынкі прадастаўляюцца не пазней чым праз кожныя тры гадзіны. Пры наяўнасці аднаго дзіцяці іх працягласць не можа быць меншай за 30 хвілін, а пры наяўнасці дваіх і больш дзяцей — менш за гадзіну. Прычым пры жаданні самой жанчыны перапынкі могуць «перанесены» на пачатак ці на канец рабочага дня з адпаведным яго скарачэннем.

Цяжарных на кантракт не пераводзяць

Заўсёды актуальным пытаннем былі і застаюцца кантракты. Між тым, заўважае Таццяна Шэметавец, тут таксама варта памятаць некалькі цікавых акалічнасцяў. Да прыкладу, мець на ўвазе: з працуючымі на ўмовах бестэрміновага дагавора цяжарнымі жанчынамі і жанчынамі з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў кантракты могуць заключацца толькі ў выпадку іх асабістай згоды.

Нельга яшчэ не ўзгадаць: сем'і, якія зноў-такі маюць даход менш за 100 працэнтаў бюджэту пражыткovага мінімуму, могуць атрымліваць бясплатнае харчаванне на дзяцей да 2 гадоў. Дарэчы, для атрымання як бясплатнага харчавання, так і адраснай сацыяльнай дапамогі неабходна звяртацца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Галоўнае — парады медыкаў

Наступны момант — санаторна-курортнае лячэнне. Як зазначае Таццяна Шэметавец, паводле заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці проціпаказанняў непаўналетнія дзеці маюць права на бясплатную пуцёўку. Пры гэтым бацькі ці апекуны-суправаджальнікі могуць наведаць санаторый тыпу «маці і дзіця» на ўмовах 15-працэнтнай аплаты.

Калі трэба шукаць працу

Страта працы — гэта заўсёды балюча. Аднак пэўныя гарантыі сем'ям вызначаны і ў дадзеным выпадку. Скажам, грамадзянам, якія зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных і маюць на ўтрыманні дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, памер дапамогі павялічваецца на 10 працэнтаў. А грамадзянам, якія накіраваныя службамі занятасці на прафесійную падрыхтоўку ці перападрыхтоўку, пры наяўнасці дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў ступендыі павінны складаць 75 працэнтаў ад сярэдняга заробку па апошнім месцы працы. Аднак пры гэтым стыпендыі такіх асобаў не могуць быць меншымі за паўтары мінімальныя дапамогі па беспрацоўі і большымі за 3-разовую базавую велічыню.

Спісанне. Але не для «льготнікаў»

І ўсё ж ці не самай вострай праблемай для значнай часткі сем'яў застаецца жыллё. Таму застаецца ўзгадаць: маладыя сем'і, маладыя адзінокія маці ці бацькі, у якіх «падышла» чарга, маюць права на аднаразовае выкарыстанне льготнага крэдыту і бязвыплатных субсідый на будаўніцтва ці куплю жылля.

А маладыя і шматдзетныя сем'і, якія знаходзіліся ў чарзе і вырашылі пабудаваць ці купіць жыллё пры дапамозе няльготных крэдытаў, могуць разлічваць на іх частковае спісанне. Так, пры нараджэнні або наяўнасці аднаго непаўнагадовага дзіцяці памер такога спісання складае 20, пры нараджэнні або наяўнасці дваіх непаўнагадовых дзяцей — 40, а пры нараджэнні або наяўнасці траіх і больш непаўнагадовых дзяцей — 50 бюджэтаў пражыткovага мінімуму. Аднак заўважылі: магчымасць пагашэння камерцыйных крэдытаў датычыцца толькі маладых і шматдзетных сем'яў, якія не бралі льготных жыллёвых крэдытаў.

Сяргей ГРЫБ.

Пытальнік

«Аднаўленне налічэння жыллёвых квот дзеючым заканадаўствам не прадугледжана»

Прашу разгледзець маю заяву аб аднаўленні жыллёвай квоты і выдачы чэкаў «Жыллё» мне, мужу, а таксама па спадчыне ад майго бацькі. У атрыманні чэкаў нам было адмоўлена ў 2003 годзе — падчас прыватызацыі нашай колішняй кватэры. Таму для прыватызацыі чэкі «Жыллё» мы ўзялі ў доўг і вярнуць яго не можам дагэтуль. Неаднаразова звярталіся ў многія інстанцыі, але безвынікова. Многія вусна спасылаюцца на нейкі закон, па якім мы пазбаўлены чэкаў «Жыллё». Пра існаванне такіх законаў нам нічога не было вядома. І чаму жыллёвая квота на мяне і мужа не налічвалася? Нам своечасова пра гэта не паведамілі. Пасля смерці бацькі я своечасова аб'явіла пра спадчыну. У пасведчанні аб памеры квоты на імя бацькі ўказаны і чэкі «Жыллё». Аднак іх выдаць адмаўляюцца, маўляў, гэта пасведчанне аб памеры квоты імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць». Але ж там указаны і чэкі «Жыллё».

Ганна Паўлаўна КАЗЛОВА, *г. Мінск.*

Падрабязны адказ на пытанні чытачкі мы атрымалі з Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

«Паведамляем, што, у адпаведнасці з арт. 38 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь», налічэнне чэкаў «Жыллё» грамадзянам праводзілася з 1 ліпеня 1992 года па 1 ліпеня 1999 года. Адпаведна, грамадзяне мелі магчымасць на працягу сямі гадоў налічыць жыллёвыя квоты (чэкі «Жыллё»). Аб маючым адбыцца ўвядзенні вышэйуказанай нормы было аб'яўлена ў сродках масавай інфармацыі больш чым за год. На падставе вышэйуказанага артыкула Закона налічэнне жыллёвых квот (чэкаў «Жыллё») у Рэспубліцы Беларусь спынена.

Парадак налічэння жыллёвых квотаў (чэкаў «Жыллё») быў устаноўлены Палажэннем аб прыватызацыі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду, іх абслугоўванні і рамонце, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.06.1992 г. № 398, згодна з якім чэкі «Жыллё» налічваліся грамадзянам па іх асабістых заявах з прыкладаннем даведак аб стажы працы, і выдаваліся адпаведнымі ўстановамі ААТ «ААБ Беларусбанк» пры прад'яўленні пашпарта. Адмова ў налічэнні жыллёвай квоты ў перыяд яе налічэння магла быць абскаржана ў судовым парадку. Аднаўленне налічэння жыллёвых квот (чэкаў «Жыллё») дзеючым заканадаўствам не прадугледжана.

Што датычыцца пытання атрымання чэкаў «Жыллё» па спадчыне ад вашага бацькі, дык, як бачна з матэрыялаў, прыкладзеных да звароту, ваш бацька ўключыў налічаныя яму чэкі «Жыллё» ў склад чэкаў «Маёмасць», што было дазволена дзеючым у перыяд налічэння чэкаў «Маёмасць» заканадаўствам і, адпаведна, перадаваў у спадчыну не чэкі «Жыллё», а чэкі «Маёмасць». Дзеючыя сёння нарматыўныя прававыя акты не прадугледжваюць магчымасці вываду чэкаў «Жыллё» са складу чэкаў «Маёмасць».

ТЭСТ НА ПРАФПРЫГОДНАСЦЬ

Ёсць работа, ёсць кантракт. Здавалася б, больш ніякіх пытанняў тут узнікнуць ужо не павінна. Але не зусім. Так, варта толькі нагадаць: кіраўніцтва арганізацыі можа наладзіць праверку кваліфікацыі сваіх спецыялістаў, інакш кажучы, правесці атэстацыю. Між тым, з якой перыядычнасцю адбываецца гэта працэдура, якімі могуць быць яе вынікі і каго не датычыцца своеасаблівы «экзамен»? Каб адказаць на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» вырашыў сустрэцца з галоўным дзяржаўным інспектарам працы Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Віталем Юр'евічам БЕЙЛІНЫМ.

Увогуле галоўнай мэтай атэстацыі з'яўляецца вызначэнне адпаведнасці ўзроўню кваліфікацыі і ведаў работніка яго службовай пасадзе. Пры гэтым «праверка» можа датычыцца толькі кіраўнікоў і спецыялістаў прадпрыемстваў, арганізацый ці ўстаноў. Адпаведна, атэстацыя не праводзіцца сярод рабочых.

Апроч таго, варта адразу ж падкрэсліць: заканадаўства забараняе «тэсціраванне» цяжарных жанчын і жанчын, якія працуюць менш чым год пасля выхаду з «дэкрэтнага» водпуску, асобаў, якія адпрацавалі па цяперашніх пасадах ці прафесіях менш за год, а таксама выпускнікоў установ адукацыі на працягу зноў-такі першага года работы пасля заканчэння навучання.

— Для праверкі ствараецца атэстацыйная камісія, склад якой зацвярджаецца загадам наймальніка, — кажа Віталь Бейтлін . — У прыватнасці, у камісію ўваходзяць кіруючыя работнікі наймальніка і яго структурных падраздзяленняў, высокакваліфікаваныя спецыялісты, прадстаўнікі работнікаў ці прадстаўнікі прафсаюза. Прычым у выпадку неабходнасці атэстацыйных камісій можа быць некалькі — у залежнасці ад напрамкаў дзейнасці тых або іншых работнікаў.

Да слова заканадаўства не ўтрымлівае нормы, паводле якой у склад камісіі для атэстацыі могуць уваходзіць прадстаўнікі іншых найманікаў.

— Паводле тыпавога палажэння аб атэстацыі кіраўнікоў і спецыялістаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, што было зацверджана пастановай Міністэрства працы ад 31 кастрычніка 1996 года № 84, сама працэдура выглядае такім чынам, — распавядае Віталь Бейлін. — Спачатку выдаецца загад, затым складаецца спіс работнікаў, якія падлягаюць атэстацыі, зацвярджаюцца склады атэстацыйнай камісіі, графікі, рыхтуюцца характарыстыкі і бланкі атэстацыйных лістоў, адбываецца знаёмства работнікаў з уласнымі характарыстыкамі. Пры гэтым сам спіс пытанняў вызначаецца наймальнікам. І, дарэчы, гэтыя пытанні павінны датычацца толькі выканання тым ці іншым работнікам яго службовых абавязкаў, адносінаў да работы, прапаноў наконт яе паляпшэння. Аднак пытанні, якія датычацца прыватнага жыцця, тут узнікаць не павінны.

Па выніках работы камісіі складаюцца атэстацыйныя лісты, на падставе якіх на працягу месяца наймальнік падпісвае загад. Так, работнік можа быць павышаны ў пасадзе, заахвочаны, можа быць прынятае рашэнне, што работнік адпавядае сваёй пасадзе, не адпавядае пасадзе або адпавядае пасадзе пры ўмове паляпшэння працы і выкананні рэкамендацый з паўторнай атэстацыяй праз год.

— У сітуацыі, калі прымаецца рашэнне аб неадпаведнасці пасадзе, работнік можа быць звольнены на падставе пункта 3 артыкула 42 Працоўнага кодэкса яшчэ да канца тэрміну кантракта, — тлумачыць Віталь Бейлін. — Аднак трэба мець на ўвазе, што рашэнне атэстацыйнай камісіі мае толькі рэкамендацыйны характар і не з'яўляецца абавязковым для наймальніка.

Калі звальненне ўсё ж адбылося, работніку варта памятаць: на працягу месяца з моманту атрымання адпаведнага загаду гэта рашэнне можна аспрэчыць у судзе. І яшчэ. Нялішне таксама заўважыць, што па выніках атэстацыі нельга «пераводзіць» работніка на больш нізкую пасаду. Такі перавод магчымы толькі з асабістай згоды супрацоўніка.

Атэстацыя павінна праводзіцца не радзей чым раз у тры гады, прычым правесці яе можна нават нягледзячы на адсутнасць адпаведнага запісу ў кантрактах.

— У выпадку нез'яўлення работніка без уважлівых прычын атэстацыя будзе праводзіцца пры яго адсутнасці, — заўважае Віталь Бейлін. — А вось калі прычыны няяўкі акажуцца ўважлівымі, то атэстацыю проста перанясуць на іншы тэрмін.

Сяргей ГРЫБ.

ОАО «Белаттракцион»
проводит открытый аукцион

по продаже собственного имущества. Здания и сооружения с 1-го по 3-й лот, аттракционы с 4-го по 5-й лот, игровые автоматы с 6-го по 28-й лот (подробный перечень имущества указан на сайте www.belat.com). **Аукцион состоится 12 марта 2008 г. в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Могилевская, 68.** Заявление на участие принимается до 11 марта 2008 г. Тел./факс (8 017) 222 73 14.

УНН 100061627

17 марта 2008 г. в 8 часов 00 минут состоится внеочередное общее собрание акционеров ЗАО «Припутник» по адресу: г. Минск, пр. Рокоссовского, 1, конференц-зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчуждение Богдан Брониславой Вячеславовной принадлежащих ей акций Общества.

С документами Общества, относящимися к повестке дня можно ознакомиться в приемной директора ежедневно кроме выходных и праздничных дней с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.

Форма проведения собрания — очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня — прямая, открытая.

УНП 100071629

Уважаемые акционеры ОАО «Жабинковский сахарный завод»

12 марта 2008 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Жабинковский сахарный завод», расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина. Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об увеличении уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений в Устав Общества.
3. О согласовании благотворительной (спонсорской) помощи.
4. О согласии увеличения доли государства в уставном фонде ОАО «Жабинковский сахарный завод».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 3 марта 2008 г. по 11 марта 2008 г. по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 12 марта 2008 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.
Начало работы собрания — 12 марта 2008 года в 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 3 марта 2008 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 200037600

Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец) проводит открытый аукцион

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства: **Лот 1** — земельный участок в деревне Раков, площадь участка — 0,1461 га, начальная цена 14 610 000 белорусских рублей; **Лот 2** — земельный участок в д. Раков, площадь участка 0,1462 га, начальная цена 14 620 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости газ. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3604000000349 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037384, ОКПО 04432328 Раковский сельский исполнительный комитет. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 20 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 5 апреля 2008 года в 10.00 по адресу: д. Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 17.00 4 апреля 2008 года по адресу: д. Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Контактный телефон (8 01772) 52 2 36.

УНП 600037384

Извещение о созыве очередного собрания акционеров

ОАО «Испытания и сертификация бытовой и промышленной продукции «БЕЛЛИС», г. Минск, ул. Красная, 7.
Дата собрания: 28.03.2008.
Время собрания: 14.00.
Место проведения: ОАО «БЕЛЛИС», ул. Красная, 8.
Время регистрации: с 13.00 до 13.45 (при себе иметь паспорт).

Ознакомление акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: пятница, начиная с 21.03.2008 по адресу: ул. Красная, 8, с 14.00 до 16.00, комната № 1.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2008 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2007 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2007 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, а также выплате дивидендов за 2007 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли и расходов на потребление на 2008 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении изменений в Устав Общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Председатель Наблюдательного совета И.А. Зданчук.

УНП 100083399

Святлана ГУРЫНОВІЧ:

С первых вуснаў

«НАТАРЫЯТ — АДЗІН З ЭФЕКТЫЎНЫХ СРОДКАЎ ЗНІЖЭННЯ ПРАВАПАРУШЭННЯЎ У СФЕРЫ ЎЛАСНАСЦІ»

Фота Марыі БЕГУНКОВАЙ.

«Звязда» працягвае знаёміць чытачоў з дзейнасцю сучаснага беларускага натарыята. На пытанні журналіста газеты адказвае загадчыца Першай мінскай гарадской натарыяльнай канторы Святлана ГУРЫНОВІЧ.

— Святлана Фёдараўна, найперш, хто можа звяртацца па дапамогу да натарыуса?

— Юрыдычная дапамога па пытаннях ажыццяўлення натарыяльных дзеянняў аказваецца любым асобам — як грамадзянам Рэспублікі Беларусь, так і замежным грамадзянам, а таксама асобам без грамадзянства, любым установам і арганізацыям усіх формаў уласнасці, прычым незалежна ад месца іх рэгістрацыі.

— Як на практыцы адбываецца абарона правоў і законных інтарэсаў усіх, хто звяртаецца да паслуг натарыята?

— Дзяржаўны натарыус забяспечвае для ўсіх удзельнікаў натарыяльнай вытворчасці пры ажыццяўленні канкрэтнага дзеяння роўныя прававыя ўмовы, у тым ліку і тым, хто не звярнуўся да яго, але правы якіх закранаюцца ажыццяўленнем натарыяльнага дзеяння. Напрыклад, ні адзін натарыус не засведчыць дагавор адчужэння маёмасці, набытай падчас шлюбу, без атрымання згоды і мужа, і жонкі. Ці пры адчужэнні долі маёмасці, якая знаходзіцца ў агульнай долевай уласнасці, натарыус абавязкова павінен выканаць дадатковыя дзеянні, якія ажыццяўляюцца, каб юрыдычная неадукаванасць не магла быць выкарыстана ім у шкоду, не закранула іх інтарэсаў. Напрыклад, даволі часта састарэлыя адзінокія грамадзяне, якія валодаюць нерухомасцю, звяртаюцца па засведчанне дагавора дарэння гэтай самай нерухомасці і падчас размовы з кліентам, тлумачэння наступстваў такога кроку натарыус вызначае, што сапраўдная воля асобы адпавядае дагавору пажыццёвага ўтрымання, і ў выніку спецыяліст сведчыць менавіта такі дагавор.

Невыпадкова, што пры ажыццяўленні здзелак у простай пісьмовай форме, без натарыяльнага засведчання, ступень крымінальнасці, магчымасці падробак, парушэнняў грамадзянскіх правоў недапушчальна больш высокая. У выпадку ўстанаўлення фактаў парушэння закона натарыус адмаўляе ў ажыццяўленні натарыяльнага дзеяння. Калі ў спецыяліста ёсць сумненні ў сапраўднасці пададзеных дакументаў або ёсць неабходнасць у накіраванні іх на экспертызу, ці яму патрабуюцца дадатковыя звесткі, натарыус мае права адкласці ажыццяўленне натарыяльнага дзеяння. Тое ж адбываецца, калі нехта з зацікаўленых бакоў звярнуўся да натарыуса з просьбай не ажыццяўляць натарыяльнае дзеянне, бо ён мае намер звярнуцца ў суд па абарону сваіх правоў. Дарэчы, за апошні час колькасць такіх грамадзян істотна павялічылася. Просты прыклад з жыцця: ідзе купля-продаж гаража, натарыус па дакументах бачыць, што ён быў зарэгістраваны на правах уласнасці пасля скасавання шлюбу. Аднак з'яўляецца колішняя жонка (а па дакументах выявіць усе нюансы загадзя не заўсёды магчыма) і сцвярджае, што гараж быў толькі зарэгістраваны пасля скасавання шлюбу, а будаваўся сумеснымі сіламі раней, да гэтай працэдуры. І я, кажа колішняя жонка, буду звяртацца ў суд аб выдзяленні мне долі гэтай маёмасці. Пасля падачы грамадзянскай заявы аб прыпыненні натарыяльнага дзеяння яна на працягу 10 дзён павінна прад'явіць з суда паведамленне аб тым, што звярнулася туды з іскам аб выдзяленні ёй долі маёмасці. Калі такога паведамлення з суда не паступае, па заканчэнні 10-дзённага тэрміну, — а гэта заяўніцы загадзя падрабязна і кваліфікавана тлумачыцца, — спецыяліст абавязаны ажыццявіць натарыяльнае дзеянне.

— Святлана Фёдараўна, яшчэ адносна нядаўна шмат паведамлялася пра кватэрныя махінацыі «чорных» рыэлтараў...

— Адна з умоў законнасці — добраахвотнае волевыяўленне, якое і трэба ўстанавіць натарыусу найперш па дакументах. Так, раней былі выпадкі, калі, скажам, прадавец кватэры не мог ні прозвішчу назваць, ні сумы здзелкі. Але сёння той хвалі, якая была каласьці, ужо няма. І хоць часам бывае супраціўленне бакоў, скандалы, усе ўжо ведаюць, наколькі натарыят прынцыпова ставіцца да такіх пытанняў. Калі спецыяліст бачыць неадэкватнасць дзеянняў любога з кліентаў, натарыяльныя дзеянні спыняюцца.

Дзяржаўны натарыус абавязкова праверыць на адпаведнасць законам тыя дзеянні, што ад яго патрабуюцца, і тыя дакументы, якія яму падаюць. Прыклад: натарыусу для капіравання прад'явілі дагавор дарэння маёмасці ад імя непаўналетняга. А згодна з Грамадзянскім кодэксам такое дарэнне забаронена. Ажыццяўляючы любое натарыяльнае дзеянне, спецыяліст ацэньвае дакумент, супярэчыць ён заканадаўству ці не. Скажам, у сельскім Савеце была дапушчана памянёная вышэй памылка — адбылася здзелка ад імя непаўналетняга. У такой сітуацыі мы маем права — пры выяўленні — ставіць пытанне аб прызнанні яе несапраўднай.

— Якімі яшчэ прынцыпамі кіруюцца ў сваёй працы работнікі натарыяльных кантор?

— Прынцыпам непрадузятасці. Дзяржаўны натарыус не мае права ажыццяўляць натарыяльныя дзеянні, вынікі якіх з'яўляюцца для яго маёмасным або якім іншым асабістым інтарэсам. Такія дзеянні спецыяліст не мае права ажыццяўляць на сваё імя і ад свайго імя, на імя і ад імя сваіх родных або работнікаў дзяржаўнай натарыяльнай канторы. Далей, гэта прынцып незалежнасці.

Асобна скажу аб прынцыпе тайны натарыяльнага дзеяння. На сёння ёсць звароты грамадзян, калі яны хочуць даведацца аб усіх умовах здзелкі, ажыццёўленай іншымі асобамі. Напрыклад, колішнім мужам ці жонкай. Мэты? Яны розныя — ад простай зацікаўленасці да карыслівых разлікаў, асабліва калі гаворка напрамую звязана з падзелам, напрыклад, жылога памяшкання. Такія «цікаўныя» спасылаюцца на тое, што ўмовы здзелкі нейкім чынам датычацца іх правоў. Аднак Законам Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце» (артыкул 3) прадугледжана тайна ажыццяўлення натарыяльных дзеянняў, і такія грамадзяне атрымліваюць матываваную адмову ў выдачы памянёнай інфармацыі. Яна з'яўляецца службовай, за яе натарыусы нясуць адказнасць. Калі чалавек лічыць, што пры ажыццяўленні здзелкі закрануты яго правы, ён павінен звярнуцца ў суд. Толькі паводле запыту апошняга мы маем права высылаць любыя копіі.

— Дзякуй за інтэрв'ю!

Сяргей РАСОЛЬКА.

P.S. *Нагадаем, што па дамоўленасці з загадчыцай Першай гарадской натарыяльнай канторы г. Мінска Святланай Гурыновіч нашы чытачы могуць дасылаць свае пытанні, якія датычацца натарыяльнай дзейнасці, або пісьмова (220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда» з адзнакай «Натарыят»), або па тэлефоне рэдакцыі 287 17 41. Па выніках зваротаў на старонках газеты будуць дадзены канкрэтныя адказы.*

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 5 (39)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у тэрмін з 1 сакавіка 2008 года па 10 красавіка 2008 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» ў адпаведнасці з дадзенымі Правіламі.

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), зарэгістраваная рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 02.08.2001 № 1010 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 100155376, УНП 100155376, месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд Гульні фарміруецца за кошт чыстага прыбытку Арганізатара Гульні.

4. У склад Прызавога фонду Гульні ўваходзяць:
7 маек,
7 бейсболак,
7 гадзіннікаў настольных 446673 ЧНС-020390011(1) з лагатыпам «Звязда»,
печ ЗВЧ HORIZONT 17MW700-1378,
тэлевізар «Віцязь» 51ctv760-3, г. Віцебск,
халадзільнік MXM2819-90, РБ, ЗАО «АТЛАНТ».

УСЯГО Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 1 791 571 (Адзін мільён семсот дзевяноста адна тысяча пяцьсот семдзесят адзін) беларускі рубель.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ. ПАРАДАК АДБОРУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і апляцыў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2008 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпіскай кампаніі на другі квартал 2008 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца да двух разоў у тыдзень у перыяд з 1 па 29 сакавіка 2008 года ўключна ў газеце «Звязда».

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклеены на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або дасланыя пасля 31 сакавіка 2008 года па паштовым штэмпелі атрымання да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) з тэрмінам паўнамоцтваў з 1 сакавіка 2008 года па 10 красавіка 2008 года ў складзе пяці чалавек.

10. На пасяджэнні Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца падпісчыкі газеты або прадстаўнікі незалежных арганізацый.

11. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці з яе зарэгістраванага складу.

12. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

13. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

14. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 4 красавіка 2008 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

15. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

16. Спачатку разыгрываюцца асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска па 1 майцы, па 1 бейсболцы і па 1 настольным гадзінніку з лагатыпам газеты «Звязда».

17. Выйграўшым прыз лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча ўказана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышу кожнага асобнага прыза выцягне наўздагад са скрыні хто-небудзь з падпісчыкаў або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка ўказваецца выйграны прыз і распісваюцца члены камісіі.

18. Для розыгрышу пячаткі ЗВЧ, тэлевізара «Віцязь» і халадзільніка «Атлант» усе астатнія карткі ўдзельнікаў, па якіх не былі выйграны прызы, змяшчаюцца ў адну скрыню і старанна перамешваюцца.

Вызначэнне выйграўшых удзельнікаў адбываецца ў парадку, які ўстаноўлены пунктам 17 гэтых Правілаў.

19. Удзельнікам, якія выйгралі прыз, Арганізатар да 16 красавіка 2008 года дасылае паведамленне аб гэтым заказным пісьмом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

20. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне ўдзельнікам, які выйграў прыз, пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2008 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка ўдзельніка Гульні ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2008 года.

21. Выдача прызоў (акрамя печы ЗВЧ, тэлевізара і халадзільніка) ажыццяўляецца ў тэрмін да 20 чэрвеня 2008 года ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

22. Дастаўка і ўручэнне печы ЗВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляецца Арганізатарам Гульні ў тэрмін да 20 чэрвеня 2008 года ўключна з паведамленнем аб канкрэтнай даце дастаўкі праз публікацыі ў сродках масавай інфармацыі.

Іншыя прызы могуць быць дастаўлены грамадзянам, якія іх выйгралі, па ўзгодненні з Арганізатарам і пры ўмове іх пражывання ў мясцовасці, блізка размешчанай ад мясцовасці пражывання грамадзян, якія выйгралі печ ЗВЧ, тэлевізар або халадзільнік.

23. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

24. Пасля 20 чэрвеня 2008 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

25. Удзельнік Гульні, які выйграў прыз, нясе адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

26. Удзельнікі Гульні, якія выйгралі прызы, і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, пісьмы і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

27. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», склад Камісіі па яе правядзенні, памер і склад Прызавога фонду да пачатку рэкламнай гульні падлягаюць апублікаванню сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў сродках масавай інфармацыі.

28. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 12 красавіка 2008 года ўключна ў газеце «Звязда».

29. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 964 ад 26.02.2008 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

1. ЗДАНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда»
2. ДОЎНАР Валянціна Аркадзьеўна, загадчык аддзела пісьмаў газеты «Звязда»
3. ЛЯЎКОВІЧ Таццяна Уладзіміраўна, вядучы рэдактар тэхнічнны газеты «Звязда»
4. ДАБРАВОЛЬСКІ Анатоль Васільевіч, вядучы рэдактар тэхнічнны газеты «Звязда»
5. ДЗЕВОЙНА Алена Уладзіміраўна, рэдактар юрыдычнага аддзела газеты «Звязда»

Тэрмін паўнамоцтваў Камісіі з 1 сакавіка 2008 года па 10 красавіка 2008 года.

ЗВЕСТКІ аб складзе і памеры прызавога фонду рэкламнай гульні "Падпішыся на "Звязду"

Прызавы фонд рэкламнай гульні "Падпішыся на "Звязду" сфарміраваны за кошт чыстага прыбытку арганізатара гульні – установы "Рэдакцыя газеты "Звязда" і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць	Цана за адзінку (руб.)	Кошт (руб.)	Стаўка ПДВ (%)	Сума ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Майкі	7 шт.	14819	103733	18	18672	122405
2.	Бейсболкі	7 шт.	9890	69230	18	12461	81691
3.	Гадзіннікі настольныя 446673 ЧНС-020390011 (1) з лагатыпам "Звязда"	7 шт.	25319	177233	18	31902	209135
4.	Печ ЗВЧ HORIZONT 17MW700-1378	1 шт.	199800	199800	18	33960	233760
5.	Тэлевізар "Віцязь" 54ctv760-3, г. Віцебск	1 шт.	271000	271000			271000
6.	Халадзільнік MXM-2819-90 РБ, ЗАО "АТЛАНТ"	1 шт.	740322	740322	18	133258	873580

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні "Падпішыся на "Звязду" складае 1 791 571 (Адзін мільён семсот дзевяноста адна тысяча пяцьсот семдзесят адзін) беларускі рубель.

Жыллё долевым спосабам па цэнах ЖБК

У Мінску кошт 1 кв.м жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і ўдзельнічаюць у долевым будаўніцтве, будзе такі ж, як і ў дамах ЖБК, паведаміў старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Яўген ВОЎНА.

Ён адзначыў, што, улічваючы неабходнасць нарошчвання долевага будаўніцтва, адной з умоў для забудоўшчыкаў з'яўляецца выкананне палажэнняў указа № 55 і прадастаўленне часткі ўзводзімага жылля тым, хто мае патрэбу. Прапануецца, каб доля для гэтай катэгорыі складала 50 працэнтаў.

У гэтым годзе ў Мінску сярэдні кошт 1 кв.м жылля ў дамах ЖКБ УКБ Мінгарвыканкама складзе для маючых патрэбу прыблізна каля Br1 млн, у 2007 годзе ён быў Br904 тыс., у 2006-м — Br755 тыс.

БЕЛТА.

Крэдыт падатковага даверу: 5 гадоў без праверак

Амаль 20 тыс. прадпрыемстваў Беларусі прэтэндуюць на атрыманне крэдыту падатковага даверу, паведаміў карэспандэнту **БЕЛТА** намеснік міністра па падатках і зборах Васіль Каменка.

Паводле яго слоў, крэдыт падатковага даверу прадугледжвае вызваленне групы плацельшчыкаў, якія адпавядаюць пэўным крытэрыям і добрасумленна выплачваюць падаткі ў бюджэт, ад падатковых праверак прыкладна на 5 гадоў.

Мяркуецца, што пазапланавыя праверкі да такіх падаткаплацельшчыкаў могуць прымяняцца толькі з дазволу кіраўніка дзяржавы. Уладальнік сертыфікату крэдыту падатковага даверу будзе мець прыярытэт пры ўдзеле ў тэндэрах.

Васіль Каменка таксама паведаміў, што адпаведны дакумент ужо ўнесены на разгляд ва ўрад.

Кватэрнае пытанне

Камфортна — гэта...

Апошнім часам усё больш будуецца жылля павышанай камфортнасці. Якія патрабаванні ўлічваюцца пры праектаванні такіх жылых дамоў?

А. ТАРАСЕВІЧ, *Минская вобл.*

Такія нарматыўныя патрабаванні існуюць. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2006 года № 58 пастановай Савета Міністраў ад 28 лютага 2006 года № 293 зацверджаны тэхнічна-эканамічныя паказчыкі крытэрыяў адпаведнасці жылых дамоў да жылых дамоў павышанай камфортнасці.

Указаныя паказчыкі змяшчаюць наступныя нарматыўныя патрабаванні:

месца размяшчэння жылога дома — у першай эканоміка-планіровачнай зоне дадзенага населенага пункта;

вышыня жылога паверха — больш за тры метры;

плошча кватэры — больш за 140 кв. метраў (не распаўсюджваецца ў выпадках незахавання нарматыву забяспечанасці агульнай плошчай жылога памяшкання на аднаго чалавека 20 кв. метраў);

інжынернае абсталяванне — сістэма індывідуальнага пакватэрнага ацяплення, індывідуальная аўтаматызаваная сістэма відэанагляду, сістэма цэнтралізаванага пылавыдалення, цэнтральнае кандыцыянаванне паветра ў жылым доме;

планіроўка — каэфіцыент суадносінаў агульнай плошчы да жылой 2 і больш (не распаўсюджваецца на адпанакаёвыя кватэры);

матэрыялы — унутраная аддзелка падлогі і сцен каштоўнымі пародамі дрэва (чырвонае дрэва, арэх), мармурам, гранітам;

абслугоўванне жылога дома — агароджванне тэрыторыі каля дома;

эксплуатацыя жылога дома (кватэры) і камфорт пражывання — наяўнасць фізкультурна-аздараўленчага комплексу (мініспартзала і (або) саўна з міні-басейнам), зімовага саду.

Віктар САВІЦКІ.

Ёсць пытанне

БЕЛАРУСКІ ДОМ — ШТО ГЭТА?

Хуткаму адкрыццю масавага сезона сядзібнай забудовы папярэднічала ў Мінску выстава «Беларускі дом-2008» па праспекце Пераможцаў, 14. Ужо ў самой назве выставы адчувалася прэтэнзія яе арганізатараў на адлюстраванне нацыянальнага каларыту і традыцый айчыннага дойлідства, і ў пэўнай ступені была заяўлена спроба на нейкія абагульненні ў так званым малаэтажным домабудаўніцтве. І сапраўды, што гэта такое — беларускі дом? І што нам каштуе яго пабудаваць?

Давайце ўявім, што вы сярэднестатыстычны патэнцыяльны забудоўшчык, малады ці адносна малады, сям'я якога жыве на сярэднюю ці крыху большую зарплату ў адным з сотняў малых гарадоў ці пасёлкаў нашай краіны. Інакш кажучы, тыповы прадстаўнік народа. Вас натхніла ўсеагульная ўвага да гэтай катэгорыі насельніцтва і ў адзін момант у галаву цюкнула цудоўная ідэя: а чаму б не пабудаваць уласны дом? Вы ўжо цвяроза ацанілі свае фінансавыя магчымасці, выбралі банк, дзе возьмеце не абцяжараны вялікімі працэнтамі доўгатэрміновы крэдыт, нагледзелі месца пад забудову, схематычна, у агульных рысах разам з жонкай намалявалі праект дома. Надышла чарга заняцца вывучэннем прапаноў айчыннага рынку будаўнічых матэрыялаў.

Вось тыповая карцінка з выставы. Жанчына сярэдняга ўзросту на стэндзе адной беларускай фірмы гартае альбом з фатаграфіямі дамоў і лазняў. Спыняецца на здымку не вельмі вялікай традыцыйнай лазні з прафіляванага сасновага бруса памерамі 6 на 4 метраў з навесам. Па сённяшніх патрэбах заможных катэджных забудоўшчыкаў — даволі сціплы аб'ект.

— Колькі будзе каштаваць «пад ключ»?

— 15 тысяч умоўных адзінак.

— Долараў ці еўра?

— Долараў.

— Дзякуй, што яшчэ ў долярах.

Жанчына моўчкі загарнула альбом і адышла. Відаць па тварах, яна была моцна ўражаная цаной лазні. Гэтых грошай спрытнаму яўскоўцу ў глыбінцы хапіла б на ўзвядзенне нармальнай хаты. Між іншым, удакладненне наведвальніцы наконт валюты разліку не пустая цікаўнасць. Пераважная большасць прыватных прадпрыемстваў, якія на выставе прапануюцца свае будаўнічую прадукцыю, цэны называлі ў еўра. На выставе прайс-лісты вытворцаў сучасных вокнаў ці дакладней шклопакетаў з ПВХ, таксама страката цэнамі ў еўра. Прычым яны выраслі ў сярэднім у параўнанні яшчэ з нядаўнім мінулым як мінімум на 100 умоўных адзінак.

Ну халера з ёй, лазняй за 15 тысяч «зялёных». Яна, безумоўна, патрэбная ў гаспадарцы і вельмі карысная для здароўя, але без яе можна абысціся. Спачатку трэба дом пабудаваць, а ўжо потым марыць пра лазню з басейнам, пакоямі для адпачынку з камінам ды більярдам. Канец зімы і пачатак вясны — самы час прыцаніцца і паглядзець на выставе, у колькі нам абыдзецца беларускі дом.

Карцінка з выставы. Прыкладна саракагадовы наведвальнік стэнда акцыянернага таварыства «Барысаўскі ДОК» на калькулятары дарагога мабільнага тэлефона падсумоўваў цэны на дом з клеенага бруса. Кошт залежаў ад аб'ёмаў заказу, параметраў бруса, колькасці нейкіх яго ламеляў. Але як ні лічыў наведвальнік, канчатковыя лічбы яго не радавалі, бо сярэдняя цана кубаметра ўпадабаўшага клеенага прафіляванага бруса з зарэзкамі на д/ц Шмідлер (не ведаю, што гэта) вагалася ад 475 да 523 еўра. Прапаноўваўся і больш танны брус. Але як ні круці, цана квадратнага метра базавага камплекта барысаўскага дома з клеенага бруса без падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) складала ад 290 да 365 еўра. Такім чынам, сярэдні па памерах двухпавярховы дом плошчай 140 кв.м з бруса 220х160 мм коштам 365 еўра (будуем жа для сябе) з ПДВ пацягне 51100 еўра.

У базавы камплект уваходзяць сценавы брус, бэлькі для перакрыццяў і падлогі, кроквенная сістэма, дошкі для падлогі і чарнавыя дошкі для даху, крапежная фурнітура. А гэта толькі аснова будучага дома. Прыкладна яшчэ такую ж суму неабходна ўкласці ў давядзенне дома да ладу.

У экспазіцыі выставы былі іншыя варыянты драўляных канструкцый айчынных вытворцаў, але цэны радыкальна не адрозніваліся. Дом «пад ключ» у беларускай фірмы з назвай сугучнай краінам Карыбскага басейна «Мадэйра» (свае паслугі прапаноўвае ў доларах) з прафіляванага бруса абыдзецца ў 500 долараў за квадратны метр. Такім чынам дом плошчай 140 кв.м будзе каштаваць 70 тысяч долараў. Далёка не кожны сярэднестатыстычны забудоўшчык, асабліва з глыбінкі, пацягне гэткія выдаткі. Затое «Мадэйра» абяцае стопрацэнтны «пад ключ» — ад тыпавога праекта да ўнутранай аддзелкі. Ад заказчыка патрабуецца толькі забяспечыць пражыванне рабочых, мець на ўчастку ваду і электрычнасць. Зручна, нават вельмі, але ўсё роўна дорага для чалавека з сярэдняй зарплатай.

Праўда, радавы забудоўшчык можа выбраць больш танны каркасны дом. Хоць слова «танны» тут вельмі ўмоўнае. У «Барысаўскім ДОКу» цана квадратнага метра базавага камплекта каркасна-панэльнага дома без падатку на дабаўленую вартасць складае 200 еўра. А вось у беларуска-англійскай кампаніі «Каркасныя будаўнічыя тэхналогіі» цэны на камплектацыю якаснага каркаснага дома пад чыставую аддзелку пачынаюцца ад 500 еўра. Тыя ж 140 кв.м абыдуцца ў 70 тысяч еўра, ці больш за 210 млн беларускіх рублёў.

Кубаметр бруса — 575 еўра, лазня за 15 тыс. долараў, дом за 210 млн рублёў?

Дык якім павінен быць сапраўдны беларускі дом? На мой погляд, пажадана з дрэва. Можна з цэглы, блокаў ячэістага бетону і іншых матэрыялаў, але спрадвеку беларусы жылі ў драўляных хатах і няма важкіх прычын здраджваць гэтай традыцыі. Дарэчы, у лясных еўрапейскіх краінах з высокім узроўнем жыцця, такіх, як Швецыя, Фінляндыя, Нарвегія, большасць насельніцтва жыве ў драўляных дамах. У апошняй ужо не першы год рэалізуецца нацыянальная праграма «Драўлянае домабудаўніцтва». Шведы насуперак катэджнай модзе не лезуць у вышыню і не закопваюцца ў зямлю, не робяць мудрагелістыя цокальныя паверхі, а працягваюць будаваць аднапавярховыя функцыянальныя дамы з дрэва. Фіны, у тым ліку і моладзь, аддаюць перавагу малапавярховым драўляным дамам, праўда, размешчаным у прыгарадах ці гарадскіх раёнах з развітой інфраструктурай і ўсімі выгодамі цывілізацыі. Плошча тыпавога індывідуальнага дома прыкладна 130—140 кв.м. Дзяржава там актыўна дапамагае забудоўшчыкам, існыуе шмат спецыяльных праграм. Цікавая дэталь: калі сам заказчык непасрэдна ўдзельнічае ў будаўніцтве свайго дома, то ён напалову, а часам і больш скарачае свае будаўнічыя выдаткі. У выніку ў невялікай па колькасці насельніцтва Фінляндыі (5,2 млн чалавек) штогод узводзіцца 15 тысяч малапавярховых і пераважна драўляных дамоў.

Дык што нам перашкаджае арганізаваць уласную праграму «Драўлянае домабудаўніцтва». Лесу не хапае? Яго для гэтых мэтаў у краіне больш чым дастаткова. Праблемы з абсталяваннем для масавай забудовы? Дык няўжо нашы канструктары і станкабудаўнікі не ў сілах стварыць уласнае і не вельмі дарагое абсталяванне для вырабу клеенага, прафіляванага ці ацыліндраванага бруса?

Але цікавая рэч: цэны на брус, вырабленыя з беларускай драўніны і на беларускіх прадпрыемствах, істотна выраслі за апошнія гады, а часам увогуле зашкальваюць. На адным стэндзе выставы мне нават назвалі цану кубаметра клеенага бруса аж у 575 еўра! Абсалютны рэкорд выставы. Чаму ж так дорага, пытаюся я прадстаўніка прадпрыемства. Яго аргументы: брус выраблены па складанай тэхналогіі на сучасным і дарагім заходнім (нямецкім ці шведскім) абсталяванні з выкарыстаннем ну вельмі экалагічна чыстага, а таму не таннага, замежнага клею. Акрамя гэтага, моцна выраслі цэны на драўніну на біржы, на энерганосьбіты.

Дарэчы, наведвальнікаў, расчараваных цэнамі на будаўнічыя матэрыялы і паслугі, было шмат на выставе. Бо істотна ўзняліся цэны на дзверы, вокны і іншыя складовыя дома. Зразумела, гэта ў значнай ступені — вынік росту той жа дарагоўлі на сыравіну, камплектуючыя і г.д. Але ж звычайнаму забудоўшчыку гэта слабае суцяшэнне. Ну і што з таго? Была б яго зарплата ў тысячу—паўтары ўмоўных адзінак, пажадана ў еўра, тады нічога. А так...

Таму наш сярэднестатыстычны патэнцыяльны забудоўшчык адчуваў сябе ў пэўнай ступені чужынцам на гэтым свяце. Значная частка экспанентаў выставы вырабы, якія разлічаны на людзей з высокім узроўнем даходаў. Напрыклад, імпартныя масажныя крэслы, прапановы па акварыумным дызайне, сістэмы аўтаматычнага паліву газонаў, агламераваныя плітыз мармуру, граніту і кварцу, экалагічныя басейны XXI стагоддзя на свежым паветры...

Трэба сказаць, што экспазіцыя выставы «Беларускі дом-2008» прыцягнула ўвагу шырокіх колаў наведвальнікаў. У першы і наступныя дні работы натоўпы людзей снуюдалі ўздоўж стэндаў. І гэта пры тым, што цана ўваходнага білета каштавала тры тысячы — мера, якая фільтруе наведвальнікаў. Іх вялікая колькасць на выставе гаварыць аб павышанай цікаўнасці людзей да малапавярховай забудовы. Прычым не толькі з боку мінскіх дачнікаў і гаспадароў прыгарадных участкаў пад катэджы. Дык ці не надышоў час зрабіць экспазіцыю выставы сапраўды народнага беларускага дома (не па назве, а па сутнасці) з прапановамі органаў мясцовай улады, архітэктараў, леснікоў, будаўнікоў і ўсіх тых, хто мае дачыненне да забудовы жылля. Каб яна была цікавая для кожнага, хто мяркуе абзавесціся ўласным домам.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Выраб вокнаў, дзвярэй і мэблі выклікаюць галоўныя нараканні спажыўцоў

У грамадскую арганізацыю «Мінскае таварыства спажыўцоў» у студзені па тэлефоне «гарачай лініі» звярнулася больш за 900 спажыўцоў са скаргамі на якасць тавараў і паслуг. Непасрэдна ў юрыдычны аддзел на прыём прыйшло больш за 100 грамадзян, каля 20 працэнтаў з якіх атрымалі кваліфікаваную дапамогу бясплатна — як сацыяльна неабароненая катэгорыя насельніцтва.

Найчасцей спажыўцы скардзіліся на невыкананне абавязацельстваў з боку юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў пры вытворчасці мэблі, вокнаў і дзвярэй. Такіх нараканняў паступіла 40 працэнтаў ад агульнай колькасці за студзень. Характар парушэнняў: заключэнне здзелак без афармлення адпаведных дагавораў, нявыдача дакументаў, якія пацвярджаюць унясенне перадаплаты, а таксама поўнага кошту вырабу па дагавору. Часам наўмысна не ўказваецца дата заключэння дагавора, што ўскладняе разгляд спрэчкі па сутнасці.

Больш за 30 працэнтаў скаргаў па-ранейшаму датычацца няякасных складаных тэхнічных тавараў. У прыватнасці, працягваецца продаж мабільных тэлефонаў без належнага афармлення дакументаў, што пацвярджаюць факт продажу: замест звестак аб прадаўцы, як правіла, указваўся толькі тэлефонны нумар, што ў далейшым ускладняе прад'яўленне прэтэнзій у дасудовым і судовым парадку вінаватаму боку. У парушэнне дзеючага заканадаўства не выдаюцца чэкі.

Да гэтай жа катэгорыі скаргаў можна аднесці і нараканні на няякасны рамонт складаных тэхнічных тавараў. Падчас гарантыйнага рамонту спажыўцоў часам неправамоцна здымаюць з гарантыйнага абслугоўвання па прычыне таго, што вільгаць трапіла ў тавар, або механічнага пашкоджання. Аднак такая заява майстэрняў мае спрэчны характар, паколькі момант, калі вільгаць трапіла ў яго, вызначыць практычна немагчыма (адбылося гэта да ці пасля паступлення тавару ў рамонт), сцвярджаюць юрысты Мінскага таварыства спажыўцоў.

Далей ідуць пытанні, звязаныя з набыццём няякаснага абутку, продаж якога адбыўся на рынках сталіцы — больш за 20 працэнтаў ад агульнай колькасці скаргаў. Нараканні спажыўцоў выкліканы навязваннем рамонту ў межах гарантыйнага тэрміну, адмовай у прыняцці заявы і правядзенні экспертызы.

Скаргі на няякасныя паслугі СТА ў першым месяцы года склалі 10 працэнтаў. Сярод парушэнняў: неафармленне заказ-нарадаў, навязванне дадатковых паслуг за асобную плату, некваліфікаваны рамонт, хамства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 31 сакавіка** ў рэдакцыю па адрасе: **220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, печ ЗВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў праводзіцца **4 красавіка 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 12 красавіка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку печы ЗВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 1 сакавіка 2008 года. Удачы ў гульні!

Тэрмін правядзення гульні — з 1.03.08 па 10.04.08.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 964 ад 26.02.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на II кв. або 1-е паўг. 2008 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПІЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды
(прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

(індэкс выдання)

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПІЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб.; перааформкі _____ руб.

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды
(прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

На слыху

ПРЫНЦА ГАРЫ ЭВАКУЮЮЦЬ З АФГАНІСТАНА З-ЗА ЎЦЕЧКІ ІНФАРМАЦЫІ

Вышэйшае камандаванне брытанскай арміі рыхтуецца вывезці прынца Гары з Афганістана, піша The Guardian. Аб неабходнасці гэтых мераў загаварылі пасля таго, як стала вядома, што прынц на працягу 10 тыдняў тайна ваюе ў правінцыі Гільменд у складзе міжнароднага кантынгенту.

Для ўдзелу ў ваенных дзеяннях супраць баевікоў руху «Талібан» прынцу Гары давялося асвоіць новую спецыяльнасць. Ён стаў авіянаводчыкам, і ў яго задачы ўваходзіла сачыць за перамяшчэннем варожых войскаў. Выданне прыводзіць версію аб тым, што новая пасада была прапанавана прынцу пасля таго, як ён прыгразіў пакінуць ваенную службу з-за адмовы ў адпраўцы ў Ірак. Прадстаўнікі Міністэрства абароны адмаўляюць гэта і сцвярджаюць, што прынца прызначылі на гэту пасаду, паколькі афіцэр, які займаў яе раней, мае патрэбу ў водпуску пасля службы ў Іраку і Афганістане. Месца службы прынца ўтойвалі не толькі з-за апасенняў за яго жыццё, але і з-за таго, што распаўсюджанне гэтай інфармацыі магло паставіць пад пагрозу жыццё яго саслужыўцаў. Аб гэтым, у прыватнасці, гаворыцца ў тэлевізійным звароце, запісаным Гары перад адпраўкай у Афганістан, якое павінна было быць паказана ў эфіры пасля яго вяртання. Сайт ФактNews са спасылкай на брытанскую газету The Sun паведамляе, што Гары як авіядыспетчар скідваў на талібаў бомбы. Паводле даных брытанскага таблоіда, Гары забіў каля 30 чалавек. Яму не было прадастаўлена ніякіх прывілей і ён падвяргаўся такой жа рызыцы, як іншыя салдаты. Меркавалася, што прынц, які закончыў у 2006 годзе ваенную акадэмію, правядзе ў Афганістане 14 тыдняў.

ІНТЭЛЕКТ 9-ГАДОВАГА ЕГІПЦЯНІНА ПЕРАВЫСІЎ ПАРОГ ГЕНІЯЛЬНАСЦІ

9-гадовага егіпцяніна Махмуда Уаіля называюць патэнцыяльным Эйнштэйнам, паведамляюць «Вести».

Ён з лёгкасцю ў галаве ажыццяўляе матэматычныя аперацыі са шматзначнымі лічбамі. Акрамя таго, за тры месяцы хлопчык вывучыў англійскую мову і ўжо асвойвае французскую і нямецкую.

Махмуд паказаў вельмі высокі вынік тэсціравання на каэфіцыент інтэлекту — яго IQ складае 151 пункт. Гэта лічба вышэй за парог геніяльнасці і дазваляе хлопчыку ўступіць у «Таварыства трайной дзевяткі» — арганізацыю, членамі якой з'яўляюцца людзі з IQ больш за 142 — вышэй, чым у 99,9 працэнта насельніцтва Зямлі. У мінулым годзе такіх налічвалася крыху больш за 800 чалавек. Паводле даных егіпецкіх СМІ, матэматычны талент у Махмуда праявіўся ўжо ва ўзросце 3 гадоў. Адзін з прыватных канадскіх універсітэтаў прапанаваў бацькам Махмуда грант на бясплатнае навучанне ў абмен на пераезд сям'і на пастаяннае месца пражывання ў гэту краіну. Але бацькі дзіцяці адмовіліся ад прапановы. На гэтым тыдні Махмуда прыме міністр вышэйшай адукацыі. Калі гутарка пройдзе паспяхова, хлопчык стане студэнтам Каірскага ўніверсітэта.

КРЫМСКІЯ ЭКОЛАГІ НЕ РАЯЦЬ У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС КУПАЦЦА Ў ЧОРНЫМ МОРЫ

Крымскія эколагі не раяць у бліжэйшы час купацца ў Чорным моры, паколькі яно ўсё яшчэ забруджана нафтапрадуктамі з караблёў, пацярпелых у час штораму ў лістападзе мінулага года, паведамляюць украінскія тэлеканалы са спасылкай на прадстаўнікоў Крымскай рэспубліканскай асацыяцыі «Экалогія і свет».

Эколагі папярэджваюць, што з наступленнем цяпла на Чарнаморскім узбярэжжы ўсё часцей з'яўляюцца нафтавыя плямы. У прыватнасці, цяпер на дне Керчанскага праліва, у раёне аварыі суднаў, залягаюць сотні тон мазуту, якія могуць апынуцца на беразе пасля вясновых штормаў. Як адзначае старшыня крымскай асацыяцыі, кіраўніцтва паўвострава папракае экалагаў за нагнятанне абстаноўкі напярэдадні курортнага сезона. Са свайго ж боку ўлады аўтаноміі заяўляюць, што праблема з ачысткай узбярэжжа ад мазуту вырашана. У лістападзе 2007 года з-за моцнага штораму ў Керчанскім праліве пацярпелі крушэнне сем расійскіх суднаў, у тым ліку два танкеры і некалькі сухагрузаў з серай. У выніку ў мора вылілася некалькі тысяч тон нафтапрадуктаў і серы.

МАСАВАЕ АТРУЧЭННЕ Ў ДЗІЦЯЧЫМ САДКУ

Пяцьдзесят шэсць дзяцей з дзіцячага садка ў Брацку Іркуцкай вобласці трапілі ў бальніцу ў выніку атручэння, паведаміла прэс-служба рэгіянальнага МНС.

Дзеці шпіталізаваны ў дзіцячую гарадскую бальніцу, з іх шасцёра знаходзяцца ў рэанімацыі. Яшчэ 14 дарослых, якія працуюць у дзіцячым садку, знаходзяцца ў інфекцыйным аддзяленні гарадской бальніцы № 5. Папярэдні дыягназ пацярпелых — востры гастраэнтэрыт і гастраэнтэракаліт. Прычынай атручэння сталі тэфтэлі з галандскай пячонкі. У сувязі з атручэннем у дзіцячым садку мэрыя Брацка ўвяла на тэрыторыі горада рэжым надзвычайнай сітуацыі.

ЗГВАЛТАВАЎ ПРАМА Ў АЎТОБУСЕ

У Злучаных Штатах старшакласнік згвалтаваў дзіця прама ў школьным аўтобусе. Вадзіцель, а таксама іншыя школьнікі не змаглі або не захацелі яму перашкодзіць.

Ахвярай 18-гадовага гвалтаўніка стала 14-гадовая дзяўчынка. Злачынства было ўчынена 20 лютага, калі школьны аўтобус развозіў дзяцей па дамах. Вадзіцель школьнага аўтобуса, у якім адбылося дзёрзкае згвалтаванне, вымушаны апраўдацца, чаму ён не змог умяшацца і прадухіліць злачынства. Паводле яго слоў, ён павінен быў сачыць за дарогай, каб даставіць дзяцей дадому ў цэласці, а наяўнасць у салоне 60 школьнікаў не дазволіла ўбачыць злачынства, якое ўчынялася. Дарэчы, дзікасць здарэння і ў тым, што згвалтаванне было знята на камеру ўнутранага назірання, установленую ў аўтобусе, дзе відаць, што дзяўчынка супраціўлялася гвалтаўніку і клікала на дапамогу. На наступны дзень пасля здарэння сваякі пацярпелай звярнуліся ў паліцыю, старшакласніку прад'яўлены абвінавачанні ў сэксуальных дамаганнях і згвалтаванні непаўналетняй. Ён быў вызвалены пад заклад у 19 тысяч долараў.

Тэлефон-трансформер

На сумеснай прэс-канферэнцыі TV Tokyo, SoftBank і Toshiba быў паказаны новы тэлефон-трансформер для сетак трэцяга пакалення — Softbank 815T PB (PhoneBraver). Цікавая дэталь — чалавекападобны тэлефон-трансформер умее адлюстроўваць эмоцыі, як відаць на фатаграфіі. Прыстасаванне створана для прасоўвання новага японскага серыяла пад назвай Ketai Sousakan 7 і сапраўды выканана ў форме своеасаблівай трансформуемай мадэлі робата, «эмоцыі» якога адлюстроўваюцца на дысплеі.

САМЫЯ «ТЛУСТЫЯ» НАЦЫІ Ў СВЕЦЕ



На малюнку паказаны працэнт насельніцтва краіны, якія пакутуе ад лішняй вагі.

ЗША БУДУЮЦЬ «КАРАБЕЛЬ-КАМІКАДЗЭ»

АМЕРЫКАНЦЫ ЗБІРАЮЦЦА ЎВАСОБІЦЬ У ЖЫЦЦЁ СЦЭНАРЫЙ ФІЛЬМА «АРМАГЕДОН»

У ЗША пачынаюць будаваць карабель, які здольны будзе прадухіліць сутыкненне буйнога астэроіда з Зямлёй — яно можа адбыцца ў 2036 годзе. Запуск касмічнага апарата запланаваны на 2012 год. Паводле планаў, карабель сутыкнецца з нябесным целам і зрушыць яго цэнтр цяжару. У Расіі, дарэчы, таксама распрацоўваюцца праекты абароны планеты ад нябесных целаў, праўда, больш мірныя. А ў «чысціні намераў» амерыканскіх калег расійскія эксперты сумняваюцца.

Астраномы прадказваюць сутыкненне з 200-метровым у папярэчніку касмічным целам у 2036 годзе. Паводле даных навукоўцаў, Апофіз-99942, які верціцца вакол Сонца, — гэта рэліктавы касмічны аб'ект, які з'яўляецца побач з Зямлёй у сярэднім раз у 10 гадоў. Месяц таму астэроід быў заўважаны на адлегласці ў 500 тыс. км ад нашай планеты.

Наступнае праходжанне касмічнага цела ў калязямной арбіце магчыма ў 2029 годзе, а ў 2036 годзе навукоўцы не выключаюць сутыкнення Апофіза з Зямлёй. Па папярэдніх разліках, магутнасць выбуху ў гэтым выпадку будзе роўная 400 мегатонам у трацілавым эквіваленце. Каб прадухіліць магчымую катастрофу, прадстаўнікі Планетарнай супольнасці, якія цікавяцца касмічнымі даследаваннямі, вырашылі арганізаваць конкурс па распрацоўцы касмічнага апарата для сачэння за астэроідам. У выніку запуск касмічнага апарата будзе арганізаваны пад кіраўніцтвам інжынернай кампаніі SpaceWorks Engineering (SEI), паведамляе BBC.

Распрацоўшчыкі плануюць, што іх карабель сутыкнецца з Апофізам у адкрытым космасе і такім чынам зрушыць яго цэнтр цяжару. Мяркуецца, што карабель даляціць да Апофіза і будзе рухацца за ім на працягу 300 дзён, вызначыўшы цэнтр масы астэроіда і выконваючы рэгулярныя выліўнені свайго месцазнаходжання адносна праследуемага аб'екта. Па выніках атрыманых даных будзе прынята рашэнне аб магчымым адхіленні астэроіда ад яго першапачатковага курсу. Аднак супрацоўнік прэс-службы Раскосмасу ў гутарцы з журналістамі не выключыў, што карабель ствараецца зусім не для абароны Зямлі ад нябесных аб'ектаў. «Амерыканцы збілі свой спадарожнік ракетай, кітайцы таксама знішчылі свой адпрацаваны спадарожнік. І у гэтым выпадку ўсё можа быць не так, як падаюць нашы заакіянскія калегі», — кажа эксперт.

З ім пагадзіўся Леанід Сакалоў, загадчык лабараторыі нябеснай механікі і зорнай механікі санкт-пецярбургскага Астранамічнага інстытута ім. У.У. Собалева, які абараніў доктарскую дысертацыю па тэме астэроіда Апофіз. «У прынцыпе, я не магу гэтага выключыць, цяпер распрацоўваецца вельмі шмат праектаў падвойнага прызначэння», — сказаў ён у інтэрв'ю.

Спроба правесці так званыя «абыходныя маневўры» можа быць апраўданая на фоне таго, што вядучыя сусветныя дзяржавы спрабуюць забараніць размяшчэнне любой зброі ў космасе. Так, Расія і Кітай ужо больш як пяць гадоў абмяркоўваюць дамову аб недапушчальнасці выкарыстання сілы ў дачыненні да касмічных аб'ектаў. Што датычыцца небяспекі падзення Апофіза-99942 на Зямлю, Леанід Сокалаў пацвердзіў, што яна сапраўды існуе: «Верагоднасць, праўда, вельмі невялікая — прыблізна 0,001 працэнта, — удакладніў эксперт. — Але паколькі сам астэроід вялікі па памерах, гэта маленькая лічба для спецыялістаў вельмі істотная. Сачыць за ім трэба, што і робіцца ва ўсім свеце». У Расіі таксама распрацоўваюцца праекты абароны Зямлі ад нябесных целаў, расказвае Леанід Сокалаў, спаслаўшыся, у прыватнасці, на зборнік матэрыялаў чытанняў па касманаўтыцы, якія прайшлі ў Маскве ў студзені-лютым 2008 года. На іх разглядаліся некаторыя варыянты абароны нашай планеты ад непажаданых нябесных гасцей. «Расія таксама збіраецца будаваць карабель, праўда, з некалькі іншымі мэтамі — неабходна сапраўды вызначыць арбіту аб'екта і вырашыць, што рабіць далей. Час пакуль трывае», — кажа супрацоўнік Астранамічнага інстытута ім. У.У. Собалева.

Але калі сумеснымі намаганнямі Зямлю абараніць не атрымаецца, разбурэнні могуць быць даволі сур'ёзнымі. «Калі параўнаць з Тунгускім метэарытам, памеры якога былі прыкладна 60 метраў, а ў гэтага астэроіда — 200 метраў, то гэтым разам усё можа быць вельмі сур'ёзна. Увогуле, лепш, каб сутыкнення не было», — заключыў эксперт.

Сківіцу са ствалавых клетак вырасцілі ў жываце пацыента

Фінскія вучоныя перасадзілі мужчыну верхнюю сківіцу, атрыманую з яго ўласных ствалавых клетак. На працягу дзевяці месяцаў трансплантант вырошчвалі ў жываце самога пацыента, паведамляе ABS News.

Для стварэння сківіцы спецыялісты з Інстытута рэгенератыўнай медыцыны пры Універсітэце Тампераэ выкарыстралі ствалавыя клеткі, атрыманыя з тлушчавай тканкі 65-гадовага пацыента. На працягу двух тыдняў іх культывавалі ў спецыяльным пажыўным растворы, пасля чаго былі выдзелены так званыя мезенхімальныя ствалавыя клеткі — няспелыя клеткі, з якіх можа ўтварацца косная тканка, мышцы і сасуды. Клеткі перанеслі ў спецыяльную трохмерную падложку-носьбіт з біяматэрыялу (фасфат кальцыю), і на дзевяць месяцаў змясцілі ў жывот пацыента. Трансплантант, які ўтварыўся, змяшчаў не толькі косную тканку і мышцы, але і сасуды, паведамілі даследчыкі. У ходзе аперацыі трансплантант далучылі да чэрапа пацыента, а артэрыі і вены злучылі з сасудамі шыі з дапамогай мікрахірургічнай тэхнікі. Уласная сківіца пацыента была папярэдне выдалена ў выніку дабраякаснай пухліны. У цяперашні час пацыент хутка ідзе на папраўку, расказала на прэс-канферэнцыі кіраўнік даследавання Рыіта Суороненен . «Па яго знешнім выглядзе нельга здагадацца, што ён падвергся такой працэдуры», — паведаміла яна. Поспех спецыялістаў з Фінляндыі адкрывае новыя шляхі лячэння цяжкіх пашкоджанняў тканак і робіць перспектыву стварэння органаў «на заказ» больш рэальны, мяркуюць даследчыкі.

СВЕТУ ПАГРАЖАЕ ГЛАБАЛЬНЫ ГОЛАД

ААН не зможа працягваць пастаўкі харчавання ў галадаючыя краіны ў былых аб'ёмах. Павышаны попыт на сельгаспрадукцыю і рост цэнаў, які пачаўся пасля гэтага, верагодна, выклічуць праблему глабальнага голаду. Тым не менш Расія і краіны Усходняй Еўропы маюць шанц скарыстацца сітуацыяй і вярнуць сабе статус асноўных пастаўшчыкоў харчавання на рынкі Еўропы.

Паводле слоў Джозет Шыран, выканаўчага дырэктара WFP (аддзяленне ААН, якое займаецца сусветнай харчовай праграмай), ва ўмовах імклівага росту цэнаў арганізацыя можа скараціць або ахоп праграмы, або рацыён. І тое, і другое, хутчэй за ўсё, прывядуць да тысяч смерцяў ад голаду. Робін Лодж, прадстаўнік WFP, у інтэрв'ю «РБК daily» папярэдзіў, што такі імклівы сусветны рост цэнаў можа стаць прычынай узнікнення «глабальнага голаду абсалютна новага кшталту». Абмяркоўлена гэта шэрагам прычын. Па-першае, з-за эканамічнага ўздыму Індыі і Кітая павялічваецца колькасць прадстаўнікоў сярэдняга класа, што, у сваю чаргу, прыводзіць да росту попыту на жывёлагадоўчую прадукцыю. Гэты попыт і падганяе цэны на збожжа, што ідзе на корм жывёле.

Другой прычынай з'яўляецца рост цэнаў на біяпаліва, што прымушае вытворцаў засяваць пасяўныя плошчы больш даходным рапсам, які ідзе на сыравіну для этанолу. Ёсць прыклады і выпадкаў злоўжывання харчовай праграмай. Напрыклад, Афганістан падаў у ААН заяву на гуманітарную дапамогу для 2,5 мільёна чалавек, спасылаючыся на незвычайна суровую зіму. Насамрэч недахоп харчавання ўзнік з-за таго, што ўсе плошчы былі засеяны опійным макам. Перад ААН стаіць і праблема іншага характару. WFP закупляе харчаванне на амерыканскія долары, а апошнім часам гэта валюта імклівa таннее. Без уліку фактараў форс-мажору, такіх, як цунамі і засухі, для ажыццяўлення харчовай праграмы неабходна як мінімум $375 мільёнаў.

Але некаторыя краіны змогуць атрымаць выгаду з сітуацыі, якая склалася. Харчовы крызіс відавочна прывядзе да перазмеркавання сельскагаспадарчых рынкаў. Паводле слоў намесніка дырэктара Інстытута Усходняй Еўропы Васіля Жаркова, Украіна, Польшча і поўдзень Расіі, хутчэй за ўсё, зноў стануць асноўнымі пастаўшчыкамі падобнай прадукцыі ў краіны Заходняй Еўропы, таму што Паўднёвая Амерыка — цяперашні асноўны пастаўшчык — у бліжэйшы час будзе пераарыентавана на вытворчасць біяпаліва для ЗША. Краіны Заходняй Еўропы будуць вымушаны звярнуцца на Усход. Такім чынам інвестыцыі ў расійскую сельскую гаспадарку ў бліжэйшай будучыні будуць прыносіць даходы, супастаўныя з даходамі ад укладанняў у нафтавую прамысловасць.

РЭЙТЫНГ ЗАДАВАЛЬНЕННЯЎ

Навукоўцы з Манчэстарскага ўніверсітэта апытралі 11 028 чалавек з розных краін з мэтай даведацца, што дастаўляе ім найвышэйшае задавальненне. У 50 выніковых пунктаў акрамя аргазму, ухілення голаду і смагі, спажывання алкаголю і тытуню, ўвайшлі такія пункты:

1. Назіранне сябе ў люстэрку ў добрым настроі;
2. Асалода пры атрыманні вялікай сумы грошай;
3. Палягчэнне пры адыходзе непрыемнага або нямоглага госця;
4. Задавальненне пры пакупцы новай рэчы;
5. Пагладжванне ката і сабакі;
6. Імгненнае захапленне ў заключнай фазе чхання;
7. Радасць ад забітага гола або перамогі любімай каманды;
8. Захапленне пры яздзе на новым аўтамабілі на хуткасці больш за 120 км у гадзіну;
9. Ускрыванне чужога ліста, падслухоўванне тэлефоннай гутаркі;
10. Нецярплівая знямога ў чаканні апошняга спатканння з нялюбай(ым);
11. Адыход да сну ў свежазасцеленым ложку;
12. Задавальненне ад адцягвання моманту інтымнай блізкасці — для жанчын;
13. Разгляданне агаленага жаночага цела — для мужчын;
14. Задавальненне пры вестцы аб няшчасці або бядзе іншага чалавека з імгненнай радаснай думкай: «Дзякуй богу, не я!»
15. Смачная ежа, за якую хтосьці заплаціў.
16. Выбірайце тканіны нейтральных колераў, без яскравых узораў — яны будуць служыць вам даўжэй (з пункту гледжання моды).
17. Значэнне аксесуараў у нашы дні расце, таму ўкладвайце грошы ў абутак, рамяні, сумкі, гальштукі і г.д. Тады вы зможаце абнаўляць свой убор зноў і зноў. Памятайце пра колеры, якія носіце, і купляйце адпаведныя аксесуары. Пры гэтым памятайце, што з шэрым колерам вы можаце насіць і чорнае, і карычневае. Гадзіннік — адна з найбольш важных рэчаў, якую вы купіце, гадзіннік многае гаворыць аб мужчыне. Я нашу ўласныя Borgo 21 (гадзіннік, створаны Армані і названы па адрасе міланскага дома мадэльера) і вельмі даражу ім.
18. Старанна падабраны водар можа стаць вашай адметнай рысай. Гэта першае, што адчуваюць людзі, калі вы ўваходзіце ў пакой і апошняе, што знікае, калі вы адыходзіце.
19. Будзьце смелымі ў сваіх перакананнях. Калі я эксперыментаваў з кроем, гэта ішло ўразрэз з агульнапрынятымі ідэямі і метадамі. Але я проста хацеў стварыць адзенне, якое б выглядала элегантна і, у той жа час, было камфортным. У рэшце рэшт мае ідэі ўвайшлі ў моду. Цяпер мужчыны хочуць, каб іх строгія касцюмы былі камфортнымі.
20. Я рады, што ў нашы дні ў мужчын зноў з'явілася жаданне быць элегантнымі. Стыль гранж мне не па душы. Я думаю, элегантнасць — ключ да аблічча, якое не падуладнае часу, да таго, што ніколі не выйдзе з моды, з чым ніколі не выйдзеце з моды вы. Свой поспех я тлумачу вернасцю гэтай філасофіі. Для мяне стыль больш важны, чым недаўгавечныя модныя тэндэнцыі.
21. Што б я ні рабіў, я ніколі не змагу перакананць Сэма Джэксана (Сэмюэль Л. Джэксан — галівудскі акцёр) з'явіцца на людзях без галаўнога ўбору.

ЛЁС ЗАШЫФРАВАНЫ Ў КОЛЕРЫ ВАЧЭЙ І ФОРМЕ ПАЛЬЦАЎ



Яшчэ ў старажытнасці лекары сцвярджалі, што ў арганізме чалавека ўсё ўзаемазлучана і здаровае цела — гэтае гарманічнае цела. Да падобнай высновы прыходзіць і сучасная медыцына, тым больш што пацверджанняў таму знойдзена нямала.

Мала хто ведае, напрыклад, што па фатаграфіі чалавека можна вызначыць, наколькі ён схільны да тых або іншых хвароб. І гэтае зусім не шарлатанства. Вядома, што ўладальнікі блакітных, шэрых або зялёных вачэй маюць больш шанцаў у старасці захварэць меланомай і аслепнуць. Гэта звязана з асаблівасцямі пігменту, якім афарбаваная радужная абалонка вока.

Можна выявіць таксама і шэраг іншых заканамернасцяў. Напрыклад, уладальнікі маленькіх мочак вушэй больш схільныя да сардэчных захворванняў. Тое ж самае можна сцвярджаць і пра мужчын, якія рана пачынаюць лысець з верхавіны. Пры гэтым у іх, акрамя таго, часцей за ўсё і схільнасць да прастатыту.

Аб многім распавядзе воку дасведчанага медыка і форма рук. Доўгія, тонкія пальцы паказваюць на схільнасць да дэпрэсіі — цікава, што гэтая рыса была ўласцівая шматлікім геніям. Нямала дасць дасведчаному лекару і кароткі позірк на ногі пацыента. Калі яны кароткія, значыць, чалавеку варта берагчы сваё сэрца — у старасці яно можа стаць крыніцай праблем. А вось жанчын з маленькімі ступнямі, верагодна, чакаюць цяжкія роды. Нарэшце, стройная ад прыроды постаць таксама не абяцае ім ўладальніцам нічога добрага: паводле некаторых даных, яны часта захворваюць на рак грудзей. Заўважым, што гэтая хвароба можа падпільнаваць не толькі ўдарлявак. Напрыклад, азіяткі з любым целаскладам таксама могуць стаць яе ахвярамі, калі будуць прытрымлівацца традыцыйнага для еўрапейцаў рацыёну. Рак грудзей можа развіцца і ў тых прадстаўніц прыгожай паловы, хто многа працуе ў начную змену.

ЯК МАЛАДЗЕЕ ЖАНЧЫНА



Калі жанчына кідае курыць, скура яе твару маладзее на 13 гадоў на працягу дзевяці месяцаў. Акрамя таго, прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва пры гэтым не паўнеюць, як прынята лічыць, а, наадварот, у 75 працэнтах выпадкаў худзеюць або захоўваюць тую ж вагу, перадае тэлеканал «Вести-24».

Да такіх высноў прыйшлі спецыялісты Італьянскага саюза па барацьбе з курэннем, якія прадставілі ў аўторак у Мілане вынікі сваіх даследаванняў.

Дыетолаг Лідзія Левандоўкая і дырэктар дэрматалагічнай клінікі «Дэрмінг» Адэлі Спаравінья з лютага па лістапад 2007 года правялі некалькі навуковых даследаванняў. У аснову іх работ лёг метад вывучэння ўзросту скуры, у якім улічваюцца аб'ектыўныя параметры, такія як эластычнасць, мікрарэльеф і візуальныя характарыстыкі скуры асобы. У першым даследаванні ўдзельнічалі 200 жанчын, якія не кураць. Грунтуючыся на атрыманых выніках, навукоўцы распрацавалі складаную схему вызначэння ўзросту скуры твару жанчыны. У другім эксперыменце, які доўжыўся дзевяць месяцаў, узялі ўдзел каля 70 жанчын рознага ўзросту. Ад іх запатрабавалася кінуць курыць і праходзіць аналізы кожныя тры месяцы. Вынік аказаўся дзіўным: скура ўдзельніц гэтага даследавання ў сярэднім памаладзела на 13 гадоў, а важылі яны на некалькі кілаграмаў менш, чым да ўдзелу ў эксперыменце. Італьянскі саюз па барацьбе з курэннем прадставіў таксама рэкламны шчыт, на якім намаляваны чырвоны абцасік, які тушыць акурак, а пад ім надпіс: «Завязаўшы, ты будзеш прыгожай».

КАНЯ «НА ЧАЙ»

71-гадовая афіцыянтка з Тэхаса атрымала ад наведвальніка кавярні, дзе яна працуе, каня «на чай», паведамляе тэлеканал Fox New.

Абслугоўваючы двух наведвальнікаў кавярні, яна папрасіла іх перасесці за меншы столік, каб вызваліць месца для вялікай групы зайшоўшых кліентаў. Адзін з іх спытаў яе, ці не хоча яна атрымаць каня, на што жанчына адказала згодай. Паводле яе слоў, праз два дні чалавек, які прапанаваў ёй каня, вярнуўся з тэлефонным нумарам інструктара па верхавой яздзе, і конь па мянушцы Мэйлмен стаў яе ўласнасцю.

Як распавяла афіцыянтка газеце, за сваю кар'еру яна двойчы атрымлівала вялікія чаявыя — 600 і 500 долараў, аднак гэты падарунак пераўзышоў усе яе чаканні. Акрамя каня, у жанчыны жывуць два сабакі і 16 котак.

POST factum

ДЗВЕ ХАТЫ «ЗБЕГЛІ» З УКРАІНЫ

У адным з пасёлкаў Чарнігаўскай вобласці дзве хаты аддзяліліся ад Украіны і стварылі сваю «дзяржаву». Усе жыхары гэтай своеасаблівай краіны лічаць сябе суверэнным народам, маюць пашпарты, гербавы друк і пасведчанні ўласнага ўзору.

«Гэта пачалося пяць гадоў таму. Яны лічаць сябе тытульным народам, а нас — фізічнымі асобамі, — наракае на раздзел старшыня Бакаеўскага сельскага Савета Кастусь Беражняк. — Яны нікому не падпарадкоўваюцца. У іх нават каровы без нумароў на вушах ходзяць». Аднак такія складаныя адносіны з мясцовымі ўладамі не перашкаджаюць грамадзянам самаабвешчанай «дзяржавы» адводзіць сваіх дзяцей у мясцовую школу, карыстацца водаправодам і электрычнасцю. Заснавальнікам і кіраўніком яе з'яўляецца 43-гадовы Віктар Маскаленка, паведамляе «Газета па-ўкраінску». У Віктара таксама ёсць намеснік Андрэй Дырда, які жыве за некалькі кіламетраў ад Бакаеўкі. Пашпарт «дзяржавы» атрымала нават 77-гадовая маці Андрэя, Настасся Сямёнаўна. «Куды дзеці, туды і я», — тлумачыць свой учынак пенсіянерка.

Між тым, бакаеўцы патрабуюць ад мясцовых уладаў усталявання выключна дыпламатычных адносінаў. Да прыкладу, дыпламатычны корпус новаўтворанай «дзяржавы» выдае сваім грамадзянам пасведчанне, дзе напісана, што яго ўладальнік непадсудны ўкраінскім судам і не абавязаны плаціць падаткі ў бюджэт. Улады пасёлка ставяцца да «аддзяленцаў» з іроніяй і не прыцягваюць іх да адказнасці. «Падстаў для завядзення крымінальных спраў адносна гэтых грамадзян я не бачу. Яны не здзяйсняюць ніякіх дзеянняў па захопе органаў дзяржаўнай улады, не здзяйсняюць крымінальных учынкаў», — растлумачыў пракурор Ічнянскага раёна Юрый Антоненка. Тым не менш, у пракуратуры лісты-звароты ад суверэнных бакаеўцаў усё жа захоўваюць, на ўсякі выпадак.

ЯК ПРАПАНАВАЦЬ ПРАЦЭНТЫ

Амерыканскі эканаміст Роберт Шылер прапанаваў ствараць спецыяльныя фонды, якія будуць страхаваць ад рызыкі зніжэння даходаў.

Шылер прапануе ствараць фонды, якія будуць выплачваць кампенсацыі ў выпадку, калі даходы ў пэўнай сферы эканомікі зменшацца. Напрыклад, калі ў нейкай галіне даходы ў наступным годзе будуць ніжэйшыя, чым у папярэднім, фонд выплоціць кампенсацыю. Такія фонды, на думку эканаміста, дапамогуць людзям не баяцца змяняць прафесію, пераязджаць у іншыя гарады і краіны, каб знайсці больш аплатную працу.

ЗАБАРОНІЦЬ ЗАБАРОНЫ

Амерыканскія вучоныя прапануюць адмяніць забароны на наркотыкі, каб знізіць узровень злачыннасці.

Прафесар Гарвардскага ўніверсітэта Джэфры Міран і прафесар Універсітэта Брытанскай Калумбіі Джошуа Зэлтэр прааналізавалі статыстыку злачынстваў у ЗША за апошнія 80 гадоў і прыйшлі да высновы, што ў перыяды, калі наркотыкі былі легальнымі, узровень злачыннасці быў ніжэйшым, чым цяпер. Вучоныя лічаць, што легалізацыя наркотыкаў дазволіць скараціць выдаткі на барацьбу з наркабізнесам, а таксама павялічыць падатковыя паступленні ў бюджэт.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ І I ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насцярэй Чарнобылю

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ | СВАЯ СПРАВА | ЖЫВАНДОЛЯ | ЗМЕНА | КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ | Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8800 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 52800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8300 рублёў на месяц 24900 рублёў на квартал 49800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	14000 рублёў на месяц 42000 рублёў на квартал 84000 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12800 рублёў на месяц 38400 рублёў на квартал 76800 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7460 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 44760 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	6990 рублёў на месяц 20970 рублёў на квартал 41940 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	9938 рублёў на месяц 29814 рублёў на квартал 59628 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	9431 рубель на месяц 28293 рублі на квартал 56586 рублёў на паўгоддзе

КОД АРМАНІ

Апублікавана 21 правіла жыцця і стылю ад мадэльера Джорджыо Армані

Прапануем пераклад артыкула, у якім знакаміты італьянец разважае як аб правільным выбары колераў і тканін, так і пра ўнутранае «я» сапраўднага мужчыны.

1. Танная пара абутку — дрэнная эканомія. Не эканомце на галоўным: абутак — аснова вашага гардэробу.

2. Баланс паміж працай і жыццём — ключ да шчасця. Я прынёс жыццё ў ахвяру працы, і калі б можна было пачаць спачатку, зрабіў бы інакш.

3. Чорны і цёмна-сіні робяць стройным лепш за астатнія колеры. Прытрымліваючыся гэтай колеравай гамы, вы можаце дазволіць сабе эксперыменты з формамі і тэкстурай.

4. Не варта вельмі старацца, выбіраючы адзенне: самыя стыльныя мужчыны выглядаюць так, быццам бы не прыкладаюць ніякіх намаганняў да ўласнага знешняга выгляду. У канчатковым выніку стыль зводзіцца да самавыяўлення, і я не думаю, што хоць штосьці можа выглядаць сапраўды жахліва на чалавеку, які шчыры сам з сабой.

5. Калі вы актыўна займаецеся спортам, мускулатура развіваецца ў нечаканых месцах. У такім выпадку вам варта падумаць пра сшытае на заказ адзенне. Нядаўна я пачаў адзяваць футбалістаў з «Чэлсі», гэтыя хлопцы добра складзены.

6. Кажуць, што я выглядаю на 20 гадоў маладзей за свой узрост; пытаюцца, у чым мой сакрэт. Часткова гэта спадчыннасць. Мая маці памерла ў 90 гадоў, а выгл

«...І ЛЕНІН ТАКІ МАЛАДЫ...»

Ён жыве амаль у кожным горадзе і нават — у гарадскіх пасёлках. А ў некаторых населеных пунктах — дык і ў некалькіх экзэмплярах. Яго ведаюць усе жыхары, аднак ягонае прозвішча нельга знайсці ў тэлефонных даведніках, медыцынскіх картках і ў шуфлядах пашпартнага стала... Гэта не замінае яму назіраць за гарадскім жыццём, праводзіць позіркам людзей на працу і з працы ды служыць месцам для сядзення птушак. Напэўна, вы ўжо здагадаліся, што гаворка пойдзе пра Уладзіміра Ільіча Леніна, а дакладней, пра помнікі яму, якіх на Беларусі стаіць даволі шмат.

Статыстыка

Цікава, што дакладнай колькасці помнікаў Леніну, раскіданых па тэрыторыі Беларусі, не ведаюць ні ў Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва, ні ў Міністэрстве культуры. Справа ў тым, што ёсць Леніны, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю (такіх усяго 9 — у Мінску, Брэсце, Баранавічах, Пінску, Віцебску, Гомелі, Салігорску, Магілёве і Бабруйску), а астатнія — жывуць «на балансе» мясцовых уладаў. А значыць, каб падлічыць усе помнікі Леніну на Беларусі, трэба патэлефанаваць ва ўсе гарадскія і раённыя выканкамы ды папытацца, колькі ж Уладзіміраў Ільічоў ім засталося ў спадчыну ад савецкай улады.

Крыху гісторыі

Самы першы на абшарах СССР помнік правадыру сусветнага пралетарыяту з'явіўся яшчэ пры яго жыцці ў 1922 годзе ў беларускім Краснаполлі (Магілёўская вобласць) і быў выкананы скульптарам Аляксандрам Грубэ з дрэва. І нагогул, першыя помнікі Леніну не надта вызначаліся мастацкай якасцю, але былі шчырымі і рабіліся не «для птушкі», а ад сэрца.

Цікавы лёс у «галоўнага» Леніна Беларусі, які стаіць перад Домам урада на плошчы Незалежнасці ў Мінску і пільна назірае за студэнтамі галоўнага корпуса Беларзяржуніверсітэта. Дык вось, у 1930—1934 гады па праекце Іосіфа Рыгоравіча Лангбарда будуецца Дом урада, а перад ім было прапанавана ўсталяваць помнік Леніну. Савет Народных Камісараў абвясціў конкурс на лепшы праект, у якім перамагла сумесная праца архітэктара І. Лангбарда і скульптара М. Манізера. У 1933 годзе ім былі прысвоены званні заслужаных дзеячаў мастацтваў і архітэктуры БССР, а на плошчы Леніна ў Мінску з'явіўся сяміметровы бронзавы Уладзімір Ільіч, дарэчы, самы высокі ва ўсім тагачасным СССР.

Аднак нядоўга прастаяў помнік: у першыя дні фашысцкай акупацыі помнік Леніну быў скінуты з пастамента, распілаваны на часткі і вывезены ў Германію для пераплаўкі... Але пасля вызвалення Мінска помнік хутка аднавілі: вядома ж, распілаваная часткі не адшукаліся, затое ў майстэрні Мацвея Генрыхавіча Манізера захаваліся формы, па якіх у красавіку 1945 года Уладзімір Ільіч быў нанава адліты на ленінградскім заводзе. А 1 мая 1945 года ён ужо ізноў стаяў перад Домам урада.

Ленін у Вялікую Айчынную вайну

Лёс помнікаў Леніну падчас Вялікай Айчыннай вайны быў незайздросны: фашысты іх скідвалі, разбівалі і пераплаўлялі на каляровы метал. Аднак вядомыя выпадкі, калі насельніцтва хавала ад акупантаў не толькі камуністычныя кнігі, але і... помнікі. Так, некалькі гадоў таму газеты пісалі пра санітара 3-й бальніцы горада Мінска (яна знаходзіцца побач са стадыёнам «Дынама») Пятра Мурашку, які ноччу зняў з пастаментаў бюсты Леніна і Сталіна, закруціў іх у старыя халаты ды прыкапаў недалёка на пустэчы. Пра тое дазналіся немцы і ўчынілі допыт Пятру Іосіфавічу і яго жонцы Зінаідзе Мікалаеўне: білі гумавымі шлангамі, аднак адказу так і не дачакаліся. Лёс Пятра Мурашкі невядомы, а вось яго жонка Зінаіда пасля вайны працягвала працаваць у гэтай бальніцы — яна і паказала, дзе былі схаваныя ад фашыстаў помнікі. Цікава, што ўжо ў пасляваенныя гады да кіраўніцтва бальніцы звярнуліся чыноўнікі ад Міністэрства культуры з прапановай: «Давайце мы гэтага вашага Леніна выкінем (бо стульптура была, скажам прама, не вельмі ўдалай), а ўзамен новага паставім, прыгожага і з мастацкага пункту гледжання каштоўнага». А персанал бальніцы запярэчыў: «Хай ён несамавіты, але мы яго ў вайну хавалі, так што няхай стаіць! Мы яго ў крыўду не дадзім!»

Ленін за 5 тысяч рублёў?

Пра тое, дзе ставілі помнікі Леніну і як гэта адбывалася, расказаў Уладзімір Уродніч, заслужаны дзеяч мастацтваў, мастак, дэкан мастацкага факультэта Беларускай акадэміі мастацтваў, які шмат гадоў працаваў у Міністэрстве культуры БССР:

— Помнікі Леніну абы-дзе не ставіліся. Звычайна выбіралася месца ў цэнтры горада, ля будынкаў гарвыканкамаў. І атрымлівалася, што людзі падчас нейкіх там святочных дэманстрацый збіраліся ля помніка Леніну, ён быў у цэнтры падзей, іграў у нейкай ступені ідэалагічна-выхаваўчую ролю. Месца, дзе ўсталяваць помнік, выбіралі гарадскія ўлады, а аўтараў — Міністэрства культуры. Калі гаворка ішла пра абласны цэнтр, то праект трэба было ўзгадняць на ўзроўні СССР. Аплачвалася праца скульптара так, як і пры стварэнні іншых скульптур — гэта прыкладна 5—7 тысяч савецкіх рублёў. Што датычыцца майго стаўлення да помнікаў Леніну, то я мяркую так: нельга ўсё без разбору руйнаваць бульдозерам. Бо гэта — помнікі пражытым пакаленням. Сёння ж нікога не прымушаюць несці кветкі да іх: хочаш — прынясі, а не — дык праходзь міма.

Леніны зыходзяць і... вяртаюцца!

Частка помнікаў Леніну з развалам Савецкага Саюза была дэмантавана: так, напрыклад, няма больш у Уладзіміра Ільіча ні перад былым будынкам ЦК КПБ, ні ў фае сталічнага кінатэатра «Перамога»... А пасля будаўніцтва новага чыгуначнага вакзала ў Мінску невядома куды знікла шыльдачка, прысвечаная ўшанаванню памяці У.І. Леніна, які ў верасні 1895 (з-за мяжы ў Расію) і ў ліпені 1900-га (на шляху ў эміграцыю) праязджаў чыгуначную станцыю Мінск.

Аднак бываюць і вяртанні з небыцця — вясной 2007 года ў кубанскім горадзе Беларэчанску ўсталявалі новы помнік Леніну, які праляжаў на складзе аднаго з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў горада больш за 25 гадоў. Стары, гіпсавы помнік знялі, а новы, бронзавы, паставілі. Нагадаю, што адбылося гэта не ў якім-небудзь 1987 годзе, а ў 2007-м...

Сабраць усіх Ленінаў

Безумоўна, сабраць усе помнікі Леніну, калі разумець гэтую фразу літаральна, немагчыма. Але, напрыклад, калекцыю фотакартак помнікаў Леніну — гэта ўжо блізкай да рэчаіснасці. І ёсць дзівакі, якія такі збіраюць фотавыявы помнікаў Уладзіміра Ільіча, усталяваных па ўсім свеце. Напрыклад, у сеціве можна знайсці суполку «Фатаграфіі помнікаў Уладзіміру Ільічу» (http:/ community.livejournal.com/ru_lenin/), дзе людзі пакідаюць фотакарткі манументаў Леніну. Адказаць на некалькі пытанняў «Звязды» згадзіўся стваральнік гэтай суполкі — культуролаг Масквы Дзмітрый Кудзінаў.

— Адкуль у вас такое, крыху дзіўнае на першы погляд, хобі — збіранне помнікаў Леніну?

— Усё проста. Захапленне пачалося мянявіта з маскоўскіх помнікаў. Калісьці, гады тры таму, захацелася даведацца, колькі ж іх засталося, і захаваць тыя, што засталіся, «для гісторыі». Пачаў фатаграфаваць — меркаваў, будзе няшмат. А аказалася — дзесяткі! Выклаў маскоўскую падборку ў Інтэрнэце — і людзі сталі дасылаць фотакарткі і іншых помнікаў. Вось і стаў збіраць помнікі не толькі маскоўскія ці падмаскоўныя, а ўсе. Сёння ў калекцыі налічваецца каля 2 тысяч фотакартак.

— Скажыце, Дзмітрый, а які сэнс іх збіраць, калі вы лічыце, што ніякай (за рэдкім выключэннем) каштоўнасцю яны не з'яўляюцца?

— Ну... Гэта проста цікава. Хай фатаграфіі застануцца. Дый калі помнік нікому не замінае і яго прысутнасць у населеным пункце задавольвае насельніцтва, то хай сабе стаіць.

Дарэчы, ёсць збіральнікі Леніна і ў Беларусі. У Інтэрнэце вісіць сайт «Каталог помнікаў Леніну ў Беларусі» (http://www.lenin.narod.ru/), на якім размешчаны 107 фотакартак беларускіх Уладзіміраў Ільічоў. Аднак, на жаль, з пачатку 2004 года сайт не абнаўляецца.

Пару гісторый напрыканцы

Першая гісторыя зусім і не байка, а быль. Да 1950-х гадоў быў такі тып помніка «Ленін і Сталін у Горках». Але потым, пасля 1961 года, Сталін стаў непатрэбным, яго пачалі адразаць ад Леніна. І ў выніку атрымалася, што па Савецкім Саюзе стаяла даволі шмат такіх «асірацелых» Ленінаў...

Другая гісторыя звязана з аповедамі, нібыта ў нейкім горадзе так спяшаліся паставіць помнік Леніну, што зрабілі Уладзіміра Ільіча з дзвюма кепкамі: адной на галаве, а другой — у руцэ. Аднак, хутчэй за ўсё, гэта міф. Бо, па-першае, правадыра сусветнага пралетарыяту рабіць абы-каму не давяралі, а па-другое, Дзмітрый Кудзінаў прызнаўся, што колькі соцень фотак ён перагледзеў, але гэтага міфічнага помніка з дзвюма кепкамі так і не знайшоў. Хутчэй за ўсё, лічыць Дзмітрый, гэта гарадская легенда.

Ну й, нарэшце, колькі слоў без жартаў. На конт далейшага лёсу помнікаў Леніну ў беларускім грамадстве існуюць розныя меркаванні. Вось, напрыклад, што думае прадстаўніца пакалення «next» **Валянціна**, сдудэнтка архітэктурнага факультэта БНТУ:

— Мне дык усё роўна: ці ёсць гэтыя Леніны паўсюль, ці няма. Аднак лічу, што ў сучасным свеце яны непатрэбны, іх можна з плошчаў і прыбраць. Хай застаюцца ў музеях. Можа людзям старэйшых пакаленняў помнікі Уладзіміру Ільічу і зараз патрэбны, бо яны поплеч крочылі па жыцці...А мы, маладыя людзі, абыякавыя да гэтых бронзавых ды гіпсавых Ленінаў...

Поўнасцю супрацьлеглага меркавання прытрымліваецца **Мікалай КАЧАН,** жыхар дома № 1/4 па вуліцы Валгаградскай горада Мінска, у вокны якога вось ужо некалькі дзесяцігодзяў заглядае помнік Леніну ля электрамеханічнага завода:

— Каму помнікі Леніну знімаюць? Хай стаяць. Ленін — гэта чалавек з вялікай літары, гэта наша гісторыя. А яе ўжо не перароб іш, то навошта знішчаць помнікі гісторыі, эпосе?.. Вось табе, Яўген, — звяртаецца Мікалай Канстанцінавіч да свайго суседа, які праходзіў міма, — наш Ленін насупраць акон замінае?

— Абсалютна не замінае, — спыняецца сусед Яўген Сідаровіч і ўключаецца ў гутарку. — Гэта вялікі чалавек быў. Што датычыцца мяне, то я б ніводную дзяржаву не прамяняў бы на Савецкі Саюз, хоць і там не ўсё добра было. А помнікі — гэта нашая гісторыя. У тым ліку — і помнікі Леніну. Тым больш, што ён нічога дрэннага не зрабіў, ён толькі хацеў стварыць дзяржаву, дзе б добра жылося простаму народу.

Як яно там будзе, які лёс накананаваны шматлікім помнікам Ільічу — пакажа жыццё. Галоўнае, як слушна заўважыў Уладзімір Уродніч, каб нашыя нашчадкі не аднаўлялі потым тое, што мы пальчылі непатрэбным. А то будзе, напрыклад, які прапрапраўнук разглядваць фотакарткі з калекцыі таго ж Дзмітрыя Кудзінава ды галаву ламаць над пытаннем: «Што ж за дзядзька такі знакаміты быў? Чаму яму столькі помнікаў стаяла? Дый чым праві-ніўся, што зараз іх няма?..»

Павел БЕРАСНЕЎ.

Парк савецкага перыяду створаць у Кіеве

У адным з цэнтральных раёнаў украінскай сталіцы плануюць стварыць Парк савецкага перыяду, дзе будуць размешчаны помнікі савецкім дзяржаўным дзеячам. З падобнай ініцыятывай выступіў кіраўнік кіеўскай раённай дзяржаўнай адміністрацыі, паведамляе прэс-служба ведамства.

Гарадскія ўлады Кіева раней заявілі аб намеры дэманціраваць 27 сталічных помнікаў эпохі камунізму. Манументальную спадчыну савецкай эпохі мяркуецца кампактна размясціць у цэнтральнай частцы Кіева, стварыўшы асобныя сектары помнікаў, якія будуць адлюстроўваць розныя гістарычныя перыяды. Побач афармяць спецыяльныя стэнды са стылізаванымі плакатамі, паштоўкамі і прэсай савецкай эпохі, а таксама арганізоўваюць распаўсюджанне спецыяльнай сувенірнай прадукцыі. Гэтай ініцыятывай раённыя ўлады, з аднаго боку, хочуць пайсці насустрач тым кіяўлянам, якія з настальгіяй ставяцца да савецкіх часоў, з іншага — павялічыць турыстычную прывабнасць сталіцы.

Як адзначаюць у кіеўскай раённай адміністрацыі, іх ініцыятыва грунтуецца на вопыце замежных краін. Падобныя праекты былі ўжо рэалізаваныя ў Літве, Венгрыі, некаторых гарадах Расійскай Федэрацыі.

Людміла СЦЯПНОВА, БЕЛТА.

ПРЫГАЖОСЦЬ І БАГАЦЦЕ

Нядаўна прачытала: «Прыгажосць — гэта багацце жанчыны. Багацце — прыгажосць мужчыны». У гэтага афарызма і аўтар быў пазначаны, але, здаецца, думка і без яго папулярная ў шырокіх народных масах. Вось толькі жыццё час ад часу прымушае ў гэтым засумнявацца. Заходжу ў вакзальную краму па прадукты, а там не першай свежасці — па паху і на выгляд — мужчына, без зубоў і, абсалютна відавочна, без грошай, просіць у маладых хлапцоў на бутэльку. Тыя ў адказ толькі ўсміхаюцца і раптам дзядзьку, як кажуць, «нясе»... «Да вы хто, да вы што... А я вось і ў турме пасядзеў, і дзеўка ў мяне прыгожая, вам такая і не сніла ся...» Хлопцы ў смех. Выходзяць, за імі дзядзька. І тут да яго кідаецца сапраўды зусім маладая, на галаву за яго вышэйшая дзяўчына. Дзядзька пераможна аглядае маладых людзей. Яны толькі раты параскрывалі, азіраюцца на мяне з пытаннем у вачах — вы гэта бачылі? Разводжу рукамі — бывае. Яно сапраўды бывае, асабліва гэта заўважна на вакзале. Колькі дзяўчынак зусім маладзенькіх, яшчэ добра апранутых, сустракаю ва ўласным пад'ездзе побач з асобамі, чый пол, па вялікім рахунку, ужо і не мае значэння. Як яны шчабечуць, як імкнуцца спадабацца людзям, якім і апускацца ўжо няма куды, якое ўжо тут багацце... Бывае, сэрца не вытрымае, звяртаюся: «Слухай, дзяўчынка, ты ж — прыгажуня, хіба ж ты сабе цаны не ведаеш, што ж ты з такімі стаіш...»

Пэўна, у кожнай з іх свая прычына аказацца ў такой кампаніі. Але мне зразумела — не за прыгажосцю, і не за багаццем яны беглі. А ў пошуках звычайнага чалавечага разумення, якога ім не хапіла ва ўласнай сям'і.

ПРЫХАВАНЫ АНТЫФЕМІНІЗМ

У невялічкай кнігарні на праспекце Скарыны прадаюць выдатныя плакаты таварыства «Ахова птушак Бацькаўшчыны». На іх выявы найбольш распаўсюджаных птушак Беларусі з подпісамі — па-рускі і па-беларуску. З яго даведалася, што не ўсіх крылатых я правільна называла. Так, "трясогузку" называла па-беларуску «сітаўка», а яна — «пліска»... А знакамітая «малінаўка», пра чый галасок песні спяваюць, на самай справе па-руску «зарянка»... Карацей, вельмі карысны плакат, ды яшчэ і недарагі — выдатны падарунак маленькім дзеткам. Вось па яго і зайшла...

Але дзе птушкі — там і коткі. Пакуль гандлярка скручвала плакат, да мяне звярнуўся мужчына, які зайшоў следам. Працягнуўшы кніжачку з выявай мілага кацяняці, з абурэннем спытаў:

— Ну почему, почему пишут «кошачьи»? Надо писать «котовые». Коты — они ведь чистюли, не то что кошки...

Не стала я ўвязвацца ў катова-філалагічную спрэчку, забрала скрутак і выйшла. А дробненькая птушка-прадавачка засталася ў сваёй цеснай крамцы-клетцы з катафілам... Спрэчнае пытанне, што больш мае патрэбу ў ахове — людзі ці птушкі.

МАРЫЙКА І ГОЛЫ КАРОЛЬ

Нядаўна ў мяне была дэпрэсія. І я стала марыць — вось пачаць бы ўсё наноў... І тут у маю светлую галаву прыйшла думка — ну няўжо ж нічога з жыцця гэтага мне не захацелася б перакінуць у жыццё новае? Спачатку я падумала «нічога», а пасля ўспомніла! Кнігу Сафі Кінсэлы — адну з тых сямі, што ў мяне ёсць, і якую я яшчэ не паспела прачытаць! Пасля, вядома ж, засаромелася — ну як гэта так, Кінсэла ж — не беларускі аўтар... Але праўда ёсць праўда — сярод сучасных беларускіх аўтараў я не ведаю нікога, чыю б кнігу чытала ноч напралёт, ці, калі ўжо быць зусім праўдзівай, па дзве за ноч. Не магу назваць кнігу, сустрэчу з якой я так чакала б. Пры тым, што гэтая Кінсэла — не тое, што не класік, а самая што ні ёсць «папса».

Думка, што сучасную беларускую літаратуру — за адзінкавымі выпадкамі — немагчыма чытаць дзеля задавальнення і адпачынку — няновая. Але неяк яна не сфармуляваная для мас — бо ні адзін нармальны крытык у гэтым не прызнаецца. Наадварот, мы перакананы усіх у адваротным, нагадваючы пыс няшчасных, што глядзелі на голага караля. Бо прызнацца ў тым, што табе нецікава, гэта як прызнацца ў тым, што ты — несур'ёзны чалавек. Але я ўжо даўно зразумела, што будзе тым дзіцёнкам, хто крыкне:

— А кароль жа голы!

Марыйка Мартысевіч — малады крытык, паэтэса, перакладчыца і літаратуразнаўца ў адным флаконе. Талент, наіўнасць, а галоўнае **п а м е р** — усё гэта гаворыць пра тое, што менавіта гэтае «дзіцятка» зможа тое, на што ў мяне не хапае сілаў — сказаць усё як ёсць пра нашу літаратуру.

ПРЫГАЖОСЦЬ І СУЧАСНАСЦЬ

«Адоб-фоташоп» — праграма па апрацоўцы здымкаў у камп'ютары. Ёсць такі сучасны жарт: «Фоташоп — дзесяць гадоў на рынку пластычнай хірургіі». І сапраўды, на каго ні глянеш у Інтэрнэце — такія ўсе прыгожыя... Раней бы сказалі — фотагенічныя. Цяпер варта казаць — «фоташапічныя».

Ганна КІСЛІЦЫНА.

На конкурс апавяданняў

Дабрыня. Сёння гэтага, здаецца, не хапае кожнаму з нас. Спакою, лагоды і ласкі просяць не толькі людзі, малыя і дарослыя, але і звяры. Пра імгненні дабрыні, жаданні спагадлівага слова і маўчання расказвае нам і пісьменніца, больш вядомая як паэтка, Галіна Каржанеўская.

Віктар КАЗЬКО.

МУЖ ПАЙШОЎ, А ПЯРСЦЁНКІ ЗАСТАЛІСЯ,

або Незвычайны лёс абрадавых атрыбутаў

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

Людміла Мікалаеўна з Мінска задае наступнае пытанне: «Мы вянчаліся ў царкве, аднак скасавалі свой шлюб. Пасля разводу засталіся пярсцёнкі, ручнік, на якім стаялі пад вянцом, вянчальныя свечкі, абраз — усё гэта захоўваецца ў мяне дома. Муж ажаніўся з другой. Я не замужам, засталася адна. Што рабіць з абрадавымі рэчамі?»

Безумоўна, гэта пытанне можна аднесці да разраду аднаго з самых складаных пытанняў, звязаных з разуменнем сутнасці шырокага кола традыцыйных абрадаў і месца і ролі тых рэчаў, якія аказаліся ў полі абрадавай практыкі. Пытанне складанае таму, што практычна кожны абрад і вельмі вялікая колькасць рытуальных дзеянняў суправаджаліся тымі ці іншымі прадметамі побыту, рэчамі навакольнага асяроддзя, якфія станавіліся абрадавымі атрыбутамі і якія надзяляліся надзвычайным статусам і рознымі сакральна-магічнымі характырыстыкамі. Кожны атрыбут меў свой рытуал пасвячэння, свой час актыўнага выкарыстання (далейшы лёс) і свой варыянт **утылізацыі — аднаўлення — пераўвасаблення,** а таксама вымагаў пэўнага да сябе стаўлення.

Нам падаецца, што ў пэўнай ступені можна даць наступную абагуленую карціну стаўлення да асноўных атрыбутаў каляндарных абрадаў: яны закліканы спрыяць, дапамагаць, перасцерагаць і абярагаць чалавека, яго сям'ю, хату і ўсю гаспадарку на працягу года, прычым не столькі каляндарнага (ад Новага года да наступнага), колькі таго гадавога цыкла, дзе пунктам адліку будзе свята, у кантэксце якога той атрыбут з'явіўся. Так, галінкі асвячонай вярбы, як правіла, захоўвалі да суботы перад наступнай вербніцай, іх спальвалі на прыпечку, а попел адносілі на градны. У асноўнай масы велікодных яек век кароткі: дзеці будуць гуляць у біткі, качаць іх з латакоў, гуляць у шматлікія гульні, але на працягу велікоднага тыдня яны будуць з'едзены. І толькі адно з іх пакінуць дапамагаць «ахоўваць» хату — пакладуць у чырвоны кут за абразы. Але пры гэтым шалупінне ад з'едзеных яек будуць старанна збіраць у асобны посуд, каб затым закапаць у грады, на жытнёвым полі ці ў кутах усяго прысядзібнага ўчастка.

Прыкладна такая ж доля чакала і траецкі «май» — галінкі клёну, бярозы, явару, таполі, ліпы або сцяжыны аеру, якімі ўпрыгожвалі хату і падворак. Праз тыдзень іх збяруць і (часцей за ўсё) спаляць на купальскім вогнішчы. Аднак некалькі галінак пакінуць, каб пакласці пад стог сена — людзі верылі, што яны перасцерагуць зімовы запас для хатняй жывёлы ад усялякіх грызуноў.

Зусім па-іншаму складваўся лёс шматлікіх атрыбутаў, якія суправаджалі сямейна-родавыя абрады. Напрыклад, вэлюм або падвянечную сукенку захоўвалі ўсё жыццё. Нават сёння, калі вясельнае адзенне бяруць «напракат», а затым вяртаюць назад у салон, вэлюм (той атрыбут, які ўпрыгожвай галаву нявесты і адначасова выконваў засцерагальна-ахоўную ролю) назаўсёды пакідаюць сабе.

Не толькі ў вясельных, але і радзінных абрадах ключавыя атрыбуты актыўна ўключаюцца ў шматлікія сямейна-родавыя падзеі як адзін з гарантаў міжпакаленнай пераемнасці. Так, пялёнкі і распашонкі, у якія спавівалі нованароджанага пасля першага рытуальнага купання дзіцяці, перадавалі для выканання аналагічнага абраду наступным народжаным у сям'і дзецям, каб яны на ўсё жыццё заставаліся дружнымі, стаялі адзін за аднаго гарой. А калыску ці люльку ўвогуле пакідалі на ўсё жыццё — яе заносілі на гарышча і захоўвалі як адну з самых шанаваных святынь. І толькі ў тым выпадку, калі памірала малое дзіцятка, калыску разбіралі і спальвалі, каб яна, крый Божа, не перадала эстафету смерці іншым немаўлятам.

Значна больш складаная і ў нечым супярэчлівая сітуацыя складваецца вакол атрыбутаў пахавальна-памінальнай абраднасці. Мыла, ручнік і ваду, якой абмывалі нябожчыка, пажадана тут жа закапаць («пахаваць», схаваць), адзенне, у якім ён паміраў, лепш спаліць, перавяслы рук і ног можна пакінуць сабе, але часцей ад іх таксама пазбаўляліся. Ручнікі, на якіх труну апускалі ў магілу, павязвалі на надмагільны крыж.

Гэтыя разважанні спатрэбіліся нам для таго, аб вывесці хоць бы некаторыя тыпалагічныя заканамернасці стаўлення да найбольш важных рэчаў-атрыбутаў, якія ўключаліся ў кантэкст абрадаў і адначасова паспрабаваць знайсці асобныя хады, якія акрэсляць стаўленне да атрыбутаў, узгаданых у лісце нашай чытачкі. Пры гэтым мяжволі напрошваецца адно правакацыйнае пытанне, якое жанчына не стала агучваць, але яно выплывае з пачатковага звароту: муж стварыў новую сям'ю. А які лёс чакае мяне — ці змагу і я другі раз выйсці замуж?

Давайце яшчэ раз узгадаем тыя рэчы, якія апынуліся своеасаблівымі «закладнікамі» далікатнай сітуацыі. Перш за ўсё — вянчальныя свечкі. У народнай традыцыі вакол іх існавала вялікая колькасць павер'яў і прадпісанняў. Па характарыстыках гарэння прадказвалі сямейны клімат вянчаемай пары; па колькасці згарэлай або недагарэлай часткі меркавалі аб працягласці сумеснага жыцця мужа і жонкі; калі адна са свечак моцна патрэсквала і патухала — тут жа пачыналі гаварыць аб бядзе, якая хутка магла напаткаць таго з пары, у чыіх руках яна была.

Пасля вянчання свечкі захоўвалі як адзін з найбольш моцных абярэгаў ад ліханкі, псоты, усялякага чарадзейства, ад бяздзетнасці. **У выпадку скасавання шлюбу свечкі лепш за ўсё запаліць у той дзень года, калі было вянчанне, і дачакацца, пакуль яны згараць цалкам.** Рэшткі воску можна аднесці ў храм і пакласці ў скрынку, дзе захоўваюцца рэшткі святочных свечак.

Больш сур'ёзная праблема паўстае вакол ручніка, на якім былыя муж і жонка некалі стаялі ў храме ў час вянчання. Колькі часу ні прайшло з той пары, на ім засталася энергетыка жаніха і нявесты, замацаваная адпаведным рытуалам паяднання. Таму аддаць яго ў храм або каму-небудзь іншаму нельга, гэтаксама як нельга і ператварыць яго ў паўсядзённа-побытавую, практычна арыентаваную рэч, у звычайны ручнік. Падобныя змены — адвольны, нічым не абгрунтаваны перавод абрадавага атрыбута (з адпаведнай кадзіроўкай праз малітву, замовы, благаславенні) у звыклую будзённую рэч проста немагчымы. Для параўнання: ці ўздумае нехта з нас апрануць на сябе падвянечную сукенку і пайсці на вяселле сваёй пляменніцы? Напрошваецца самая простая паралель: калі галінкі траецкага мая спальвалі на купальскім вогнішчы пасля таго, як яны выканалі сваю сакральна-магічную ролю, **то і ручнік-падножнік можна было б паўным чынам «ліквідаваць» як скрыжалі гісторыі гэтай сям'і.** Лепш было б, калі б яго проста распусцілі — як «распускаюць» джэмпер — і нітку зноў зматалі ў асобны маток. Аднак на гэтым шляху нас таксама можа чакаць тупік: калі пачнуць знікаць «адбіткі» слядоў маладых, то ці не навядзём мы тым самым адпаведную псоту на пару людзей, няхай сабе цяпер яны жывуць паасобку).

Застаецца толькі адзін варыянт нашых паводзінаў: **ручнік можна раскадзіраваць, г. зн. у святочны дзень правесці з ім рытуальнае дзеянне, скіраванае на нейтралізацыю некалі зафіксаванай інфармацыі.** Гэты тэзіс можа падацца дзіўным, парадаксальным, супярэчлівым: як гэта можна перапраграмаваць ручнік, гэта ж не камп'ютар, не станок з адпаведным праграмным забеспячэннем. Аднак не трэба спяшацца з эмоцыямі. Шукайце падобныя сітуацыі ў сваім жыцці. Напрыклад, да вас прыйшлі госці і сурочылі ваша дзіця. Маці павінна «зняць» непажаданае напластаванне, нейтралізаваць яго. У адным выпадку яна бярэ падол сарочкі і левым бокам яго выцірае (здымае) «сурокі», у іншым — абносіць асвячонай соллю або абводзіць твар далоняй, у якой знаходзіцца некалькі кропель нагаворанай (запраграмаванай!) вады. Праз кароткі час да дзіцяці вяртаецца спакой, нармальны сон, колішняе здароўе — жыццё «вырулівае» ў звыклую каляіну.

Таму і ў нашым выпадку неабходна не проста памыць ручнік у звычайнай вадзе — гэта не дапаможа, а вось пажадана дачакацца 6 мая, калі ўшаноўваўся бог Сонца Ярыла (яскравы), а пазней сталі шанаваць Георгія Перамаганосцу — Юр'я. У гэты дзень зямля першы раз «пацее», або пакрываецца расой. Вось яна і здольна змыць некалі запушчаную ў жыццё праграму.

Ручнік пажадана пацягаць па зямлі, каб ён стаў мокрым, затым выцерціся ім і высушыць. Аднак і пасля гэтага рукі або твар выціраць ім нельга, таму што выціральнікам можа быць толькі той ручнік, які не мае арнамента, узораў.

Тое, што тычыцца заручальных пярсцёнкаў, то з іх таксама трэба зняць «памяць» аб колішніх уладарах. Вазьміце грамнічную свечку, запаліце і некалькі хвілін патрымайце пярсцёнкі над яе полымем. Агонь, як і вада, здольны нейтралізаваць інфармацыю аб мінулым. Пасля гэтага пакладзіце іх у шкатулку і захавайце як знак вашай сямейнай гісторыі.

А тое пытанне, якое мы прачыталі між радкоў (магчыма, што і памыляемся), магло б мець наступны адказ. Напрыканцы вяселля, пасля таго як падзеляць каравай, маці маладога рассцілала на стале перад жаніхом і нявестай ручнік, на якім яны стаялі ў храме, і складвала на яго лыжкі маладых, іх фужэры, талеркі і перавязаныя паміж сабой вянчальныя свечкі. Усё гэта загортвалася ў ручнік, перавязвалася чырвоным поясам і хавалася ў тое месца, куды не зазірне чужы чалавек (у куфэрак).

У тым выпадку, які апісаны ў лісце, усё гэта трэба было б развязаць і тым самым адкрыць сабе дарогу для новага замужжа. Заўважым толькі: калі б падобны рытуал быў выкананы на вяселлі, то наўрад ці і спатрэбілася б звяртацца ў рэдакцыю.

Светлай дарогі кожнаму з вас і яснага разумення мэты вашага жыццёвага шляху!

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Кантактны тэлефон у рэдакцыі: 292 21 03.

СЮРПРЫЗ

Ключ паварочваўся ў замку цяжка і марудна. Лёнік здмёр і ўнутрана сцяўся. Ён усё зразумеў: бацька зноў прыйшоў з работы п'яны. Зноў пачне чапіцца да маці, дражніць сабаку і «выхоўваць» яго, Лёніка. Звычайна ён садзіўся на канапу і казаў: «Так... Пакажы свой дзённік, Лявон». «Такаў» ён толькі ў добрым падпітку, і што самае цікавае — ніколі не зваў яго па імені цвярозы, неяк абыходзіўся, а тут станавіўся важным і афіцыйным.

Бацька таптаўся ў прыхожай, доўга здымаў бацінкі, вешаў у шафу куртку. Маці не было дома: яна павяла выгульваць Рыжага. Вернецца, дык ёй таксама будзе «сюрпрыз». Яна не любіла мужа ў такім стане і старалася не глядзець на яго — на чырвоны твар, мутныя вочы... Бацька сапраўды рабіўся на шмат гадоў старэйшым і непрыгожым. Калі іншыя жонкі ў такіх выпадках лаяліся, папракалі, плакалі, то маці, наадварот, траціла мову і зацята маўчала. Можа, таму бацька і чапіўся — маўчанкі ён проста не пераносіў.

Няблага было б выключыць тэлевізар і ўзяць для прыліку кніжку. Ды Лёнік прадчуваў, што на гэты раз хітрасць не дапаможа: у дзённіку красавалася двойка па матэматыцы. Не тое каб ён не справіўся з прыкладамі — проста не паспеў, загуляўся. Бацькі парадкавалі на дачы, а ён цэлы вечар гляджэў «відзік» у Максіма, сябра з трэцяга паверха. Па відэа быў фільм пра ўсходнія адзінаборствы. Гэта азначае, што там бесперапынна біліся. Ад удараў рукамі і нагамі ажно мільгацела ўваччу. Здавалася, гэта б'юцца якіясь стальныя робаты, а не жывыя людзі. Між тым Лёнік ведае, што калі б'юцца — баліць, а гэтыя нават не скрывяцца, нібы не адчуваюць болю. Адным словам — падман усё гэта, выдумка. Ды і што добрае ў тым, калі чалавек збівае другога чалавека, няхай сабе і кепскага? Хіба са злом можна змагацца толькі кулакамі? Тым не менш, такія фільмы зацягвалі, за бойкамі хацелася сачыць. І вось вынік — «пара», за якую давядзецца сёння адказваць. Яму, бывала, і без дзённіка ад п'янага бацькі пападала...

Тым часам за дзвярыма нешта гучна бабухнула, і бацька скрозь зубы памянуў нячыстага. Лёнік пахаладзеў: няўжо так набраўся? Пачакаўшы, прыадчыніў дзверы і вызірнуў: на падлозе расцякалася пенная лужына, валяліся асколкі шкла. Відавочна, выпала з рук і разбілася бутэлька з півам. Бацька быў у ванным пакоі — напэўна, шукаў анучу. Пакуль ён збіраў асколкі ў вядро і выціраў лужыну, Лёнік пакутліва думаў, што рабіць з дзённікам. Першым намерам было — схаваць, але ж сумка з падручнікамі ляжала ў другім пакоі, і кідацца туды, выдаваць сябе не хацелася. Ну, будзе цяпер «адзінаборства», падумаў хлопчык. Каб ведаў, што так абернецца — сядзеў бы крукам за пісьмовым сталом, а не ў сябра перад «відзікам». У Максімавых бацькоў, дарэчы, і камп'ютар ёсць, і машына з Германіі прыгнаная; суседзі за вочы называюць іх «новымі». Лёнікавы, значыцца, «старыя», бо зарабляюць няшмат і ездзяць на старэньких «Жыгулях». У такой машыне надта не пафарсіш...

— Добра, што й такая ёсць,— гаварыла маці, калі сын захоплена азіраўся ўслед якому-небудзь «Мэрсу». —Усё не пешшу...

І дакуль яны там з Рыжым будуць прагульвацца? Была б маці дома — іншая справа. Яна, калі што, заступаецца.

Дзверы нягучна рыпнулі. Бацька, зайшоўшы, зірнуў на экран, потым на сына. Сеў насупраць ў крэсла. Лёнік не паверыў сваім вачам: бацька быў абсалютна цвярозым! Праўда, прыгнечаным, без настрою. Мо з-за бутэлькі, што грымнулася і нарабіла лішняга клопату, мо ад стомы. У бацькі цяжкая праца, ён шафёр і грузчык адначасова. Маці кажа, што ён і п'е з-за перагрузак, каб расслабіцца.

— Ну, што глядзіш? — запытаў бацька. — Прынясі лепей бінт.

Аказваецца, ён яшчэ і палец параэзаў, пакуль парадак наводзіў за сабою. Рука была выпацкана

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

У гонар 8 Сакавіка!

Першакласнай рашальніцы з Вілейкі Аляксандры Камінскай за перамогу ў адным з рэспубліканскіх конкурсаў была ўручана кніга У. Пака «Популярный шашечный практикум» (Масква, 2006). Прастудзіраваўшы яе, Аляксандра вырашыла ў гонар 8 Сакавіка прапанаваць у якасці чарговага задання нашага конкурсу «Пагода ў доме»-4 наступную пазіцыю, якая ёй вельмі спадабалася:



БЕЛЫЯ: a3, b2, c1, c3, d2, g3, g5, h4 (8). ЧОРНЫЯ: a5, b6, c5, d6, d8, e7, g7, h8 (8).

Аляксандра Камінская ўсё прадугледзела — у белых і чорных па 8 фігур і столькі ж хадоў яна падказвае: 1. ... ef6 2. g:e7 d:f6 3. de3 fe5 4. gf4 5. h:f2 gf6 6. fg3 hg7 7. cd2 gh6 8. gf4. Як бы вы прадоўжылі далей?

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

Жаночая хітрасць

Другая наша канкурсантка — Марыя Лічко (в. Возера Уздзенскага раёна) — экс-чэмпіёнка Беларусі, майстар спорту. Яна і зараз паспяхова выступае ў розных спаборніцтвах. Напрыклад, у асабістым чэмпіянаце Мінскай вобласці заняла першае месца, а ў Кубку краіны ў складзе абласной каманды — другое.

Марыя Лічко выкладае ў мясцовай школе фізкультуру, а захапляецца, як бачым, інтэлектуальным відам спорту, вядзе гурток, каб прывіць густ да старадаўняй гульні і сваім вучням. Вам цікава будзе пазнаёміцца з фрагментам партыі з яе ўдзелам:



БЕЛЫЯ (Марыя Лічко): c1, c3, d2, e5, f4, g1, h2, h4 (8). ЧОРНЫЯ (Аркадзь Плакхін): a3, a5, c5, c7, f8, g7, h6, h8 (8).

1. hg3 cd4 2. ef6 d:b2 3. gh2 4. f:b8 ba1 5. gf4 af6 6. fg5 7. b:g3 fg7. Белыя адчулі, што чорныя могуць зноў заняць поле f6, і пайшлі на жаночую хітрасць 8. ge1. Сапраўды, міжнародны гросмайстар згуляў машынальна 8. ... gf6?? і адразу здаўся, бо заўважыў 9. hg5 10. hg3 11. e:h4x. Гэта здарылася ў XI рэспубліканскім турніры «Мар'іна Горка-2007».

«ГУЛЬНЯ Ў ДАМЫ»

Нам прыемна адзначыць, што, акрамя Аляксандры Камінскай і Марыі Лічко, у звяздоўскіх конкурсах толькі ў апошні час бралі ўдзел Надзея Ермаловіч, Сняжана Ільіна, Дар'я Табольчык, Таццяна Трацюк і Дзіяна Шаўчук (Камянец), К. Банкоўская (Новалукомль), Ніна Зайцава (Жодзіна), Юлія Мікуліч (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна) і інш.

З іх нават былі ў ліку лаўрэатаў і атрымалі ад нас прызы: Алена Булаўка з Новалукомля (бліцконкурс-21) і Ірына Калачова з в. Дунілавічы Пастаўскага раёна (класіфікацыйны конкурс «Пастаўская паляна»- 3).

Віншуем са святам усіх аматарак старажытнай гульні і жадаем ім поспехаў — і не толькі на шашачнай ніве!

Дарэчы, у рукапісу англійскага вершаваната твору «Сэр Ферумбрас» (1380 год) — гэта пераказ французскай песні 1170 года — шашкі названы «гульнёй у дамы».

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (27 лютага). Па гарызанталі: Удавіцэнка. Арэна. Тар. Конкін. Мора. Пыл. Раса. Камар. Асот. Ітака. Клін. Гон. Кашуля. Паз. Арго. Ост. Гол. Яўка. Ладан. Драма. «Лада». Маяк. Ратанг. Абат. Сена. Бакен. Бард. Сяло. Высоцкі. **Па вертыкалі:** Аер. Офіс. Паўлаў. Парк. Карта. Згадка. Ані. Бакас. Нос. Фара. Арэх. Мат. Сват. Сабо. Ізатоп. Актэт. Апека. Арык. Дан. «Нерв». Арала. Ікол. Гланды. Міна. Лат. Шагал. Рагу. Ода. Кол. Лад. Джыгарханян. Нагасакі.

Інфарм-укол

Сям'я — у крызісе

Крызісныя сітуацыі ў сям'і могуць назірацца ва ўсе «ўзроставыя» перыяды. Аднак часцей яны маюць месца паміж 3—7 і 17—25 гадамі шлюбнага жыцця.

Крытычны перыяд паміж 3 і 7 гадамі шлюбу тлумачыцца знікненнем рамантычных настрояў, неадпаведнасцю паводзінаў пары паміж часам закаханасці і рэальнай сямейнай сітуацыі, больш старанным выяўленнем негатыўных індывідуальных якасцяў. У крызіснай сітуацыі нарастае пачуццё незадаволенасці, выяўляецца разыходжанне ў поглядах, пачуццё падману, растуць пратэсты, узнікаюць спрэчкі. У гэтыя перыяды неабходна мяняць акцэнты з асабістых узаемаадносінаў на выхаванне дзяцей, прафесійныя справы і г.д. Гэты перыяд працягваецца да аднаго года, пасля крызісныя сітуацыі здымаюцца.

Другі крызісны перыяд — паміж 17 і 25 гадамі супадае з павышэннем эмацыянальнай няўстойлівасці, пачуццём адзіноты ў сувязі з аддаленнем дзяцей, перажываннямі з нагоды хуткага старэння, а таксама імкненнем мужа праяўляць сябе ў сэксуальным сэнсе па-за межамі шлюбу («пакуль не позна»). Для зняцця крызісных сітуацый, больш працяглых у гэты перыяд (2—3 гады), мэтазгодна часцей кантактаваць з сябрамі, браць удзел у справах дзяцей, іншых калектыўных мерапрыемствах.

Крызісныя сітуацыі і распад сям'і магчымы і адразу пасля ўступлення ў шлюб, што ў большасці выпадкаў тлумачыцца няправільным выбарам партнёраў.

«Гэта» было цудоўна!

Цудоўны сэкс з пункту гледжання мужчыны — гэта калі жанчына...

...дзейнічае не па стандарту і здольная пацалаваць любімага мужчыну ў... паясніцу або галёнку. Адным словам, у любое месца, якое ў эратычным сэнсе не ўяўляе інтарэсу;

...можа дазволіць мужчыну застацца яе знянацку — калі яна не гатовая (з маскай на твары, без прычоскі або толькі што з ложку), то выглядае абсалютна безабароннай, а таму шматразова больш жаданая — незавершанасць вобразу мужчына схільны ўспрымаць як вотум даверу;

..не заплюшчвае вочы падчас заняткаў сэксам. Гледзячы адно на аднаго, двое перажываюць неверагодную ступень яднання і перажываюць не толькі фізіялагічны, але і ментальны аргазм;

...не мае нічога супраць «хуткага» сэксу. Дзесьці глыбока на генетычным узроўні ў мужчын закладзена ўпэўненасць у тым, што рабіць «гэта» трэба хутка. Інакш цябе могуць з'есці.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Усміхнёмся!

— У мяне сёння на вячэру нацыянальная італьянская страва — піца!

— А ў мяне нацыянальная руская — напіцца...

☺

— А ад чаго гэтыя лекі за 300 долараў?

— Ад лішніх грошай!

☺

Будоўля.

— Чаму ты не працуеш? — пытае прараб у памагатага.

— Ды пасля ўчарашняга рукі трасуцца.

— Тады пясок прасейвай!

☺

У кінатэатры скончыўся фільм. У зале ўключылі святло, і жанчына ўбачыла свайго мужа, які сядзеў наперадзе:

— Ах, значыць, так ты сядзіш дома з дзецьмі, пакуль я дагляджу хворую маці?

«ПРЫЙШОЎ ВЫСАКОС — ЛАВІ ЎДАЧУ ЗА ХВОСТ!»

Сталічныя жанісі і нявесты абвяргаюць ходкія думкі аб няўдаласці шлюбаў, заключаных у высакосны год. Як расказала загадчык Мінскага Дома шлюбу Надзея Рэуцкая, спецыялісты прааналізавалі статыстыку шлюбаў і разводаў чатырох папярэдніх высакосных гадоў. Вынікі аказаліся вельмі цікавымі для прыхільнікаў забабоны: ні адзін шлюб, заключаны ў сталічным доме шлюбу 29 лютага ў высакосных 1992, 1996, 2000 і 2004 гадах, не распаўся.

Паводле слоў суразмоўцы, на рэгістрацыю шлюбу 29 лютага гэтага года ў Мінскім Доме шлюбу запісаліся 20 сталічных пар, з якіх 17 ужо пацвердзілі свой намер. «Я не бачу тут нічога асаблівага. Наадварот, гэта добры час — у праваслаўных яшчэ не пачаўся пост. Некаторыя пары спецыяльна пераносілі ўрачыстую цырымонію на 29-га. А тэма высакоснага года і яго негатыўнага ўплыву з'яўляецца штучна», — лічыць Надзея Рэуцкая. Усяго ж з пачатку года ў сталічным Доме шлюбу марш Мендэльсона прагучаў для больш чым 200 маладых.

Высакосны год лічыцца нешчаслівым, багатым на катастрофы, эпідэміі, што цягне за сабой вялікія чалавечыя ахвяры. У старажытнасці яго таксама лічылі неспрыяльным для заключэння шлюбу. Здавалася б, сучасны, цывілізаваны чалавек павінен разумець, што такія забабоны — гэта прадукт недасведчанасці, увасоблены ў фальклорную форму сказання або легенды.

Даўно ўстаноўлена: у высакосныя гады адбываецца не больш катастроф, чым у звычайныя, проста на іх звяртаюць больш увагі, іх як быццам чакаюць і рыхтуюцца да горшага. Толькі сёння людзі апасаюцца высакосных гадоў ужо не па недасведчанасці, а як бы па традыцыі, таму што «так рабілі ў старадаўнасці», «так належыць». Забабоны працягваюць жыць сярод нас і праяўляцца ў адносінах да вяселля ў маі, пятніцы трынаццатага або дня трох сямёрак. Такім чынам, людзі апасаюцца нейкай скрытай пагрозы, якой насамрэч не існуе, або імкнуцца знайсці які-небудзь цуд, чарадзейства ў простым спалучэнні лічбаў, якое нібыта здольнае зрабіць іх шчаслівымі.

Ну а тым, хто вырашыў рыхтавацца да вяселля ў 2008 годзе, аптымісты прапануюць верыць у прыметы новага часу: «У высакосным пажаніцца — увесь век душа ў душу пражыць», «У высакосным годзе шчаслівыя дзеці нараджаюцца», «Прыйшоў высакос — лаві ўдачу за хвост!».

Кар. БЕЛТА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

У Дзеваў можа з'явіцца канкурэнт, а ў Цяльцоў — магчымасць прасоўвання па службе

ВАЕН. Ініцыятыўнасць і сабранасць — вось якасці, якія вам проста неабходны, каб кіраваць сітуацыяй. У аўторак пажадана дзейнічаць толькі законнымі шляхамі. Давядзецца кантраляваць сябе, свае эмоцыі, а гэта будзе не так проста. Інтэлектуальнае пачынанне ў першай палове тыдня прынясе поспех, а блізкія людзі могуць чакаць ад вас прыняцця важнага рашэння — не расчароўвайце іх.

ЦЯЛЕЦ. У пачатку тыдня давядзецца напружана працаваць, каб дабіцца жаданага выніку. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі і знайдзіце ключык да сэрца начальства, тады з'явіцца магчымасць прасоўвання па службе. Ад далёкіх паездак і камандзіровак у чацвер і пятніцу лепш адмовіцца, бо яны не апраўдаюць вашых надзей. Бліжэй да канца тыдня асцерагайцеся інтрыг, якія могуць закруціцца вакол вашай персоны.

БЛІЗНЯТЫ. Асноўную частку часу пагляне работа. У панядзелак пажадана паставіць перад сабой канкрэтную мэту і дакладна прытрымлівацца яе. Гэты дзень можа стаць цікавым і насычаным падзеямі. Важна правільна размеркаваць сілы і энергію. Сярэдзіна тыдня — цудоўны момант для стварэння падмурка будучага прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Аўторак і серада — спрыяльныя дні для сяброўскіх сустрэч.

РАК. Вы поўныя новых ідэй і натхнёна будуеце планы на будучыню? Не забудзьцеся абмеркаваць іх з блізкімі людзьмі — яны дапамогуць пазбегнуць недакладнасцяў і нават памылак. У панядзелак пажадана не рабіць сур'ёзных крокаў. Аўторак шчодры на падманы. Серада і чацвер могуць стаць самымі спакойнымі днямі тыдня. Чацвер і пятніца зусім не прыдатныя для актыўных дзеянняў. У нядзелю не гневайцеся з-за дробязяў, будзьце больш мудрымі і цярплівымі.

ЛЕЎ. Каб тыдзень прайшоў плённа і спакойна, пастарайцеся пазбягаць размоў і спрэчак з навакольнымі, нават калі яны датычацца вашай прафесійнай кампетэнтнасці. Варта чакаць з'яўлення нязначных цяжкасцяў, якія звязаны, перш за ўсё, з работай. Калегі не заўсёды будуць пра вас самага лепшага меркавання, але да іх слоў не варта прыслухоўвацца. Дзейнічайце самастойна і толькі ў выключных выпадках шукайце чужой парады.

ДЗЕВА. Пажадана не спяшацца, прытрымлівацца пэўных правілаў і стрымліваць унутраныя супярэчлівыя парывы. У пачатку тыдня магчымы праблемы з начальствам. На рабоце можа з'явіцца канкурэнт. Будзьце больш актыўнымі і прадбачлівымі, інакш вашы пазіцыі могуць пахіснуцца. У чацвер пастарайцеся не ўпірацца і перагледзьце некаторыя прынцыпы. Выхадныя прымусяць пахвалявацца, але гэтыя хваляванні будуць прыемнымі.

ШАЛІ. Вы цудоўна выглядаеце — проста на піку формы. Так што ёсць рэальная надзея, што ўдача ад вас цяпер не адвернецца. У панядзелак і чацвер верагодны канструктыўныя і шматабяцальныя дзелавыя сустрэчы. Яны, калі пашанцуе, адкрыюць перад вамі цудоўныя перспектывы. У аўторак павышаная працаздольнасць дазволіць справіцца з многімі справамі, якія назапасіліся. Вынікі ж у многім будуць залежаць ад акуратнасці. На пятніцу дзелавыя сустрэчы і паездкі лепш не плануюць. Пастарайцеся нікога не пасвячаць у свае планы і задумы — канкурэнты не дрэмлюць. Гэта можа датычыцца і асабістага жыцця.

СКАРПІЁН. Зможаце пераадолець падсвядомыя страхі і вырашыць праблему, якая вас палохала. У сераду не бойцеся праявіць адкрытасць і прыняць чужы пункт гледжання: з вамі стане лягчэй зносіцца, і навакольныя могуць пайсці вам насустрач. У пятніцу тэрмінова прыступайце да важных праектаў. У суботу не ганяйцеся за прывідамі — лепш планамерна ажыццяўляць задуманы план дзеянняў.

СТРАЛЕЦ. На працягу амаль усяго тыдня вам будзе шанцаваць, так што лепш засяродзіцца на галоўным. У панядзелак з начальствам лепш не зносіцца: вам захочацца яго пакрытыкаваць, а яму — праверыць якасць вашай работы. У аўторак трэба быць больш добразычлівымі, чым звычайна — тады навакольныя людзі дапамогуць вам у многім. Пачынаючы з чацвяргга з'явіцца рэальная магчымасць рэалізаваць свае планы, але для гэтага давядзецца прыкласці некаторыя намаганні.

КАЗЯРОГ. Смеласць і рашучасць дазволяць рэалізаваць планы і пашырыць магчымасці. Можа ўзнікнуць спрыяльная сітуацыя, якая дазволіць больш імкліва прасоўвацца па службовай лесвіцы. Толькі не падхапіце зорную хваробу. Пастарайцеся не адмаўляць у дапамозе людзям, якія да вас звярнуліся.

ВАДАЛЕЙ. Жыццё, падобна, становіцца вясёлкавым. Варта лавіць момант і радавацца таму, што адбываецца. Цяжкасці таксама могуць з'явіцца, але іх не варта баяцца. Можаце адначасова праяўляць ветлівасць і настойлівасць, а менавіта гэта — каштоўны ключ да поспеху. У сераду, па ўсёй бачнасці, варта сабрацца і адстаяць свае правы на працы. На гэтым тыдні паспяховай будзе барацьба са шкодлівымі звычкамі: вы не толькі справіцеся з імі, але і дапаможаце іншым людзям.

РЫБЫ. Варта адмовіцца ад вострых адчуванняў: цяга да рызыкі пройдзе, а вось наступствы могуць сапсаваць жыццё надоўга. Зоркі рэкамендуюць кіравацца толькі асабістым здаровым сэнсам. Настае час прадэманстраваць таленты, якія даўно хаваеце: магчыма, навакольныя перагледзяць сваё стаўленне да вас. У пятніцу непрадбачаныя абставіны могуць парушыць планы. У суботу не варта бурна рэагаваць на нязначныя, але аб'ектыўныя заўвагі з боку блізкіх людзей.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.57	17.47	10.50
Віцебск —	6.49	17.35	10.46
Магілёў —	6.47	17.37	10.50
Гомель —	6.42	17.36	10.54
Гродна —	7.12	18.03	10.51
Брэст —	7.11	18.05	10.54

Месяц

Апошняя квадра
29 лютага — 6 сакавіка.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Феадоры, Гаўрылы, Дзмітрыя, Уласа.*
К. *Люцыі, Богуша, Марка, Мацея, Сяргея.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +3..+5°C	КІЕЎ +5..+7°C	РЫГА +1..+3°C
ВІЛЬНЮС +2..+4°C	МАСКВА +1..+3°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°C

1 сакавіка

1918 год — 90 гадоў таму ў Петраградзе выйшаў першы нумар газеты «Дзянніца», першай савецкай газеты на беларускай мове. З'яўлялася органам Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама). Рэдактарам газеты быў Зміцер Жылуновіч. Нягледзячы на рознагалоссі з дзеячамі БНР, газета публікавала матэрыялы, прысвечаныя палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, у тым ліку і Статутныя граматы. Газета найперш адлюстроўвала погляды тых, хто меў намер будаваць беларускую дзяржаву з дапамогай бальшавікоў. На яе старонках вялася палеміка з Мясніковым і Кнорыным, якія па-сутнасці выступалі супраць ідэі беларускай сацыялістычнай дзяржаўнасці. 10 студзеня 1919 года Цэнтральнае бюро КП(б)Б заслухала свайго старшыню Аляксандра Мяснікова і з яго падачы палічыла выданне беларускай газеты непажаданым. Апошні нумар «Дзянніцы» выйшаў 2 лютага 1919 года.

1912 год — амерыканец Альберт Беры зрабіў першы ў свеце скачок з парашутам з самалёта.

Цытата дня:

«Толькі вельмі нямногія жывуць сённяшнім днём. Большасць рыхтуецца жыць пазней».

Джонатан Свіфт (1667—1745), англійскі пісьменнік-сатырык.

Віншуем *з 87-годдзем паважанага чалавека, ветэрана ВАВ і працы, былога дырэктара Саражскай СШ Слуцкага раёна* ***Аляксея Андрэевіча НОВІКА.***

Жадаем моцнага здароўя, бадзёрага настрою, аптымізму.

Былыя калегі.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЖАНОЧЫЯ САКРЭТЫ

Арганізуйце сабе дзень здароўя

Вясной так хочацца быць бадзёрай, радаснай і, галоўнае, добра сябе адчуваць. Аднак змораны за зіму арганізм не спяшаецца прачынацца. Таму пара прывесці яго ў парадак — ачысціць і зарадзіць энергіяй. Часу на гэта спатрэбіцца зусім нямнога: комплексную сістэму амаладжэння і аздараўлення можна праводзіць адзін раз на тыдзень.

СТЫМУЛЮЕМ СТРАВАВАННЕ

З адвараных агародніны (буракоў, бульбы, морквы) прыгатуйце вінегрэт з разліку 5 порцый. Дадайце зялёны гарошак (лепш адварыце свежазамарожаны) і квашаную капусту. Цяпер зварыце кампот (без цукру) з сухафруктаў (шыпшыны, курагі, інжыру, разынак, яблыкаў і груш) на 5 кубачкаў.

На працягу дня з'ешце 5 порцый вінегрэту і выпіце кампот.

СІЛКУЕМ НЕРВОВУЮ СІСТЭМУ

Зранку нашча выпіце, не спяшаючыся, маленькімі глыткамі шклянку сумесі, прыгатаванай паводле такога рэцэпта: у шклянцы не вельмі гарачага малака ўзбіце 3 жаўткі перапяліных яек, дадайце чайную лыжку фруктозы. Гэты ж напой трэба піць і перад сном.

ТРЭНІРУЕМ САСУДЫ

Зранку, лежачы ў ложку, адкінце коўдру, залажыце рукі за галаву і пакачайце з боку на бок. Затым 5—6 разоў устрасяніце кісцямі рук, падкурчыце і расчапіце пальцы ног. Потым складзіце рукі далонямі разам і моцна націсніце імі адна на адну — 10 разоў. Пасля гэтага сядзьце па-турэцку, 5 разоў узніміце і апусціце плечы, 5 разоў павярніце галаву ўправа-ўлева. Станьце тварам да акна, зрабіце 7 глыбокіх, спакойных удыхаў і выдыхаў, расцягніце губы ва ўсмешцы.

УСТАРАНЯЕМ МАРШЧЫНЫ

Калі ў вас сухая скура, то пад уздзеяннем ветру яна становіцца вялай і пачынае лушчыцца. Але ўжо пасля першай «падкормкі» пры дапамозе маскі паводле старадаўняга рэцэпта можна вярнуць твару свежасць: *вазьміце кубак белай фасолі, замачыце на 2 гадзіны ў вадзе, зварыце ў невялікай колькасці вады да размякчэння. Пратрыце фасолю праз сіта, гарачую масу змяшайце з сокам палавіны лімона і 1 ст. лыжкай аліўкавага алею. Налажыце сумесь на твар і трымайце 20—30 хвілін, затым змыйце цёплай вадой, апаласніце халоднай і асцярожна прамакніце ручніком.*

Тлустая скура вясной звычайна «квітнее» прышчамі. Паспрабуйце перамагчы іх за адзін дзень: *вымытую і абабраную бульбіну надзярыце на тарцы, дадайце чайную лыжку мёду, перамяшайце. Масу вылажыце на марлевую сурвэтку тонкім слоем, прыкладзіце да прышчоў і замацуйце пластырам. Праз 2 гадзіны павязку зніміце і асцярожна пратрыце ласьёнам скуру. Павязку накладвайце некалькі разоў на працягу дня.*

ДАГЛЯДАЕМ РУКІ

Каб скура вакол пазногцяў была мяккая і зніклі задзірыны, патрымайце рукі 15 хвілін у цёплым рыбным адвары (напрыклад, траскі), потым апаласніце і змажце крэмам. А перад тым як наносіць лак, пратрыце пазногці яблычным воцатам — лак ляжа раўней і лепш.

Калі рукі сталі шурпатымі, змяшайце ў роўных частках аліўкавы алей і капусны расол, патрымайце рукі ў гэтай сумесі 15 хвілін перад сном, надзеньце бавоўняныя пальчаткі і спіце ў іх.

-2483-

ПАДКАЗКІ БЫВАЛЫХ

Як стаць стыльнай?

Што звычайна ўкладваецца ў паняцце «стыль»? Як не перайсці тонкую мяжу паміж «стыльна» і «безгустоўна»?

У першую чаргу важна знайсці гарманічнае спалучэнне адзення з вашым ладам жыцця. Напрыклад, калі вы працуеце ў офісе, то не варта апранаць паліто ў яблыкі ці перафарбоўваць валасы ў зялёны колер. Таксама важна, каб адзенне, якое вы носіце, было зручным. Адзін кітайскі мастак і паэт сказаў: «Малюючы галіну, трэба чуць, як свішча вецер». Пагадзіцеся, ён мае рацыю. Апранаючы тую ці іншую рэч, трэба прыслухоўвацца да сябе, а не слепа прымацца моды, каб выклікаць уражанне. Бо часта гэта ўражанне аказваецца зусім не такім, якога б вам хацелася. Упэўненасць у сабе і бляск у вачах — вось што ўплывае на тых, хто вас акружае. **Адзенне павінна падкрэсліваць індывідуальнасць.** Будзьце моднымі, аднак у меру. А безгустоўна — гэта калі ў моду ўваходзіць руковы колер і большасць жанчын пачынаюць апранаць адзенне менавіта гэтага колеру. Калі ўжо хочацца руковага, то няхай гэта будзе незвычайнае адценне ці якая-небудзь дэталь. Напрыклад, шалік. Памятайце: масавасць — галоўная пагроза захаванню ўласнага стылю.

КУХНЯ БЕЗ ЖОНКІ

Святочная вячэра для каханай

Калі вы, шаноўныя мужчыны, вырашылі 8 Сакавіка парадаваць каханую святочнай вячэрай, падрыхтавацца варта загадзя. Абдумайце меню, складзіце спіс прадуктаў — і за справу! І нават калі нешта не атрымаецца, не бяда. Не сумнявайцеся, жонка будзе ў захапленні, бо вы ж стараліся дзеля яе.

СТЭЙК «ІЗАБЭЛА»

Магчыма, у вас на прыкмеце маецца нешта незвычайна смачнае. Калі ж не, пачастуйце каханую любімай стравай Элізабэт Тэйлар.

Вам спатрэбіцца: *ялавічны стэйк, алей, гарчыца, соль, перац.*

Для соусу: *50 г інжыру (нарэзаць кубікамі), 100 г соевага соусу, 10 г здробненага мінадалю, 50 г сухога чырвонага віна, 3 ст. лыжкі кетчупу.*

На гарнір адварыце рыс і пакецік замарожанай сумесі агародніны.

Адбіце мяса, надайце форму круглага медальёна таўшчынёй да 2,5 см. Пасалеце, паперчыце, намажце гарчыцай, каб мяса было больш мяккім. Абсмажце, перакладзіце ў іншую пасудзіну і дайце пастаяць пад накрыўкай.

Пакуль варыцца рыс, прыгатуйце соус. У патэльню, у якой смажылася мяса, наліце соевы соус, дадайце інжыр, кетчуп і віно. Гатуйце 3—5 хвілін.

На талерку пакладзіце рыс, агародніну, зверху — стэйк, паліце соусам, упрыгожце свежым агурком, зяленівам.

Яйкі, фаршыраваныя вяндлінай

5 вараных яек, 50 г сыру, 125 г вяндліны, 50 г смятаны, 150 г маянэзу, соль, перац, зяленіва.

Яйкі разрэжце ўздоўж на 2 палавіны. Жаўткі дастаньце, дадайце вяндліну, сыр і прапусціце праз мясарубку. Запраўце смятанай, пасаліце, паперчыце, разатрыце. Палавінкі яек напоўніце фаршам і злучыце. Упрыгожце зяленівам, заліце маянэзам.

-2484-

Спорт-тайм

Алімпійскі агонь пабывае на Эверэсце

Алімпійскі агонь-2008 будзе запалены на ўрачыстай цырымоніі 24 сакавіка ў Грэцыі. За 130 дзён факел пранясуць праз пяць кантынентаў і ўпершыню ў гісторыі Алімпіяд даставяць на самую высокую вяршыню свету — Эверэст. Хутчэй за ўсё, гэта адбудзецца ў маі (дата залежыць ад кліматычных умоў). Вышэйшым пунктам маршрута праходжання агню праз Эверэст стане адзнака ў 8844 метры над узроўнем мора.

У свеце дамінуюць фанаты «прымеры»

Самая вялікая колькасць футбольных прыхільнікаў у свеце ў іспанскіх клубаў — 103,5 мільёна балельшчыкаў, прычым за межамі краіны ў іспанскай «прымеры» 86,6 мільёна фанатаў. Для параўнання: сусветная аўдыторыя італьянскіх клубаў складае 62,2 мільёна чалавек, англійскай прэм'ер-лігі — каля 99 мільёнаў. Па колькасці балельшчыкаў унутры краіны лідзіруе Германія — 34,3 мільёна чалавек. А вось чэмпіянат Англіі з'яўляецца самым багатым на планеце.

«Інтар» запрашае Глеба

Шэраг англійскіх выданняў, у прыватнасці The Daily Express, паведамілі, што прэзідэнт міланскага «Інтара» Масіма Мараці гатовы заплаціць за пяўабаронцу «Арсенала» Аляксандра Глеба 14 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Мараці разглядае лідара зборнай Беларусі як ідэальную замену ветэрану Луішу Фігу. Аднак агент Глеба Мікалай Шпілеўскі заяўляе, што бліжэйшыя паўтара года футбаліст правядзе ў Лондане. «Напрамую ні са мной, ні з «Арсеналам» на кантакт ніхто не выходзіў, — паведаміў Мікалай. — Я асабіста размаўляў з Сашам і магу заявіць, што наступны сезон ён адназначна правядзе ў «Арсенале». Зразумела, усё ў жыцці можа адбыцца, але сёння ніякай сур'ёзнасці ў інфармацыі аб яго пераходзе няма». Раней паведамлялася, што Аляксандрам Глебам цікавілася «Барселона».

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018 Індэкс 63850. Зак. № 1158. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12